„Людзьмі звацца!“
Янка Купала

Літаратура і Мастацтва

ВЫХОДЗІЦЬ З 1932 г.

ШТОТЫДНЁВІК МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БССР

Пятніца, 22 чэрвеня 1990 г. № 25 (3539) ● Цана 10 кап.

СУВЕРЭНІТЭТ ДЛЯ БЕЛАРУСІ... ЯКІ ЁН БУДЗЕ?



УНУМАРЫ:

ЦІ НЕ КІДАЕМ МЫ КАМЯНІ ЎГОРУ?
«Эклектычныя нататкі»
А. СЯМЁНАВАЙ
5, 12—13

АДРАДЖЭННЕ БЕЗ КАНСАЛІДАЦЫІ?..
Артыкул А. ЛОЙКІ
6—7

ЛІСТ З ВЕЧНАЙ КРОНЫ
Вершы
Я. ПФЛЯУМБАУМ
8—9

НЕСПАТОЛЕНАЯ ПРАГА ПРАЎДЫ
Да 90-годдзя з дня нараджэння К. ЧОРНАГА
9

ЗЛАБАДЗЁННА ПРА АДВЕЧНАЕ
«Прыбалтыйская тэатральная вясна-90»
10—11

«ПЕСНЯ СТАЛА МАЁЙ МОВАЙ...»
Аўтабіяграфія
М. ЗАБЭЙДЫ-СУМІЦКАГА
14—15

АД НАШАГА ПАРЛАМЕНЦКАГА КАРЭСПАНДЭНТА

Наша парламенцкая практыка, здаецца, пачынае сведчыць, што перапынкі ў рабоце не дадаюць дэпутатам згоды. Вось і першае пасля паўзы ў некалькі дзён пасяджэнне сесіі Вярхоўнага Савета рэспублікі 19 чэрвеня адкрылася досыць бурна. З іншага боку, амаль гадзінны ўсплёск эмоцый перад тым, як рэгламент уварваўся ў сваё звыклае рэчышча — выбары старшынь пастаянных камісій, яшчэ раз пацвердзіў: на парадку дня сесіі паўстае надзвычай важнае пытанне. Можа, нават найважнейшае сёння, бо канцэнтруе літаральна ўсё, у тым ліку і пераадоленне наступстваў чарнобыльскай катастрофы.

«Разгледзець як першачарговае...»

МАЕЦЦА на ўвазе пытанне **аб суверэнітэце Беларусі.**

Між тым, спрэчкі на пасяджэнні разгарэліся на ўзроўні, здавалася б, зусім не канцэптуальным. Старшынствуючы М. Дземянцей паведаміў, што Прэзідэнт СССР запрашае трох паўнамоцных прастаўнікоў вышэйшага органа ўлады Беларусі на пасяджэнне Савета Федэрацыі — для абмеркавання канцэпцыі новага Саюзнага дагавору аб нацыянальна-дзяржаўнай будове. Пераважнай большасцю галасоў дэпутаты вырашылі накіраваць у Маскву намесніка Старшыні Вярхоўнага Савета БССР В. Шаладонава, начальніка аддзела НДІ ЭВМ У. Заблоцкага і пастаяннага прадстаўніка Савета Міністраў БССР пры Савеце Міністраў СССР В. Даніленку.

Але, мабыць, «машына для галасавання» была запушчана дачасна, без папярэдняга выяўлення і грунтоўнага абмеркавання ўсяго спектра думак. У прыватнасці, іншых прапаноў па персанальным складзе беларускай дэлегацыі, яе паўнамоцтвах, а таксама спроб высветліць, што ж будзе адстойваць рэспубліка ў Савеце Федэрацыі. Напрыклад, у выступленнях дэпутатаў З. Пазчяка, У. Голубева, В. Ганчара выказвалася думка аб тым, што найперш трэба выпрацаваць на сесіі ўласную канцэпцыю. Бо сёння, яшчэ не абвясціўшы суверэнітэту, лічаць дэпутаты, Беларусь не можа ўдзельнічаць у перагаворах ці кансультацыях з іншымі рэспублікамі, якія ўжо дэкларавалі суверэннасць, на роўных, а толькі ў якасці назіральніка.

Паўнамоцнасць нашых прадстаўнікоў на пасяджэнні Савета Федэрацыі давялося пацвярджаць пайменным галасаваннем. А назаўтра, 20 чэрвеня, дэпутаты амаль аднагалосна выказаліся за ўключэнне ў парадак сесіі пытання аб Дэкларацыі аб дзяржаўным суверэнітэце рэспублікі. У прынятай пастанове адзначаецца: «Разгледзець гэта пытанне як першачарговае...» Створана камісія па падрыхтоўцы праекта Дэкларацыі ў складзе 35 дэпутатаў на чале з М. Дземянцеем.

АТРЫМЛІВАЕЦЦА досыць цікавая сітуацыя. Вынікі галасавання 20 чэрвеня сведчаць, што неабходнасць абвяшчэння суверэнітэту Беларусі ўспрымаецца дэпутацкім корпусам як штосьці само сабой зразумелае. Абмеркаванне 19 чэрвеня — аб тым, што «дэмакраты» нібыта ўпарцяцца і зноў, маўляў, усчынаюць спрэчкі на роўным месцы.

Звернемся, так бы мовіць, да гісторыі пытання. Да нядаўняй гісторыі, звязанай з выбарчай кампаніяй і першымі днямі працы нашага парламента. Ідэі незалежнасці, рэальнага суверэнітэту Беларусі, вяршэнства законаў рэспублікі на яе тэрыторыі, поўнай гаспадарча-эканамічнай самастойнасці былі стрыжнем выбарчай платформы Беларускага народнага фронту, а таксама тых кандыдатаў, якія аб'ядналіся ў «дэмакратычны форум». Платформа КПБ таксама ўтрымлівала палажэнне аб рэальным суверэнітэце БССР «у абноўленай адзінай савецкай федэрацыі». Аднак ужо на другі дзень працы сесіі Вярхоўнага Савета прапанова паставіць на парадак дня пытанне аб суверэнітэце «падаўляючай меншасць большасцю» была катэгарычна адхілена.

Якія ж змены адбыліся за месяц? «Ідэя авалодала масамі»? Рашэнне аб выпрацоўцы Дэкларацыі прымаецца пад апладысменты... А мне ў той момант чамусьці ўспомніўся радок з верша У. Някляева: «Усё, што коціцца, дакоціцца да нас». Бо пры ўсёй важнасці змен, напярэдадні якіх знаходзіцца і наш парламент, і ўся наша рэспубліка, мы, думаецца, не павінны забываць, з якой цяжкасцю, як парою драматычна ўкараняліся і ўкараняюцца, пашыраюцца ідэі дэмакратыі. Ці ж можна забыць ідэалагічныя баі мясцовага значэння (і хіба толькі ідэалагічныя), якія адбываліся ў нас на працягу двух мінулых гадоў? І ці спісаны ў архіў звыклы і апрыклы сцэнарый, паводле якога ўсё новае спачатку сустракалася «ў штыкі», адмаўлялася, ганьбавалася?

Так, найперш ідэі прываблiваюць, калі яны ў апазіцыі. Але з гэтага зусім не вынікае, што яны не канструктыўныя. Справа ў тым, што сістэма «не предрасположена» да ідэй. Калі ідэі падстройваюцца пад сістэму, яны не ў стане яе змяніць. Думаецца, пра гэта таксама трэба памятаць палітыкам, якія ўзяліся за ажыццяўленне рэформ. Спашлюся на словы сакратара ЦК ЛКСМБ К. Аетрынскага, выказаныя ім днямі ў інтэрв'ю газеце «Знамя юности»: «У нас же в Минске говорят так: «Верная примета — то, против чего ЦК КПБ и правительство республики выступают сегодня, завтра непременно станет реальностью. Или, в крайнем случае, послезавтра». К сожалению, как ни печально, но это действительно факт».

Што ж спраўдзіцца заўтра? Кажуць, 1 чэрвеня хтосьці ўзняў над будынкам Мінсавета бел-чырвона-белы сцяг, які знялі толькі праз дваццаць хвілін...

А СЁННЯ на парадку дня — суверэнітэт. У сваёй Запісцы па гэтым пытанні Старшыня Вярхоўнага Савета рэспублікі М. Дземянцей лічыць, што «канцэпцыя суверэнітэту Беларускай ССР павінна грунтавацца на прынцыпах:

поўнаўладдзе народа і цэласнасці тэрыторыі рэспублікі, якая не можа быць не толькі зменена, але і выкарыстана ў той ці іншай форме без згоды яе народа;

права самастойна прымаць рашэнні, якія вызначаюць лёс народа, спосабы, напрамкі і сродкі палітычнага, сацыяльна-эканамічнага і культурнага развіцця ў адпаведнасці з яго традыцыямі, патрэбамі і жаданнямі;

правамоцнасць рэспублікі самой устанаўліваць палітычны і эканамічны лад».

Дэпутацкі клуб «ЛіМа»

Магія кворуму?

Мінская гарадская тэрытарыяльная выбарчая камісія 13 чэрвеня ў «поўным саставе» склала з сябе паўнамоцтвы. Мінчукі даведаліся пра гэта з публікацыі ў газеце «Вячэрні Мінск» (14.06.90 г.), дзе і змешчана рашэнне Мінгарвыканкома № 23. І хоць падзея гэта неардынарная (не прыпомніцца, каб нейкая з выбарчых камісій за некалькі дзён да выбараў, кажучы проста, уласнаручна падавала ў адстаўку), пра яе можна было б і не згадваць. Самаадстаўка, дык самаадстаўка. Тым больш, што Мінсавет ужо 14.06.90 г. задаволіў просьбу «членаў» гарадской выбарчай камісіі і даручыў Мінгарвыканкому «ў пяцідзённы тэрмін унесці неабходныя змены ў састаў гарадской выбарчай камісіі», а выканком у той жа дзень прыняў рашэнне «Аб змяненні ў саставе Мінскай гарадской выбарчай камісіі».

Пільны ж чытач, пэўна, заўважыў, што, аказваецца, камісія склала з сябе паўнамоцтвы не «ў поўным саставе». У адстаўку падалі 15 яе членаў. Выходзіць, што старшыня гарвыбаркома А. Мількота, зачытваючы на сесіі Мінсавета рашэнне № 23, гаварыў пра «поўны састаў» дзеля большага эфекту. Толькі падзея гэта, трэба прызнаць, не з'яўляецца тым важным пунктам, на якім варта доўга засяроджваць увагу. Больш істотна, думаецца, было б раскрыць некаторыя акалічнасці самаадстаўкі гарадской выбарчай камісіі, а, разам з тым, разблытаць дастаткова складаны клубок, які накручваўся паступова, збіраючы ў адно многія абставіны грамадска-палітычнага жыцця як Мінска, так і рэспублікі.

Аўтар гэтых радкоў каля двух месяцаў назад выказваўся на старонках тыднёвіка «Літаратура і мастацтва» пра некаторыя непаразуменні, што ўзніклі паміж часткаю народных дэпутатаў гарсавета і гарадской выбарчай камісіяй у сувязі з неадназначнасцю прачытання кожным з бакоў асобных артыкулаў выбарчага заканадаўства рэспублікі. Недасканаласць закона давала магчымасць разумець яго так, як хацелася б большасці членаў камісіі. Пра сваю нязгоду з некаторымі рашэннямі гарвыбаркома выказваліся дэпутаты і ў ходзе сесіі Мінсавета. Асабліва ж ускладніліся ўзаемаадносіны паміж народнымі дэпутатамі, якія найперш прадстаўляюць групу «Дэмакратычная плынь», і часткай членаў камісіі ў сувязі з разглядам справы з выбарамі па 204-й сталічнай акрузе, дзе кандыдат, па заключэнні акруговай выбарчай камісіі, не быў абраны дэпутатам. Гэта рашэнне было адменена гарадской выбарчай камісіяй, якая аднесла да ліку бюлетэняў «за» і тыя, на якіх прозвішча кандыдата ў народныя дэпутаты было выкраслена. Праўда, у многіх выпадках рыса кранала толькі некаторыя яго літары і далей праходзіла па імені і імені па бацьку. Хто ж з выбаршчыкаў мог думаць, што Закон аб выбарах трэба чытаць да такой ступені літаральна: у артыкуле 47 яго сказана аб выкрэсліванні галасуючым у бюлетэні толькі «прозвішча кандыдатаў, супраць якіх ён галасуе». Часовай мандатнай камісіяй, якая правярала правільнасць правядзення выбараў, былі выяўлены і іншыя парушэнні па названым выбарчым участку. У выніку супраць прызнання паўнамоцтваў дэпутата прагаласавала 106 з прысутных на сесіі народных абраннікаў.

Кропляй жа, якая хіснула шалі 15 членаў Мінскай гарадской выбарчай камісіі на карысць складання сваіх паўнамоцтваў, сталі падзеі, што разгарнуліся вакол галадоўкі на плошчы Леніна машыніста Мінскага лакаматыўнага дэпо В. Забалоцкага. Ён дамагаўся ад Мінгарвыбаркома рэгістрацыі кандыдатам у народныя дэпутаты, бо лічыў, што атрымаў адмову незаконна. Пытанне пра рэгістрацыю В. Забалоцкага падымалася на сесіі гарадскога Савета не першы раз. Значная частка дэпутатаў была ўпэўнена, што адмова дадзена незаконна. Прэтэндэнт на кандыдацтва вытрымаў тэрміны падачы пратакола ў выбарчую камісію, якія патрабуюцца законам, усе дакументы былі ў поўным парадку. Камісія ж, як сказаў выступаючы на сесіі А. Мількота, карысталася не артыкуламі рэспубліканскага выбарчага заканадаўства, а тлумачэннем Цэнтральнай камісіі па выбарах народных дэпутатаў БССР «Аб некаторых пытаннях работы акруговых і тэрытарыяльных выбарчых камісій па выбарах народных дэпутатаў БССР і народных дэпутатаў мясцовых Саветаў БССР». Некалькі разоў на сесіі А. Мількоту было зададзена пытанне: «Ці быў В. Забалоцкім парушаны Закон аб выбарах? Так ці не?» Адказам было або маўчанне, або — зноў жа спасылка на згаданае тлумачэнне Цэнтрвыбаркома.

Пасля абмеркавання гэтага пытання сесія Мінгарсавета падрыхтавала праект пастановы, у якім гаворыцца: «адмяніць рашэнне акруговай і гарадской выбарчых камісій аб адмаўленні ў рэгістрацыі кандыдата ў народныя дэпутаты гарсавета грамадзяніна Забалоцкага, як неадпавядаючае Закону аб выбарах; звярнуцца ў гарадскую камісію з прапановай неадкладна разгледзець пытанне аб рэгістрацыі грамадзяніна Забалоцкага кандыдатам у народныя дэпутаты гарадскога Савета; упраўленню аховы здароўя неадкладна ўстанавіць медыцынскі кантроль за станам здароўя грамадзяніна Забалоцкага». Варта сказаць, што днём раней гарадская камісія мелася разглядаць пытанне аб рэгістрацыі В. Забалоцкага, як тое было ёй рэкамендавана Цэнтральнай выбарчай камісіяй. Але на пасяджэнні гарадской камісіі... не было кворуму для прыняцця рашэння. Гэтак жа не стала кворуму і на вячэрнім пасяджэнні сесіі Мінсавета, калі трэба было прыняць цытаваны праект пастановы.

Не хочацца думаць, што нехта з народных абраннікаў ператварыў сесію ў сход дэпутатаў — так менавіта павінна яна называцца без кворуму — з-за абыякавасці да лёсу чалавека, які дамагаецца ўсяго толькі (!) выканання закона. Не хочацца таксама рабіць нейкіх высноў з далёкім прыцэлам, але не аказалася кворуму на сесіі гарадскога Савета і ў пятніцу. Частка дэпутатаў хварэе. Некаторыя абраннікі народа палічылі, што іх вытворчыя абавязкі важнейшыя за дэпутацкія, і пайшлі на працу або ўвогуле з'ехалі ў камандзіроўку. Некалькі дэпутатаў аддалі перавагу перад сесіяй Мінсавета абласной партканферэнцыі. Пра свае рашэнні яны, зразумела, не папярэдзілі астатніх паўтары сотні дэпутатаў.

Цалкам усведамляючы тупіковасць сітуацыі (новы склад гарадской выбарчай камісіі не сфарміраваны, сесія не можа прыняць рашэння з-за адсутнасці кворуму, а жыццё чалавека апынулася ў небяспецы), кіруючыся гуманнымі памкненнямі, сем дэпутатаў Мінсавета звярнуліся да В. Забалоцкага з настойлівай просьбай перапыніць галадоўку. Улічваючы многія акалічнасці дастаткова «вязкага» ходу сесіі Савета, наспела патрэба гаварыць з пэўнай заклапочанасцю пра пройдзены мінскімі дэпутатамі месячны шлях і, найбольш, пра перспектывы руху наперад. Адна справа, калі ішлі дэбаты вакол кандыдатур старшыні Савета і яго намесніка: павольна, часам адступаючы, спрабуючы розныя варыянты, рухаліся дэпутаты да свайго рашэння. Але зараз, калі нарэшце была дасягнута згода і былі абраны дзве першыя асобы Савета, і настала якраз пара фарміраваць прэзідыум, пачалі тварыцца неверагодныя рэчы. Рэгістрацыі і перарэгістрацыі адбываюцца па некалькі разоў на дзень, забіраючы каля гадзіны патрэбнага для працы часу.

Слова «кворум», падобна, некаторым дэпутатам пачынае сніцца. Хочаш ці не, але некаторыя з іх дапускаюць думку пра наўмыснае тармажэнне ходу сесіі. Зараз колькасны склад дэпутацкіх груп дазваляе выпрацоўваць кампрамісныя рашэнні, змушае весці перагаворы. Ідзе нармальная для ўсяго цывілізаванага свету, але нечуваная для нас, парламенцкая работа. Менавіта гэта, падобна, і недаспадобы некаму, хто адкрыта сказаць пра свае намеры не хоча, але ўмела ўмешваецца ў працэсы, што адбываюцца на сесіі Мінсавета.

Не буду арыгінальным, калі скажу, што даводзіцца здзіўляцца маўчанню партыйных кіраўнікоў горада, якія таксама з'яўляюцца народнымі дэпутатамі гарсавета. Падобныя думкі выказваліся дэпутатамі з трыбуны, гучалі ў інтэрв'ю радыёперадач «Мікрафон перабудовы». Імі ўжо адзначалася, што для некаторых з абраннікаў народа дысцыпліна партыйная больш важная за дэпутацкую. Нашы выбаршчыкі выказвалі давер таму ці іншаму кандыдату ў народныя дэпутаты не зважаючы на партыйнасць, веравызнанне, прыналежнасць да грамадскіх арганізацый або рухаў. Зараз у Савеце 65,9 пра-

На мінулым тыдні дэпутаты атрымалі шэраг матэрыялаў, у тым ліку і ўнесены Прэзідыумам Вярхоўнага Савета праект Дэкларацыі аб дзяржаўным суверэнітэце, дзе гэтае паняцце трактуецца «як вяршэнства, самастойнасць і паўната ўлады рэспублікі ў границах яе тэрыторыі, а таксама незалежнасць рэспублікі ў знешніх адносінах». У адрозненне ад, скажам, аналагічнага расійскага дакумента, які складаецца з пятнаццаці пунктаў, у праекце нашай Дэкларацыі пакуль што трыццаць адно палажэнне, згрупаванае ў адзінаццаць раздзелаў. Такіх, як «Самавызначэнне беларускай нацыі», «Грамадзянства», «Неад'емныя суверэнныя правы», «Новы Саюзны Дагавор», і іншых.

Згадаю і яшчэ адзін праект — распрацаваную групай вучоных-эканамістаў пад агульным кіраўніцтвам Старшыні Савета Міністраў рэспублікі В. Кебіча «Канцэпцыю эканамічнага суверэнітэту Беларускай ССР». У ёй, у прыватнасці, адзначаецца: «Забеспячэнне эканамічнага суверэнітэту... мае на мэце стварэнне новай эканамічнай сістэмы, якая адлюстроўвае інтарэсы рэспублікі і волевыяўленне яе народа, выкарыстоўвае ўсе дасягненні сусветнай цывілізацыі і дае дзяржаўным органам рэспублікі суверэнныя права распрацоўваць і ажыццяўляць стратэгію і тактыку сацыяльна-эканамічнага развіцця».

ТО Ж, будзем і далей сачыць за работай сесіі беларускага парламента. Думаецца, у бліжэйшы час нас чакаюць і гарачыя дэбаты, і важныя рашэнні.

Андрэй ГАНЧАРОЎ.

цэнта камуністаў, 31,8 працэнта беспартыйных, 1,6 працэнта камсамольцаў. Немалая колькасць сярод іх кіруючых работнікаў розных сфер і ўзроўняў. Вельмі ж дзіўна выглядае, калі рабочы-камуніст, дэпутат Мінсавета, член бюро гаркома КПБ усхваляваны гаворыць пра малаэфектыўнасць работы сесіі, і ў той жа час кіраўнік буйнога сталічнага прадпрыемства, таксама член бюро гаркома, заяўляе пра прыярытэтнасць партыйнай дысцыпліны над усім астатнім і, зыходзячы з гэтага, патрабуе перапыніць сесію для правядзення пленума гарадскога камітэта КПБ.

Чытачы беларускай перыёдыкі, магчыма, ужо звыкліся з абвінавачваннем «нефармалаў» ва ўсіх дапушчальных і навет недапушчальных грахах. Нешта падобнае колькі разоў гучала і на сесіі гарсавета ў адрас «Дэмакратычнай плыні», якую ці ад няведання, ці наўмысна адназначна прыпісалі да БНФ. Тым самым ствараючы з яго «традыцыйны» вобраз нейкага монстра. Праўда, тыя залпы былі зроблены, што называецца, «у белы свет». Сябры групы «Дэмакратычная плынь», а з імі — і групы «Содружество», шэраг «незалежных» дэпутатаў адназначна выказваюцца за ўдумлівыя крокі наперад, гатовы падтрымаць любую здаровую ініцыятыву дзеля паляпшэння сітуацыі ў горадзе. Здавалася б, для паступальнага руху трэба зусім мала — стварыць новую, але надзвычай патрэбную рабочую структуру гарадскога Савета — прэзідыум, зацвердзіць склад Мінгарвыканкома, прыняць некалькі важных для горада дакументаў. Але, як апісана вышэй, пытанні гэтыя ўвогуле не абмяркоўваюцца з-за адсутнасці злашчаснага кворуму.

Падзеі, што адбыліся ці адбываюцца ў розных Саветах рэспублікі, не дазваляюць задаволіцца роляй іх старонняга сузіральніка. Жыць учарашнім днём не выпадае. Зараз ужо не толькі з захаду і поўначы, але і з поўдня ды ўсходу ад Беларусі — бурлівае мора пераменаў. Ці нашаму народу, як і колькі часу раней, адведзена ўсяго толькі месца ў шэрагу звычайных статыстаў гісторыі, ці мы ўсё ж станем яе творцамі?

Ігар ЧАРНЯЎСКІ,
народны дэпутат Мінсавета, сустаршыня дэпутацкай групы «Дэмакратычная плынь».

ПА СТАРОНКАХ ДРУКУ

«Прадухіліць катастрофу культуры»

Пад такім загалоўкам газета «Советская культура» ў нумары за 16 чэрвеня надрукавала зварот да Прэзідэнта СССР, Вярхоўных Саветаў краіны, саюзных і аўтаномных рэспублік. У дакуменце, падпісаным міністрам культуры СССР М. Губенкам, першым сакратаром праўлення СП СССР У. Карпавым, старшынёй праўлення СТД СССР К. Лаўровым, старшынёй Савецкага фонду культуры Д. Ліхачовым і іншымі аўтарытэтнымі грамадскімі дзеячамі, ад імя работнікаў культуры, адукацыі і мастацтва, членаў творчых саюзаў сярод іншага зазначаецца:

«Досыць абыякавасці! Давайце зразумеем: калі мы гаворым пра развал эканомікі, заняпад маралі, азлабленне людзей, рост злачыннасці, дзікія міжнацыянальныя сутычкі — прычыны ў гэтага не толькі палітычныя і не толькі сацыяльныя. Прычына найперш у масавым бескультур'і народа. «Невуцтва — маці ўсіх злачынстваў», — пісаў Бальзак. Семдзесят гадоў культура падвяргалася ціску з боку адміністрацыйна-загаднай сістэмы, уступаючы ў няроўны бой з амаральнасцю і ўбоствам думкі.

...Культура і адукацыя — гэта, можа быць, той руль, не выправіўшы які, мы не выправім хаду ўсяго карабля перабудовы.

...Разумеем: краіна ў найглыбокім эканамічным крызісе. Але чаму ў ахвяру прыносяцца культура, народная адукацыя, без якіх жыццё грамадства губляе сэнс? Культура — гэта сумленне грамадства, яго экалогія, жыццёвае асяроддзе. Нарэшце, гэта люстэрка грамадскага ладу».

Аўтары звароту заклікалі і Прэзідэнта, і народных дэпутатаў скарыстаць увесь аўтарытэт і ўладу дзеля сапраўднага надання прыярытэтнага характару развіццю айчыннай культуры, зрабіць усё магчымае і немагчымае дзеля яе выратавання.

28 чэрвеня работнікі культуры і члены творчых саюзаў і арганізацый праводзяць акцыю ў абарону культуры.

«З мэтай прыцягнення ўвагі грамадства да патрэб культуры адукацыі,— адзначаецца ў звароце, апублікаваным на старонках «Советской культуры», — мы заклікаем у гэты дзень **у 19 гадзін 30 хвілін** нашых калег ва ўсіх тэатрах, кінатэатрах, канцэртных залах, палацах культуры і іншых установах культуры і мастацтва **на 5 хвілін спыніць паказ спектакляў, канцэртаў і кінасеансаў**; у нашых творчых саюзах, журналісцкіх калектывах і выдавецтвах, у музеях і бібліятэках, клубах і парках правесці на працягу дня мітынгі, сходы, збор подпісаў і іншыя мерапрыемствы».

І яшчэ адна цытата, якая самым непасрэдным чынам тычыцца закранутай тэмы. Яна належыць вядомаму культуролагу, доктару філасофскіх навук Вадзіму Чурбанаву, па ініцыятыве якога, дарэчы, упершыню за ўсю гісторыю правядзення партыйных форумаў XXVIII з'езд КПСС будзе разглядаць рэзалюцыю аб новай палітыцы ў галіне культуры. «Ніякага рэшткавага падыходу да культуры ў нас не было,— гаворыць прафесар В. Чурбанаў у інтэрв'ю штотыднёвіку «Поиск» (№ 23). — Культуры давалі роўна столькі, колькі было трэба існуючаму рэжыму, яго палітычнай і эканамічнай сістэме, а таму гэты прынцып можна назваць не рэшткавым, а дастатковым. Пашыты на гэтыя грошы «ўбор» самога «караля» зусім задавальняў, бо адпавядаў заказу... Эканоміцы з яе масавымі будоўлямі накшталт Магніткі ці БАМа не патрэбен быў сапраўды адукаваны, культурны, самастойна думаючы чалавек, які не вытрымаў бы становішча шрубкі, адразу зразумеў бы бязглуздзіцу таго, што адбываецца. Палітычная сістэма таксама не мела патрэбы ў высокакультурных людзях, здольных да крытычнага аналізу рэчаіснасці».

Вельмі хацелася б, каб гэтыя публікацыі — ці то ў арыгінале, ці то ў нашым пераказе — абавязкова трапілі на вочы прадстаўнікам дэпутацкага корпуса рэспублікі. Бо заклік «Прадухіліць катастрофу культуры!» актуальны і для Беларусі.

Наш аглядальнік.

У горадзе Рагнеды і Ізяслава

9 чэрвеня адбыліся 2-я Заслаўскія чытанні маладых навукоўцаў Беларускага навукова-гуманітарнага таварыства (БНГТ). Тэма іх — ці не самая папулярная зараз у рэспубліцы: «Беларусь: паміж Усходам і Захадам».

Сур'ёзнасць і маштабнасць заяўленай тэмы патрабавалі гэтакага ж сур'ёзнага і глыбокага падыходу. Да гонару ўдзельнікаў чытанняў, яны аказаліся на вышыні сваёй задумы.

Да асэнсавання месца Беларусі ў той сітуацыі, што складваецца ў свеце, прамоўцы падступаліся з самых розных накірункаў: геаграфічна — ад Азіі да Паўднёвай Амерыкі; храналагічна — ад часоў «індаеўрапейскай еднасці» да сучаснасці і бліжэйшай будучыні. Гэтакай разнастайнасці, бясспрэчна, спрыяла тое, што БНГТ аб'ядноўвае маладых навукоўцаў рознай накіраванасці: гісторыкаў, філосафаў, археолагаў, культуролагаў, сацыёлагаў, палітэканомаў, літаратуразнаўцаў і мовазнаўцаў.

Філосаф В. Адзіночанка зрабіў даклад, у якім прапанаваў экзістэнцыяльную катэгорыю «Беларускі шлях». У доказнай частцы даклада ім была зроблена істотнейшая заўвага, што распачатыя дыскусіі пад дэвізам «Беларуская ідэя» (гл., напрыклад: Крукоўскі М. Мастацтва і беларуская ідэя. — «Мастацтва Беларусі», 1990, № 3) сёння шмат у чым выглядаюць анахранізмам. Пасля тых духоўных зрухаў, што адбыліся ў Еўропе апошняга стагоддзя, мы, сапраўды, ужо не маем права некрытычна пераносіць культурны сімвал іншага народа (тут: рускага) на нашу культурную сітуацыю.

Аналізуючы творчасць выдатнага беларускага мысліцеля Ігната Абдзіраловіча (Канчэўскага) у кантэксце тае праблематыкі, што займала буйнейшых еўрапейскіх філосафаў (Ф. Ніцшэ, М. Хайдэгера, Х. Артэгу- і-Гасэта, М. Бярдзяева ды інш.), В. Адзіночанка зрабіў выснову, што тэрміналагічнай калькі «беларуская ідэя» лепей карыстацца больш аўтэнтычным тэрмінам «беларускі шлях». Асноўны аргумент прамоўцы можна выразіць у форме сімвалічнага сілагізму: 1) «руская ідэя» — гэта тое, што Бог задумаў пра рускі народ (М. Бярдзяеў); 2) але «Бог памёр» (Ф. Ніцшэ); 3) значыць, пра беларускі народ ён задумаць ужо анічога не можа. Адсюль вынікае галоўнае: значыць, беларускі народ мае сам задумаць пра сябе альбо, у больш сучасных тэрмінах, сам выбраць сабе «шлях».

Гэтая змена суб'ектаў гісторыі (Бог — у рускіх, сам народ — у беларусаў) зусім не ёсць вынік тэарэтычных спекуляцый неадраджэнцаў з БНГТ. Такая пастаноўка асноўнага экзістэнцыяльнага пытання глыбока карэніцца ў самой беларускай традыцыі. Вось, да прыкладу, што пісаў кіеўскі летапісец пра крывічоў: «...си же творяху обычая кривичи. прочии погании. не ведуще закона божя но творяще сами собе закон». Гэта — ў XII ст. А вось аргумент аднаго з першых «нацыянальна сведамых» беларускіх інтэлігентаў: «И слушне за правду маем, зашто пану богу дяковати, же по панованьем королей их милости и великих князей, панов наших тую владзу и вольность у руках своих маем, а права сами собе творачы яко найбольшей можем волности своее вовсем постерегаем, бо не только сусед а сполный наш обыватель в отчизне, але сам господар пан наш жадное звирхности над нами заживати не можеть, одно только, колько ему право допущаеть. ...А если которому народу встыд прав своих не умети, поготовю нам, которые не обчым яким языком, але своим власным права списаныя маем и кождого часу, чого нам потреба ку отпору всякое кривды, ведати можем». (Леў Сапега. 1588 г.) Натуральна, што гэты ўласны «шлях творчасці» (па І. Абдзіраловічу) не мог не выклікаць адмоўнай рэакцыі з боку суседніх манархаў і жадання скарыць ганарлівых вальналюбцаў (узгадайма забітага Рагвалода і зняважаную, але не зломленую Рагнеду і яе сына-заступніка Ізяслава.

Аднаму з найбольш трагічных момантаў у нашай гісторыі — вайне з Маскоўскай дзяржавай 1654—1667 гг., якая агукаецца нам шчэ й дагэтуль,— быў прысвечаны даклад старшыні БНГТ гісторыка Г. Сагановіча.

З прыманнем канцэпцыі «шляху» пачаткова статычны вобраз праблемы «Беларусь: паміж Усходам і Захадам» пачаў набываць на чытаннях належны дынамізм. Так бывае часта, што адно толькі слова можа падвесці пэўны вынік доўгім пошукам, стаўшыся, урэшце, адмысловым словам-сімвалам, словам-ключом. Наогул статычны стэрэатыпны вобраз самой Беларусі павінен быць разбураны, а Беларусь з «еўрапейскага калідору» (па тэрміналогіі І. Бабкова), па якім маніліся гаціць свае шляхі і Усход і Захад, мае стаць сапраўдным суб'ектам гістарычнага працэсу на сваіх уласных, як той казаў, «адвечных шляхах».

Тое, што было вынесена на абмеркаванне ўдзельнікамі 2-х Заслаўскіх чытанняў, можна лічыць добрым даробкам і спадзявацца на плён у наступным. Спектр праблем на чытаннях быў даволі шырокі і ў невялічкай нататцы няма мажлівасці нават пералічыць усе. Але матэрыялы пытанняў будуць апублікаваны, і ўсе, хто зацікавіцца, змогуць пазнаёміцца з імі ў поўным аб'ёме.

Напрыканцы хацелася б шчыра падзякаваць адміністрацыі і супрацоўнікам Заслаўскага гісторыка-культурнага запаведніка за клопат і неацэнную дапамогу ў арганізацыі і правядзенні навуковых чытанняў БНГТ. Гэта дзейсны ўклад з іх боку ў адраджэнне культурных традыцый горада, звязанага з дарагімі для беларусаў імёнамі — Рагнеды і Ізяслава.

Сяргей САНЬКО.
сакратар БНГТ, аспірант ІФП АН БССР.

Віншуем!

За вялікі ўклад у развіццё савецкай літаратуры Указам Прэзідэнта СССР пісьменнік **ЛУЖАНІН-КАРАТАЙ** Аляксандр Амвросьевіч (Максім Лужанін) узнагароджаны ордэнам Леніна.

Мастацтва — агульная мова

У майскія дні ў галерэі ратушы Райнікендорфа (раён Заходняга Берліна) працавала выстаўка твораў беларускіх мастакоў Кашкурэвічаў — бацькі і двух сыноў.

Выстаўка адразу выклікала цікавасць у мясцовай творчай інтэлігенцыі. У водгуках нямецкай прэсы адзначалася вялікае ўражанне ад антыфашысцкіх графічных аркушаў Арлена Міхайлавіча Кашкурэвіча, іх уздзеянне на пачуцці і сумленне гледачоў. Высокую ацэнку атрымалі яго ілюстрацыі да «Фаўста» Гётэ.

Сыны Арлена Міхайлавіча — Ігар і Фёдар — накіроўваюць свой позірк на рэчаіснасць. У жывапісе маладых мастакоў сучаснасць разглядаецца як адрэзак гісторыі. Іх творчасці, як і творчасці Арлена Міхайлавіча, сталага майстра, уласціва бескампраміснасць, вастрыня светаўспрымання. Але ў бацькі і сыноў розны жыццёвы вопыт, творчы тэмперамент. Творы братоў Кашкурэвічаў сцвярджаюць, што «мастацтва не лекар, а боль».

Назва выстаўкі «Эстэтыка ў развіцці» адпавядае сутнасці мастацкай падзеі. Такі позірк на рэчаіснасць блізкі тым, каго хвалюе татальнае бязвер'е, крызісныя з'явы тэхнакратычнай цывілізацыі.

Творы нашых мастакоў, у якіх увасобіліся ўспаміны пра раны мінулай вайны, боль чарнобыльскай катастрофы, трывога за будучыню, знайшлі водгук у сэрцах берлінцаў.

Л. САЛОДКІНА.

З пошты «ЛіМа»

•Родная мова і БТ
•Ахвяры абыякавасці—дзеці
•Рэвалюцыя адмяняецца?

□

Віншую рэдакцыю са смелым крокам—знялі з першай старонкі сваёй газеты даўню стаўшы недарэчным лозунг «Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!». Новы лозунг лічу вельмі ўдалым—вядомы выраз Я. Купалы «Людзьмі звацца». Так, у беларусаў, лічу, застаўся апошні шанц, каб перад усім светам людзьмі звацца. З цікавасцю і болем у гэтай сувязі прачытаў думку Віктара Сіўчыка «Хто мы і куды ідзем?». Цалкам згодны з ім. Гэта сумная праўда, і шкада, што аб гэтым пішуць матэматыкі а не гісторыкі. Мае рацыю Ніл Гілевіч, калі гаворыць, што ўсё тое, што напісана па гісторыі Беларусі пасля 1930 г., трэба перагледзець. А на маю думку—і проста выкінуць на сметнік гісторыі, пакінуўшы для даследчыкаў нейкую колькасць экземпляраў, каб паказаць, як можна, страціўшы сумленне, каверкаць гісторыю свайго народа.

Але як жа зрабіць, каб людзьмі звацца, каб ганарыцца беларускай дзяржавай, роўнай сярод іншых народаў, паважанай усімі, як зрабіць, каб беларусы былі гаспадарамі ва ўласным доме?

Тут прыходзіць думка аб праўдзівасці легенды аб тым, што Бог, дзелячы паміж рознымі народамі зямлю, даваў ім не толькі добрае, але і нешта кепскае. Дык вось, беларусам добрае даў—сінявокую Радзіму, а кепскае—начальства. Бо якія б нацыянальныя парламенты і ўрады прымалі законы аб увядзенні на працягу 5—10 гадоў у грамадскае жыццё роднай мовы, хто б дапусціў, каб не на роднай мове вяліся дэбаты ў нацыянальным парламенце, ці чыталіся малітвы ў цэрквах і касцёлах?

Хіба што спадзявацца на прыход новых, сапраўдных лідэраў нашага народа?

Аляксандр КАЎЦЭВІЧ,
кандыдат тэхнічных навук.

г. Мінск.

□

Калі параўнаць час, у які БТ працуе «па-беларуску», і час, у які яно працуе «па-руску», то выявіцца, што наша рэспубліканскае тэлебачанне больш рускае, чым беларускае. А калі дадаць сюды яшчэ і дзве рускія праграмы ЦТ, атрымаецца, што мы амаль не маем свайго нацыянальнага тэлебачання.

Мне хочацца глядзець беларускія тэлепраграмы ў поўным сэнсе гэтага слова. Калі я не памыляюся, рабочая эфірная мова БТ—беларуская, і нашым тэлежурналістам не трэба аб гэтым забывацца. На жаль, дрэннае валоданне беларускай мовай прымушае «пераключацца» на рускую мову.

Акрамя журналістаў, у тэлеперадачах прымае ўдзел шмат людзей, і далёка не ўсе яны дасканала валодаюць беларускай літаратурнай мовай. Як быць? Вельмі проста: гаварыць так, як у жыцці, на сваёй роднай мове. А беларусам не лішне і напомніць, што БТ—беларускамоўнае.

На БТ здараецца і так, што супрацоўнік тэлебачання гаворыць па-руску, а яго субяседнік — па-беларуску. А некаторыя тэлежурналісты наогул не хочуць гаварыць па-беларуску. Неяк у перадачы «Крок» журналіст Сяргей Вінаградаў заявіў, што ён рускі і яго родная мова руская, якую разумеюць беларусы. Што тут скажаш? Народны артыст СССР Віктар Тарасаў, напрыклад,—таксама рускі, але на сцэне ён гаворыць па-беларуску. Нават лепш за некаторых беларусаў. Думаю, што С. Вінаградаў палічыў бы гэтага выдатнага артыста прафесійна непрыгодным для беларускага тэатра, калі б той, выйшаўшы на сцэну, заявіў, што беларусы разумеюць рускую мову, таму ён будзе «весці сваю партыю» па-руску. Цяжка нават уявіць сабе нешта падобнае. А вось на БТ—гэта рэальнасць. Але ж Беларускае тэлебачанне—дзяржаўная ўстанова суверэннай рэспублікі. Калі мы не будзем паважаць свае законы, то і нас не будуць паважаць.

Нацыянальны нігілізм не прыносіць карысці ні адной нацыі. Наадварот, гэтая амаральная з'ява далёка не бясшкодная і павінна быць асуджана.

Я за стварэнне аптымальных умоў для прадстаўнікоў усіх народаў, што жывуць у Беларусі. Але я і за нацыянальнае адраджэнне беларусаў.

Т. ШПІГАНОВІЧ.

в. Рамель
Столінскага р-на,
Брэсцкая вобласць.

□

Я жыву ў Запарожжы. Сёлета ўпершыню выпісаў вашу газету—«ЛіМ». Руская і ўкраінская мовы мне аднолькава блізкія, а вось з беларускай давялося пазнаёміцца толькі аднойчы, некалькі ў Кіеве купіў часопіс «Маладосць», дзе быў надрукаваны артыкул пра мінскае «Дынама».

Прызнаюся, была ў мяне прадузятасць да беларускай мовы. Але я вырашыў даказаць сабе, што памыляюся.

Ваша газета мне падабаецца, асабліва артыкулы пра літаратуру і грамадска-палітычнае жыццё Беларусі. Мова мне зразумелая, хоць часам даводзіцца замаруджваць чытанне, каб зразумець тое ці іншае слова. Смешна, але толькі адно слова «менавіта» я не магу расшыфраваць, г. зн. знайсці яго эквівалент у рускай. Праўда, сэнс сказа, дзе гэтае слова ўжываецца, мне зразумелы.

Цяпер я ўпэўнены, што тыя рускія, якім страшная ўкраінская або беларуская, таксама тыя, хто ганарыцца неразуменнем сваіх родных украінскай або беларускай, проста ставяцца грэбліва да гэтых моў, пакутуюць ад духоўнай ляноты і проста крывадушнічаюць.

Руская, украінская, беларуская—мовы-браты, і зразумелыя прадстаўнікам гэтых народаў. У кожнай з іх ёсць свая прыгажосць, і кожны народ павінен ведаць і сваю мову, і мову брата-народа, ганарыцца імі.

Людзі, якія не ведаюць сваёй мовы, пагарджаюць ёй, часам нават лічачы гэта за доблесць, проста з'яўляюцца абдзеленымі нечым вялікім, яны абкрадаюць сябе.

Асабіста я рады сувяззю з газетай, з беларускай мовай, якая мне зразумелая і цікавая.

Д. МАСКВІЦІН.

г. Запарожжа.

□

Па службовых справах (а я вайсковец) давялося мне 31 мая быць пасажырам цягніка Дагестан—Масква—Махачкала. Узяцца за пяро мяне вымусіла зусім не тое, што білеце маім і вельмі многіх пасажыраў стаяў вагон № 6, якога ўвогуле не аказалася, і нас «параспіхвалі» ў цалкам запоўнены вагон № 4; і не тое, што харчаванне ў вагонах-рэстаранах не вытрымлівае ніякай крытыкі. Да гэтых дробязяў мы ўжо прызвычаіліся. Пішу я таму, што аказаўся сведкам таго, як беларускіх дзяцей, дзяцей з Чарнобыльскай зоны, везлі на адпачынак у Паўночную Асецію.

Дваццаць пяць дзетак ад сямі да дванаццаці гадоў з СШ № 17 г. Гомеля разам са сваёй настаўніцай Ганнай Іванаўнай Атрохавай і выхавацелькай Святланай Леанідаўнай Атрохавай (якая, дарэчы, была з немаўляткам на руках) амаль дзень чакалі на станцыі Каўказская без аніякай увагі з боку мясцовага кіраўніцтва. Начальнік станцыі паводзіў сябе груба і нахабна. Дадаткова вагона дзецям не выдзелілі. Літаральна запіхвалі іх у наш і без таго перапоўнены вагон. Сваім выглядам дзеці выклікалі спачуванне і спагаду ў пасажыраў. Знясіленыя, галодныя, многія хворыя ад цяжкай, доўгай дарогі, без усялякіх харчоў, толькі торбачкі невялічкія і асабістыя рэчы. Мяне гэта так уразіла і абразіла адначасова. Я ніколі не спадзяваўся так далёка ад радзімы сустрэць сваіх землякоў і натыкнуцца на такую абыякавасць, чэрствасць і жорсткасць.

Як высветлілася потым, спеццягнікам № 354 (дадатковым) адправілі дзяцей з Гомеля. Да цягніка павінен быў быць прычэплены вагон-рэстаран са спецыяльным бясплатным харчаваннем для дзяцей. Аднак састаў рушыў у дарогу без вагона-рэстарана. Дарэчы, дзяцей было некалькі груп. Дык вось, па словах Г. Атрохавай, настаўніцы з Жыткавіч, даводзілася карміць дзяцей хлебам з вадою, бо нічога больш не было. Такім чынам спеццягнік прыбыў на станцыю Каўказская і тут быў расфарміраваны. Палову дзяцей запіхнулі ў вагоны на Майкоп, палову—на Краснадар, а група з Гомеля трапіла да нас. Мушу адзначыць, што і начальнік цягніка А. Сулейманаў, і праваднікі Р. Марціросава і Б. Аліева зрабілі ўсё, што ад іх залежала, каб дзеці не адчувалі сябе кінутымі на волю лёсу. Пасажыры таксама дапамаглі, хто чым мог.

2 чэрвеня, а чацвёртай гадзіны раніцы, дзеці выйшлі на станцыі Беслан Паўночна-Каўказскай чыгункі. Мы дапамаглі вынесці іхнія рэчы. Але і тут іх ніхто не чакаў. Настаўніца накіравалася ў бок вакзала, каб зноў знайсці дзецям нейкі прытулак. Наш цягнік рушыў далей, а купка дзетак засталася самотна стаяць на пероне.

Хто павінен быў парупіцца аб тым, каб перавозка дзяцей была наладжана як мае быць? Ахвярамі нашай абыякавасці не павінны быць дзеці.

А. КАВАЛЁНАК,
ваеннаслужачы.

Валагодская вобласць.

□

Напэўна, многіх чытачоў «Вячэрняга Мінска здзівіў нумар нашай газеты, які выйшаў 18 чэрвеня. Замест звыклага і шматгадовага тытула «Газета Мінскага гаркома Кампартыі Беларусі і гарадскога Савета народных дэпутатаў» было пазначана: «Штодзённая незалежная газета сталіцы Беларускай ССР».

Рэвалюцыя ў газеце? Мабыць, так і ўспрынялі некаторыя гэтае здарэнне. Тым больш, што літаральна назаўтра мы выйшлі ў свет з ранейшым грыфам. «Задавіў гарком»,—здагадаліся найбольш дасведчаныя, а наша рэвалюцыйнасць у вачах грамадскасці яшчэ больш узрасла.

Аднак не ўсё так проста. Вось чаму мы лічым патрэбным выказаць свой погляд на сітуацыю. Асабліва пасля таго, як нашы ўнутрырэдакцыйныя справы сталі здабыткам галоснасці дзякуючы публікацыям у рэспубліканскім друку. Агаворымся, што наша думка—гэта толькі наша думка.

Кіраўніцтва рэдакцыі склікала нас на сход, дзе было прапанавана стаць «незалежнымі». Ад каго? Ад гаркома і ад гарсавета. Аргументацыя: пад «ігам» гаркома працаваць ужо немагчыма, а з гарсаветам, відаць, будзе не лягчэй.

Што ж, ганебны ўціск нашай газеты з боку партыйных органаў ні для каго не з'яўляецца сакрэтам. Сапраўды, трываць такое, асабліва ў наш час, ніяк не выпадае. І мы, журналісты «Вячоркі», заяўлялі пра гэта неаднойчы. Але, зробім на гэтым націск, заяўлялі зусім не тыя, хто сёння абвяшчае «рэвалюцыю»—не рэдкалегія, не адміністрацыя.

Як вядома, новым, дэмакратычным шляхам выбраны Мінсавет заявіў аб сваім выключным праве на «Вячэрні Мінск». Мяркуем, што рашэнне аб перадачы нашай газеты пад эгіду Савета найбольш прымальнае. Але падобна на тое, што менавіта такая перспектыва многім не даспадобы.

Нельга назваць узважаным прыняцце нашай «дэкларацыі аб незалежнасці». Мы разумеем і безумоўна падзяляем імкненне большасці калег адкрыта і шчыра выказваць уласныя думкі. Але не можам не заўважыць іншы бок нашай «кансалідацыі» пад рэвалюцыйным сцягам «свабоды». Маем на ўвазе імкненне нашай адміністрацыі, якая сваёй кансерватыўнасцю, а, магчыма, і няздольнасцю працаваць па-новаму спрыяла зніжэнню аўтарытэту газеты,—замацаваць свае пазіцыі.

Але ці могуць кіраўнікі, якія не цярпелі плюралізму ўнутры рэдакцыі, раптам перайначыцца, стаць дэмакратамі? Мы ў гэта не верым. Няма ў тым, што адбылося, ні паслядоўнасці, ні логікі. Бо лозунг «свабоды» выстаўляюць сёння тыя, хто ўсе апошнія гады свабоду слова ўпарта падаўляў.

Л. КОКТЫШ, Т. ХАРТАНОВІЧ,
журналісты «Вячэрняга Мінска».

Малюнак А. ГУРСКАГА.

Ала СЯМЁНАВА

Ці не кідаем мы камяні ўгору?

Эклектычныя нататкі

У НАС ПРЫНЯТА ўсё ўяўляць глабальна. Маштабна. Эпахальна. Нам не да дробязяў. Есць звычка жыць, углядаючыся ў тое, што там, за небакраем. Што па баках, тут, побач, не заўважаем. Мроі блакітны скок. Ідэалы ператвараюцца ў ілюзіі, ілюзіі ператвараюцца ў ідэалы. Нам няма часу звяртаць увагу на драбнату. Так пільна ўглядаемся, што гэтыя гады пасля чарнобыльскай катастрофы мы і помнілі і не помнілі пра яе. Мы ёсць і, як тое ні ганебна, будзем заложнікамі Чарнобыля, — слушна зазначыў Анатоль Кудравец («Нёман», 1990, № 1). Карты, змешчаныя ў сакавіку 90-га года — нібыта ў жалобным крэпе, усё «зоны» і «зоны». Ці ж тут радыяфобія, як нас папракаюць медыкі і вучоныя з Масквы і МАГАТЭ? Ім, так мовіць, з іх чароўнага далёка лепш відаць. Гэта няўрымслівыя фізікі Я. Пятраеў і В. Несцярэнка, пісьменнік А. Адамовіч — немаведама чаго столькі часу ў званы б'юць. І атамшчык Г. Мядзведзеў нешта выдумляе. А ўсім жа вядома, 35 бэр — асвяжальная доза. І вецер 29 красавіка быў шчаслівы — дзьмуў не на Кіеў. І чаго тыя браткі-беларусы раптам уздыбіліся. Спагадлівы ж народ. Рахманы.

...Пасля апошніх сесій Вярхоўнага Савета БССР нешта скранулася з месца. І ў Арганізацыі Аб'яднаных Нацый (нарэшце!) абвешчана пра няшчасце Беларусі на поўны голас. І абяцаюць новае жытло не толькі тым, хто ў трыццацікіламетровай зоны. І ў саюзным парламенце наша пытанне пастаўлена сярод першачарговых... 21-м! Спагадлівы народ—беларусы...

Мы ўскладаем спадзяванні на новы Вярхоўны Савет Беларусі. Аднак гаворку пра радыенукліды ўсё ж трэба весці па САЮЗНЫМ рахунку. Чаму прыбыткі ад прадпрыемстваў саюзнага значэння ідуць галоўным чынам у агульнадзяржаўную скарбонку? Атрута ж і радыяцыя — «прыярытэтна» нашыя, здароўем расплачваемся мы, беларусы. І нікому справы да гэтага няма.

А якія жудасныя словы гучалі на мітынгу 30 верасня 1989 года, наладжаным БНФ. Жанчына «з зоны» згадала: пасля вайны адна траіх дзяцей падняла, голадна было, але ўсе ведалі, што кубак малака — гэта кубак малака, яблык—яблык, шчаўе—шчаўе... А зараз, як у перакручанай дзіцячай гульні: «так» і «не» не гаварыце, чорнае з белым не бярыце...

Малако ўжо не малако, садавіна — не садавіна. Зямля — не зямля. Горш, як у вайну. Гэта словы той жанчыны. А нашы ж цярплівыя дзядзькі і цёткі ў самую цяжкую хвіліну заўсёды гаварылі: «Абы вайны не было».

І вось палеская, магілёўская зямля, ды наогул уся рэспубліка ў радыеактыўных плямах. Цікава, як бы сёння, у нашых «зонах», трансфармаваўся б міф аб Антэі? Што атрымаў бы той асілак, дакрануўшыся да нашай зямлі? Што адбудзецца з беларускімі Антэямі і іх нашчадкамі? Чаму ў той бядзе, у якой мы не вінаваты, засталіся сам-насам са сваёй уласнай міласэрнасцю? Пад час І з'езда народных дэпутатаў СССР нейкая бойкая дэпутатачка даводзіла М. І. Рыжкову: «На Беларусі занадта хораша жывуць». Разумей — трэба адабраць, падзяліць.

У ВОГУЛЕ з гэтай бясконцай дзяльбой і экспрапрыяцыямі (адымем—падзелім) да чаго мы прыйшлі? Цывілізаваныя краіны, да якіх мы хочам дапяць, памнажаюць, дадаюць, дбаюць. А мы дагэтуль усё толькі аптымістычныя рапарты адбіваем. З нядаўняга аптымістычна-ўпэўненага выступлення намесніка міністра гандлю Беларусі даведаліся — усё звышпланавае застанецца ў рэспубліцы. А планавае — куды? Беларусь жа на гаспадарчым разліку. Але па-ранейшаму дадаём дэфіцыты, зробленыя ў нас, Саюзу, за мяжу. Рознымі шляхамі. З намі ж застаюцца нукліды.

...Калі я прыходжу на Камароўскі рынак, дзе сёння спрэс паўднёвыя людзі з курагой па 12 рублёў за кілаграм і з лімонамі—па 1,5—3 рублі за штуку, а толькі недзе ў куточку сірочы прылавак з мясцовым мясам (таксама не танным), дык згадваю нялёгкае пасляваеннае дзесяцігоддзе. Сваю Заходнюю Беларусь. Тым часам да Мінска трэба было дабірацца суткі. З перасадкамі ў Навае льні і Баранавічах. Цэлае падарожжа. Зараз — чатыры гадзіны ў шыкоўным «Ікарусе». Цукеркі на тую пасляваенную пару былі ў нас дзівосам. Нават падушачкі. Булкі белыя ведалі толькі па святах. Аднак помніцца і іншае. У экзаменістаў і даследчыкаў на гэты конт ёсць факты, лічбы, абагульненні. У мяне ж толькі ўражанні маленства.

...Наваградскі кірмаш. Восень. Дажынкі. Вуліцы аж грукацяць ад цяжкіх вазоў, што кіруюцца па брукаванцы. Парасяты вішчаць, нібыта іх тут, на возе, і смаляць. Нядзеля — кірмашовы дзень. Падзея. З навакольных вёсак самавіты гаспадар вязе яйкі, масла, куранят, слівы, яблыкі, вішні... Напрадвесні — цяляціну. Перад калядамі і калядныя днямі — свежыну. І заўсёды на ўскраіне таго, пасляваеннага Наваградка, ад гары Міндоўга да колішняга, у шасцідзесятыя гады, аэрапорта — вазы, вазы, вазы... Цяляціна на старыя грошы—10 рублёў (1) рубель кілаграм, яйкі—5 рублёў (50 капеек) дзесятак. Вяндліну рабілі ўзімку многія. Самыя адмысловыя паляндвіцы былі ў дзвюх гаспадынь: Буячыхі і Ківачыхі. Няма ўжо ні адной, ні другой, а справу звялі яшчэ раней, пасля шматлікіх пастаноў і ўказаў: тое не трымаць, гэтага не разводзіць...

Паменшала гаспадароў. На кірмашы зараз мала хто купляе — ды і дзе тыя кірмашы... За мясам стаяць у чарзе ў краму. Кааперацыйную.

Паменела гаспадароў... А раней за зямлю і «за польскім часам» (да 39 года), і за расейскім (царскім) судзіліся, здаралася, ледзь не ўсё жыццё. Лапік зямлі... Яму ведалі цану. Ці ведаем сёння? Ці будзе каму зямлю браць, як дадуць?

Адышліся ад той працы не толькі з-за зрынутых у канцы саракавых — сярэдзіне пяцідзесятых хутароў (у тыя гады, як вядома, у Заходняй Беларусі праходзіла татальная калектывізацыя), з-за несправядлівай аплаты, з-за татальнай урбанізацыі. Але не толькі з-за гэтага.

У нас змяшчалі ў газетах партрэты перадавых даярак і льнаводак, пафасна абвяшчалі іх героямі працы. Але хто з вясковых, прыехаўшы ў горад, не чуў абразлівае: «калхознік», «дзярэўня». Тое ж і сёння, хоць мы, здаецца, кожнаму селяніну павінны біць паклоны. У мінскім гастраноме нейкае дзяўчо з «баявой расфарбоўкай» — чырвона-барвовымі вачніцамі—лямантуе: «Что вы тут сталі?» — «Ды вось з вёскі мы», — лагодна-прабачлівым голасам азываецца кабета, уся як ёсць абвешаная хатулямі. «Оно и видно», — з адчуваннем сваёй неаспрэчнай перавагі рэжа дзяўчо. І дадае — як прысуд: «Колхозница». Па ўсім відаць, продкі дзяўчыны, можа, нават яшчэ бацька і маці і сена касілі, і жыта жалі. Але ж яна — ужо «дачынілася» да гарадской культуры, у смак «сталічнай жыткі» ўвайшла. Так бы мовіць, «рэйтынг» займела.

Тандэтны той стыль не сёння з'явіўся, не заўтра знікне. Як і сталічна-правінцыйная фанабэрыя. Аднак, гледзячы ў лістападзе мінулага года па тэлебачанні відэафільм пра амерыканскіх фермераў, мне падумалася, што наўрад ці хто насмеліўся б абразіць гаспадароў з глухога амерыканскага штата. Увогуле фільм глядзеўся як казка-быль: у глыбі Злучаных Штатаў на фермах — камп'ютэры, у свінарніку — чысціня, што ў аперацыйным пакоі, гаспадыня націскае на кнопку — некалькі хвілін — і страва гатовая, націскае на другую — посуд памыты. Фантастыка. Пра катэджы, як цацачкі, пра фермераў, апранутых, як нашы моднікі, я ўжо маўчу. Але, між іншым, падумалася, гледзячы на іх ідэальныя дарогі — а прырода ж у нас нашмат прыгажэйшая...

Мы ўсё гаворым — чалавечы фактар, галоўнае — чалавек. Дзяржава працоўных. А ў сённяшнім неафіцыйным рэйтынгу ледзь не галоўная фігура — гандляр. Уладальнік дэфіцытаў. Дзелавы чалавек. Са з'яўленнем кааператываў — найважнейшая персона. Для набывання оптам. Купляем—прадаём. Калі верыць тэлебачанню і прэсе, ёсць кааператывы іншыя, цывілізаваныя. Не знаю, не знаю...

Дзіўны ўхіл адбыўся ў свядомасці людзей. На авансцэну выйшаў пасрэднік. Мяняла. Купляем — перапрадаём. Купляем — прадаём. Усё на продаж. Золата, тэлевізары, футра, лекавыя травы. Як высветлілася, і танкі, і першаякасная сыравіна для абарончай прамысловасці — таксама. І нашы айчынныя красуні ў гарнітурах Евы здымаюцца на фоне савецкага штандара для «Плэйбоя». Выявілася — тавар канкурэнтаздольны. Нашымі строямі асабліва не здзівіш — хіба што конкурснымі асобнікамі, што часам складаюць заробак сярэдняга саўслужа ці рабочага за пяцігодку. Тут і авантаж і эпатаж. Што мы ў крамах маем, ведаем. А вось выявілася, што місаў у нас, як збаноў у добрага ганчара, на любы густ, хочаш — рэдкія, адзінкавыя экземпляры, хочаш — на ўзроўні сусветных стандартаў. Дапялі-такі да цывілізаваных народаў. А як захліпаюцца ў роспачы-спачуванні сталічныя маскоўскія журналісты — ах, ах, а-я-яй! — як мала зарабляюць нашы мадэлькі ў параўнанні з нянашымі. Ай, які гвалт! «Орёр! Орёр!» — як мовілі гогалеўскія дамы. А колькі зарабляюць там журналісты? Колькі ўрачы? Настаўнікі? Рабочыя? Бібліятэкары?

І можна сабе ўявіць, што адчуваюць нашы дзяўчаты, калі глядзяць на шыкоўныя спонсарызаваныя конкурсы «місаў» — які макіяж! якія ўборы! якія фрызуры! — калі не ў конкурсным нашым жыцці ні мыла, ні пантофляў, нават калі ты прыгожая, як Алена-краса. І ўвогуле, ці хто меў на мэце крамольную ідэю: высветліць, які быў аб'ём бёдраў у Анны Керн або ў той, да якой наш вялікі беларус Максім Багдановіч звяртаўся: «Мне доўгае расстанне з вамі чарней ад вашых чорных кос»? Чароўнасць, высокае харастро — гэта нешта большае, як талія па галівудскіх стандартах, таямніца, не падуладная вымярэнню ў сантыметрах, хаця мы разумеем і бачым, што талія ў Наталлі Мікалаеўны Ганчаровай або Марылі Верашчакі была не з горшых.

І ўвогуле, хараство натуры і таварны выгляд — розныя рэчы. Ўлада высокай красы — гэта не выпрошванне: ці спадабаюся журы? Сапраўднае хараство неаддзельнае ад гонару.

АЛЕ ВЕРНЕМСЯ да нашага нерамантызаванага жыцця. Не так даўно прагучала шматзначнае: «Як мы працуем, так і жывём». Яно так і не так. Так — па тых выніках, што атрымліваем. Не—па тым, колькі сіл аддаецца і аддавалася працы. Такой, што часам згадваецца даўняе, Блокава: «...работай, работай, работай. Ты будешь с уродским горбом За долгой и честной работой. За долгим и честным трудом». Сённяшні 8-гадзінны рабочы дзень — ён для большасці абарочваецца 10—11—12-гадзінным. Хто ж у наш час у вялікім горадзе жыве побач з месцам працы? Тыя, каму пашанцавала, альбо той, хто больш за ўсё мае клопат пра **ўласныя** выгоды. А калі ўлічыць чэргі і пошукі самых элементарных рэчаў, для жанчын яшчэ і хатнюю «змену»—колькі гадзін выйдзе? Як неяк абуралася адна кабеціна, з тых, каму часам даюць пагардлівую мянушку «жанчына з чаргі»: «Чаму застой? Хто стаяў? Усё жыццё круцілася, як верацяно». Ці — як конь на канавязі. Па кругу. Бегма. Але — высветлілася — на месцы...

Ну, а на працы? Зноў жа, як высветлілася, усе мы атрымоўвалі і атрымоўваем недзе каля 20 працэнтаў кошту нашай працы (у індустрыяльных краінах Захаду — 60—70 працэнтаў). А які кошт гэтай працы? Хто калі вызначаў у нас сапраўдных прафесіяналаў? Выдатнага педагога, таленавітага інжынера, урача боскай міласцю? Хіба што ў цырульні відаць, да каго бягуць, а да каго за рукаво цягнуць. Ёсць, то праўда, і каэфіцыенты выпрацоўкі, і кваліфікацыйныя камісіі — але якая ад іх карысць? Адны і тыя ж грошы атрымлівае маладасведчаны чалавек з ведамі «ад сіх да сіх» і сапраўдны спецыяліст, эрудыт, знаўца сваёй справы. Спецыяліст такі хіба што адзіную «прывілею» мае: яго больш за ўсіх нагружаюць, а калі пазбегнуць эўфемізмаў — эксплуатуюць. Напачатку — малады, перспектыўны, вытрымае. Потым — вопытны, іншы так не зробіць. А ўрэшце пасля пажыццёвай працоўнай катаргі — што чалавек мае? Нават ніякіх грашовых і матэрыяльных гарантый. Бо ад рэальна зробленага мала што залежыць. З аднаго боку — прывілеі. З другога — роўнасць, тая самая пашылая ўраўнілаўка, ад якой гасне талент, зацягваецца раўнадушшам сумленная акуратнасць. Каб атрымаць кватэру або пуцёўку ад прафсаюзаў, трэба прайсці размеркавальна - прыстасавальніцкую чаргу, або ўмець паплакацца. Заробак залежыць ад вышыні пасады і ад борздзенькай умеласці «жыць». Асабліва зараз. Са 100 тысяч савецкіх мільянераў у 70 працэнтаў грошы набыты несумленным шляхам. (Лічбы з «Аргументов и фактов»).

...Мы ніколі не прамінём ладкрэсліць, якія дарагія кватэры — у IX, якія танныя — у нас. Але ж ЯКІЯ кватэры танныя і якія — дарагія? Дзе гэта 6 квадратных метраў на чалавека лічацца нормай? У якой цывілізаванай краіне? А чвэртку ці нават трэцюю частку заробку і ў нас плацяць — і зусім не за катэдж, за якія сорак метраў блочнай кааператыўнай кватэры, дзе за адной сцяной з ранку да вечара гучаць рытмы біг-біту, а за другой суседзі могуць кінуцца ў такую гарэзію, што жырандоля аж зойдзецца ад вечна-жалобнага звону.

Вось у нас абвешчана: кожнай сям'і — асобную кватэру да 2000 года. Абвешчана, як гэта звычайна ў нас робіцца, без канкрэтных падлікаў. Урэшце — не беручы пад увагу, што ў нас вымушаны жыць побач музыка і шафёр таксі, настаўнік і чалавек без пэўных заняткаў, асоба, што больш за ўсё любіць цішыню, і аматар дэцыбелаў, рабочы электрастанцыі (тры змены) і дапрызыўнік ці пасляпрызыўнік, у якога тлум вавілонскі штодзень і штоночы. Размаітасць індывідуумаў? Судатыкненні, што жывяць розум і сэрца? Сацыяльная гармонія? У ідэале так, у жыцці — гармідар. Камунальнае пекла. Нават калі ў вас асобная кватэра. Ніякімі ж ахоўнымі законамі спакой грамадзян у нас, па сутнасці, не забяспечаны. З сямі раніцы да адзінаццаці вечара кватэра можа хадзіць ходырам — і ўсё нармальна, законна. І мільгане часам несучасная думка, што самым разумным было рассяленне ў сярэднявеччы: квартал шаўцоў, квартал кавалёў, квартал краўцоў... А прымроены ў сутарэннях Кастэль Нуова Горад Сонца і ягоныя геаметрызаваныя варыянты канца XX стагоддзя — арэчаўленыя ўтопіі, што добра выглядаюць у мары і на паперы, але паныланязручныя ў жыцці.

Кватэра — не толькі метры карыснай плошчы, гэта жытло, што ўплывае на настрой, самаадчуванне, свядомасць урэшце. А большасць з нас мае ўсё жыццё перад вачыма карабок з панылымі чатырохкутнымі выгібінамі, што завуцца высакапышна — лоджыя, ці сцянуманаліт з бясконцай чарадой вокнаў, ці фацэтныя горы тары — калі вам «пашэнціла» на краму ў першым паверсе. І ў хаце ў большасці стандарт ніяк не міжнароднага ўзроўню і звычнае ліпенне ад палучкі да палучкі. Дзе яны, дарэчы, тыя звышвысокія заробкі, з поваду якіх такі лямант у нашым саюзным парламенце? Хто гэта дадаў грошы ДЗЯРЖАЎНЫМ рабочым і служачым? Калі і як будзе дзейнічаць новы закон пра маёмасць? Ці не адбудзецца тое ж, што з кааператывамі? У нас жа, як вядзецца, мадэль—адно, у жыцці — нешта зусім іншае.

Мы ўсё кіраваліся вогненнымі лозунгамі на вогненных плахтах, а зараз высветлілася, што жыве і квітнее старая канфармісцкая праўдачка: «Трэба ўмець жыць». І гэтая праўдачка — яна кіруе ўчынкамі нават некаторых з тых, хто лічыць сябе праўдашукальнікамі, актыўнымі перабудоўцамі. Яны так хораша і таленавіта хлусяць: глядзіце, якія яны змагары, якія ў іх інсургенцкія погляды на жыццё. А відочна, як тыя дзяўкі ў «Плэйбоі», прымерваюцца: а як жа яны выглядаюць на фоне рыштаванняў перабудовы — ці эфектна?

(Працяг на стар. 12—13).

Разуменне сучасных перабудовачных працэсаў у нас, у Беларусі, з самага пачатку шчыльна звязалася з усведамленнем іх адраджэнцкага характару. Нездарма ж народны фронт Беларусі ўзяў найменне «Адраджэнне», і няма гісторыка, сацыёлага, літаратара, каб не гаварылі і не пісалі пра наш час, як пра Адраджэнне.

Алег ЛОЙКА

Адраджэнне без кансалідацыі ?..

У ВОГУЛЕ Адраджэнне любога народа дасюль не мыслілася без кансалідацыі яго культурных сіл, і адзін з прыкладаў таго дае таксама і наша нацыянальная гісторыя. Бо калі браць беларускае Адраджэнне XVI стагоддзя, то яно якраз — першы прыклад яднання вакол адраджэнцкіх ідэй, вакол русчыны, роднай мовы і прадстаўніка гарадскога паспольства Ф. Скарыны — з яго асветніцтвам, што было вышэй канфесіяналізму — па-над каталіцкім касцёлам і праваслаўнай царквой; і дзеяча рэфармацыі Сымона Будната; і палітычнага і культурнага дзеяча з феадальнай эліты — Льва Сапегі. Ад Францішка Скарыны да Льва Сапегі развівалася беларускае Адраджэнне XVI стагоддзя — патрыятычнае, на базе дэмакратычных ідэй свайго часу, з клопатам аб лёсе беларускага паспольства, кансалідаванае менавіта беларускасцю.

А што мелася ў XIX, на пачатку XX стагоддзя? Мы тут мелі сапраўды «адзіную плынь», бо вакол ідэй адраджэння беларускага народа роўным чынам ядналіся ў сваім часе дзеячы самага рознага сацыяльнага паходжання і самых розных ідэйна-палітычных і літаратурна-эстэтычных арыентацый. Верш сялянскага паэта Паўлюка Багрыма захаваў у памяці шляхецкі дзеяч, а ў 50-я гады шляхецкія лібералы і рэвалюцыянеры, як і рэвалюцыйная дэмакратыя Беларусі, ішлі ў нацыянальна-вызваленчым руху поруч, будучы — усе будзіцелямі нацыянальнай і палітычнай свядомасці народных нізоў; будучы беларускімі адраджэнцамі. Не было без размежаванняў, калі Ф. Багушэвіч не прымаў паказу беларускага мужыка ў Вінцука Дуніна- Марцінкевіча («Нібы смеючыся з нашага брата пісана»), калі Альгерд Абуховіч адваёўваў у беларускай літаратурнай мове месца слуцкаму дыялекту. Але і сацыяльна-радыкальны разначынец Францішак Багушэвіч і ліберальны памешчык Аляксандр Ельскі, абодва яны былі пад адзіным сцягам беларускага адраджэнцтва, — пад адзіным!

Колькі, аднак, нацярпеліся непатрэбшчыны нашы маўклівыя продкі ад былых (былых?) нападак на іх за ідэі нацыянальнага адзінства і класавага салідарызму, пакуль, нарэшце, не прагучалі ў нас у апошні час сцвярджэнні таго, што ідэя салідарызацыі ўсіх нацыянальных сіл у нацыянальна-вызваленчых рухах гістарычна прагрэсіўная. І асабліва сімпатычнаю гэтая ідэя, аказваецца, была ў нас у XIX стагоддзі, дзе пан—сацыяльны вораг селяніна, як, напрыклад, пан Вінцук Дунін-Марцінкевіч, салідарызаваўся яшчэ ў 40-х гадах XIX стагоддзя з прыгонным мужыком-хамам, быдлам для якіх-небудзь беларускіх салтычых. І калі ідэя сацыяльнага салідарызму і была ў В. Дуніна-Марцінкевіча ўтапічнай, то не па разраду ўтапічнасці ішла ідэя яднання ў плоскасці нацыянальных інтарэсаў, — на гэтым узроўні яна мела перспектыву, бо мела наперадзе адраджэнцкія ідэі Янкі Купалы, Якуба Коласа, Максіма Багдановіча, Максіма Гарэцкага, Алеся Гаруна, мела практыку і тэорыю адраджэнізму «Нашай Нівы» ў асобах яе арганізатараў і кіраўнікоў братоў Івана і Антона Луцкевічаў.

Так званы нашаніўскі перыяд нашай літаратуры пачатку XX стагоддзя — гэта, можна сказаць, трыумф кансалідацыі ўсіх літаратурных сіл на адраджэнцка-народным грунце. «Нашай Нівай» якраз найярчэй было ў нас паказана, на якія вяршыні нацыянальнага адраджэння можа ўзняць кансалідацыя ўсіх яго сіл пры, — кажучы сучасным словам, — плюралізме думак і літаратурных школ, пры рознаякіх творчых індывідуальнасцях і кірунках літаратурна-эстэтычных плыняў.

ПА-НОВАМУ ідэя салідарызму як бы адраджаецца, шукае свайго творчага, гуманістычнага працягу ў наш перабудовачны час. І, можа, гэта зараз найбольш выразна заўважна ў нашых сённяшніх адносінах з замяжой, у вяртанні ў матчынае ўлонне беларускай паэзіі створанага на эміграцыі такімі паэтамі, як Наталля Арсеннева, Масей Сяднёў, Хведар Ільяшэвіч, Уладзімір Дудзіцкі, Алесь Салавей і іншыя. «Куды не трапяць беларусы!»

Але пра тых беларусаў, якія куды толькі ні траплялі, як жа доўга дбала цішком адна толькі газета «Голас Радзімы». Ды пакуль што ў нас на беларускую эміграцыю прадаўжаецца погляд пераважна як на палітычную, без асаблівай дыферэнцыяцыі яе. І таму ў абставінах перабудовы, па-першае, вынікае патрэба кансалідацыйных адносін з усёй беларускай эміграцыяй увогуле. Наш савецкі інтэрнацыяналізм павінен увабраць у сябе і пачуццё адзінства таго ці іншага народа ў свеце. Калі ў нас ёсць інтэрнацыянальнае пачуццё адзінства з рускімі, украінцамі, палякамі, літоўцамі, латышамі, то ганьба тым узурпатарам, якія забралі ў нас пачуццё адзінства нашага народа ва ўсім свеце, так натуральнага для ўсіх народаў свету!... Мы ж, беларусы, асабліва ў пару засілля сталіншчыны і традыцый вульгарызму, да апошняга часу больш адчужалі ад сябе, чым прыбліжалі да сябе беларускую эміграцыю. І то па сутнасці пры народным дараванні грахоў нават той яе частцы, якая сапраўды мела праступак перад Савецкай уладай.

Што я маю на ўвазе, калі гавару аб народным дараванні? Гадоў пятнаццаць таму назад я быў глыбока ўражаны тым, як адна з цётак вёскі майго дзеда — Крывіч, што каля Дзярэчына, паставіла на крывіцкіх могілках помнік свайму сыну, які памёр у Аўстраліі. «Зямля ж — адна»,—гаварыла цётка Мальва, разумеючы, што яе помнік, пастаўлены па сыну ў любым месцы Зямлі, усё адно помнік на Зямлі і над ім, пахаваным далёка, далёка ад роднай вёскі. Сын цёткі Мальвы, які памёр у далёкай Аўстраліі, быў паліцаем: не сам пайшоў, у паліцыю яго ўзялі гвалтам. Але ён ведаў, што дараванне яму не будзе, і таму ўцёк. У боязі сталінскай, берыеўскай расправы ўцякаў не ён адзін: не ад суда многія ўцякалі, — ад расправы. Але тут я задаю сам сабе яшчэ адно пытанне: «А ці не прадаўжаецца тыпалагічна тая ж самая расправа нашага грамадства над нашай эміграцыяй увогуле аж да сённяшняга дня?» Пасля выпадку з цёткай Мальвай я чуў на працягу апошніх дзесяці гадоў не ў адной вёсцы Беларусі пра іншых цётак і дзядзькоў, якія па сваіх сынах і дочках, памерлых на эміграцыі, ставілі помнікі на прывясковых могілках. Бацькі і маці як бы абвяшчалі гэтым сваё дараванне дзецям — хрысціянскае ці ў духу народна-гуманістычным. У гэтым перамагала прыярытэтнае — вышэйшае класавай нянавісці, палітычных разыходжанняў. І мне думаецца, што ад гэтага гуманістычнага, народнага, хрысціянскага дараванння ці не на вялікую дыстанцыю адстала дараванне дзяржаўнае?

Час перабудовы вяртае правы міласэрнасці. Сапраўды, ці ж мы чарсцвей цара Мікалая I, які праз 20 гадоў аб'явіў палітычную амністыю дзекабрыстам, ці чарсцвей цара Аляксандра III, які ў 1884 годзе — у 20-я ўгодкі расправы Мураўёва з Кастусём Каліноўскім — аб'явіў амністыю ўсім паўстанцам 1863 года. Францішак Багушэвіч вяртаўся з Украіны на Беларусь пасля амністыі 1884 года. А колькі гадоў прайшло пасля 1944 года, калі з'явілася беларуская пасляваенная эміграцыя? Сорак пяць! У два разы больш гадоў прайшло для нашай пасляваеннай эміграцыі, а гадзіна міласэрнасці для яе яшчэ так і не прабіла, закон даўнасці, які спаконвеку функцыянуе ў цывілізаваным грамадстве, у нас ніяк у свае правы ўступіць не можа. І мы не толькі не можам марыць аб вяртанні ў Беларусь, напрыклад, Наталлі Арсенневай, — мы нават яе вершаў не друкуем. Прычым, усё гэта — прамое парушэнне ленінскіх традыцый. Першая ў свеце беларуская палітычная эміграцыя з'явілася пасля Кастрычніка і грамадзянскай вайны. Грамадзянская вайна ў нас скончылася ў 1920 годзе, а ўжо ў 1925 годзе, калі яшчэ па ленінскіх законах жыла наша краіна, беларуская палітычная эміграцыя атрымала дзяржаўную амністыю. Па ёй гэта вярнуўся ў БССР, напрыклад, Вацлаў Ластоўскі. Пяць гадоў і — сорак пяць гадоў. Паводле простай арыфметыкі, мы аказваемся ў дзевяць разоў больш неміласэрнымі, чым была наша Савецкая дзяржава, незыначная сталіншчынай і яе дагматычна-класавай ідэалогіяй.

Успомнім яшчэ і платформу «Нашай Нівы» ў яе адносінах да эміграцыі. Увогуле «Наша Ніва» заклікала сваіх чытачоў шукаць шчасця не за морам, а дома, у барацьбе супраць царызму — за сацыяльнае і нацыянальнае разняволенне. Але быў у «Нашай Нівы» і клопат пра гаспадарчае развіццё краю, пра пошук грошай дзеля развіцця нацыянальнай эканомікі, і пры гэтым не выключалася эміграцыя дзеля заробку — з вяртаннем на радзіму, каб заробленыя грошы кваліся ў падмурак народнага дабрабыту. Многія з нашай «лапцевай» эміграцыі і ехалі па далары, каб з імі вярнуцца гаспадарыць на роднай зямлі. Ды, зарабіўшы далары, самі косці свае злажылі на чужыне.

І яшчэ пра адно агульнае і вельмі балючае, з эміграцыяй звязанае. Чалавек, дзе нарадзіўся, там і памерці прагне. Прагне, можа, не так памерці, як пажыць яшчэ, хоць колькі гадкоў, дзянькоў. То, можа, і ў згодзе з гэтым спаконвечным чалавечым законам прыцягнення да радзімы не павінны мы сёння заставацца ў маўклівым бяздум'і, а здымаць з дарог да вяртання ўсе загароды-перагароды — здымаць воляю перабудовы, здымаць сапраўднай вышынёй міласэрнасці, гуманізму.

Радуе ж тое, што пра беларускую эміграцыю сёння ўжо даволі шмат у нас пішацца, асабліва Адамам Мальдзісам, Барысам Сачанкам. Цікавымі былі ў беластоцкай «Ніве» нататкі Алеся Барскага пра беларусаў у Злучаных Штатах Амерыкі, Сакрата Яновіча — пра беларусаў у Канадзе. Час, высокі час ужо для культурнага яднання не толькі беларусаў у СССР ці беларусаў у Польшчы, але і ўсіх беларусаў у свеце. І то час менавіта адраджэнцкай кансалідацыі, якая гістарычна прадаўжаецца, па-новаму сцвярджае сябе на новым гістарычным вітку перабудовы.

ТАК, АДРАДЖЭННЕ прадаўжаецца, беларускае Адраджэнне новага часу — XIX—XX стагоддзяў. Яно было і ёсць, аднойчы пачаўшыся, было і ёсць неперарыўнае, хоць на розных этапах па сіле і маштабах, пафасе і каларыце складвалася ў некалькі адрозныя формы. Можна толькі здзіўляцца творчаму патэнцыялу нашага народа, жывучасці адраджэнцкай стыхіі, неадольнасці яе. То ж крывавая касьба раз-пораз усчыналася, ды як трава з-пад касы, — атава за атавай на ніве нацыянальнага Адраджэння — пакаленні беларускіх пісьменнікаў...

Можа, усё ж пра самую гэтую сваю прыналежнасць да нацыянальнага Адраджэння самі мы і замала дасюль гаварылі — не вельмі тое падкрэслівалі. Можа, каб падкрэслівалі, то ў «Литературной газете» ад 21 лютага гэтага года і не прачыталі б у Сямёна Букчына сцвярджэння пра перарывістасць уплываў нацыянальнай ідэі на сучасныя сацыяльна-дэмакратычныя працэсы, пра іх недамінуючую ролю. Даслоўна С. Букчын сцвярджае: «Але відавочнае і іншае: у Беларусі (можа быць, на моцы гістарычнай традыцыі, веры ў сілу агульнаславянскага кораня, да якога належаць (у тэксце — так: «кораню... належаць...». — А. Л.) беларусы, рускія, украінцы, нацыянальная ідэя не з'яўляецца дамінуючай у цяперашніх сацыяльна-дэмакратычных працэсах. Яна, гэтая ідэя, хутчэй, падключаецца да іх». Гэтым крытык уласна адным махам адмаўляе дзве рэчы: першаснасць нашага нацыянальнага адраджэння ў сённяшніх умовах перабудовы і арганічную падключанасць нашай літаратуры да сацыяльна-палітычных працэсаў у рэспубліцы.

Не станем зважаць на непаважлівую форму адносін, якія выражаюцца дзеясловам «падключаецца» да з'яў, якія не тэлевізар і не халадзільнік, каторых можна ці падключаць, ці выключаць. Паспрабуем дайсці да сутнасці букчынскага сцвярджэння. Не прызнаваць сёння рэальнай сілы перабудовачнага культурнага, літаратурнага, ды і палітычнага Адраджэння ў нашай рэспубліцы — гэта скажаць стан рэчаў. Ці ж можна падумаць, што крытык не бачыў шматлюдных мітынгаў, не чытаў ну хоць бы вершаў апошняга, ды і не апошняга часу Максіма Танка і Пімена Панчанкі, Рыгора Барадуліна і Васіля Зуёнка, з маладзейшых — Алега Мінкіна, Анатоля Сыса, Сержука Сокалава-Воюша, Людмілы Урублеўскай. Нацыянальная ідэя — альфа і амега іх паэзіі, як і ўсіх твораў Уладзіміра Караткевіча. Не можа быць нацыянальнай літаратуры без нацыянальнай ідэі, без нацыянальнай гісторыі, якая належыць літаратуры, без патрыятызму, адкрытага шчыравання да «малой» Радзімы. Сталіншчына, вульгарызм забіраў у нас нацыянальную ідэю. Аб'явіўшы яе нацыяналістычнай, забіраў гісторыю, пачуццё «малой» Радзімы, і як усё гэта абяскровіла нашу паэзію 30-х, пасляваенных гадоў — сёння відавочна. Але як можна адмаўляць саму беларускую літаратуру як носьбіта нацыянальнай, агульнанароднай ідэі, як вядучага чынніка Адраджэння?..

НА УСЕ ГЭТА можна было б зірнуць і як на нешта ўзбочнае, калі б усе крытыкі, асабліва з маладых, згаджаліся з тым, што наша літаратура жыла, жыве. Бо некаторыя ж з маладых нашых крытыкаў, верачы ў будучыню «Тутэйшых», нібы кітайскай сцяной спрабуюць аддзяліць сённяшнюю творчую моладзь ад яе папярэднікаў — больш блізкіх і больш далёкіх. І, такім чынам, на вашых вачах адбываецца супрацьпастаўленне, ідзе культывацыя асобнасці нашчадка ад папярэдніка, узнясенне нашчадка як адзіна сапраўднага адраджэнца, вышэйшага ад папярэднікаў сваёй непрыналежнасцю да часоў культу, хрушчоўшчыны, застою, і нарэшце нават сваёй масткасцю, сваім майстэрствам. Але ці так усё гэта на самой справе?

Сітуацыя склалася парадаксальная: Народ наш застаецца ў палаце свайго Адраджэння— культурнага, палітычнага, гаспадарчага. Зэкон Адраджэння, запарука поспеху Адраджэння — кансалідацыя ўсіх творчых сіл народа, інтэлігенцыі— гуманітарнай і тэхнарнай. А наша творчая маладая інтэлігенцыя, якую ў самыя спрыяльныя, шчаслівыя абставіны паставіла перабудова, як ахмялелая ад паветра палітычнай свабоды, бярэ сабе ў дарадчыкі нігілізм татальнага адмаўлення — безагляднага, бяздумнага, бесперспектыўнага. Бярэ сабе за адзіны ўзор адмаўлення мінулага без асэнсавання яго, адкасваецца ад мінулага, як быццам бы яно было суцэльна зачумленым і не з яго ўлоння выйшла сама перабудова, не ў яго чэраве раслі самі яны, нягрэшныя грахамі мінулага маладзёны-крытыкі і творцы. І няўцям ім, што іх айчынная літаратура і жыла і выжыла, нягледзячы на ўсе ліхалецці і захады, нягледзячы на генацыд і русіфікацыю, на сістэму, якая сістэматычна абвяртала беларускае Адраджэнне ў драму і трагедыю — катавала, смерціла і цела і дух Народа. І нам цяпер трэба пісаць гісторыю шматпакутнасці нашага Адраджэння.

Колькі талентаў звялося,
Колькі іх і дзе ляжыць?!..

Новым трагічным сэнсам напоўніла гісторыя гэтыя словы Якуба Коласа. То быў плач па ахвярах сацыяльнага гора, нацыянальнага беспрасвецця, непісьменства, адлучанасці ад культуры. Цяпер жа коласаўскія словы абуджаюць у нашай памяці воблікі ахвяр ГУЛАГаў, берыяўцаў, брэжнеўцаў. Ды і аб іншым зводзе ідзе ўсведамленне — аб зводзе талентаў, якія нібыта шчасліва жылі, пісалі, але то была пісаніна, зададзеная кан'юнктурай, на карнявішчы дэгуманізацыі, дэмаралізацыі нашай літаратуры вульгарнасцю класавага падыходу. З гісторыі беларускай літаратуры таго не выкінуць, як узнікла цяпер неабходнасць пісаць і гісторыю літаратурных нораваў, што ўсталяваліся ў нас пад годлам адміністрацыйна-камандная сістэмы. Не напішам мы такой гісторыі літаратурных нораваў 20—30-х, даперабудовачных пасляваенных гадоў, далёкім нашчадкам нашым вунь як цяжка будзе даходзіць да разумення таго, што ў гэтыя гады пісалася. Калі ўжо

сённяшнім маладым гэта няўцямна, то — сапраўды — як будзе ўсё тое дэструктыўнае, скасабочанае зразумець іх унукам! Але не думаю, што сённяшнія маладыя так нічога і не ўцямліваюць, як гэта можна падумаць, чытаючы іх публікацыі, што за час і абставіны выпалі іх папярэднікам. Думаецца, што з боку іх мы маем пэўную праднамераную дэманстрацыю, пэўнае знарокавае гіпертрафіраванне праблемы, пэўнае самазацвярджэнне пры татальным адмаўленні мінулага.

Калі прыклады нацыянальна-культурнай салідарызацыі пакінула нам наша шляхта XIX стагоддзя, калі пакінулі нам яе «Наша Ніва», нашанаўцы Янка Купала і Антон Луцкевіч, Якуб Колас і Іван Луцкевіч, Максім Багдановіч і Вацлаў Ластоўскі, Змітрок Бядуля і Максім Гарэцкі, то ці ж мы не спадкаемцы іх традыцый, іх адраджэнцкай дзейнасці, ці ж і нам не прыстала, як ім, яднацца, а не па-дзецюкоўску задзірацца, выпендрывацца, выскалятца, а то і даходзіць проста да бессаромнага танца з грымасамі на магілах, драмах і трагедыях блізкага і няблізкага мінулага.

Шмат у чым менавіта падобным танцам — ці на магілах памерлых, ці на цемені жывых — мне ўяўлясцца артыкул Сяргея Дубаўца «Хто там?» («Крыніца», 1990, № 2). Артыкул гэты—і ўзор беспадстаўнай гларыфікацыі маладых сённяшніх беларускіх пісьменнікаў, і ўзор безапеляцыйнага крытыканства ў адносінах да беларускай літаратуры ўвогуле.

Якімі толькі азначэннямі ні расквечвае аўтар прадстаўнікоў «сям'і адзінай» сучаснай беларускай літаратуры: графаманы, канфармісты, эпігоны, «масавыя». Але яму здаецца, што і таго — мала. І таму— стаўка на алюзіі з... тэрарыстамі, наркаманамі, рокерамі і — нарэшце — з прастытуцыяй!.. О, як дзякуе С. Дубавец нейкаму А. Н. Шапіру, які некалі выдрукаваў артыкул «Прастытуцыя ў БССР і за мяжой!» Дзякуе за тое, што гэты нехта А. Н. Шапіра дапамог яму ўсвядоміць, што ёсць родная літаратура, пра якую ён піша.

І, мушу прызнацца, прыкра мне разбірацца ва ўсім гэтым, з болем раблю гэта, бо ж Сяргей Дубавец — чалавек адольны, дасціпны і дастаткова выкшталцоны.

Разгледзім жа найперш Дубаўцовы тэзісы спляжвання. «Наогул беларускія пісьменнікі, — сцвярджае С. Дубавец,— жывуць досыць ізаляваным літаратурным жыццём...» «Беларускія пісьменнікі маюць мізэрныя наклады...» «Беларускі пісьменнік піша з аглядкай. Ён ад пачатку ўпэўнены, што ён не Бальзак і не Габрыэла Містраль...» «Гэтая літаратура абсалютна стратная...» «А самае галоўнае, што... стратная наўмысна!» «...Ілюзія, імя якой: «сучасная беларуская літаратура». ...А для нас гэта, магчыма, заўтрашні дзень — трэба пракаўтнуць сваю «нацыянальную сутнасць» («Каб стаць касмапалітам...»).

Значыцца, «ілюзія», «стратная наўмысна», ізаляваная, мізэрная. Яе, беларускай літаратуры, акрамя сённяшніх «Тутэйшых», няма. Ілюзія — Адраджэнне беларусаў: грошы марна толькі выдаюцца на іх кнігі. Усё гэта з беларускасцю наўмысна прыдумалі гэтыя Купала і Колас. Пракаўтніце гэтую наўмыснасць і крытык Сяргей Дубавец будзе задаволены. А галоўнае — спакойны за дзяржаўныя грошы, нязя на марна трацяцца на гэтых пісак «з аглядкай» — не Бальзакаў, не Габрыэлей. Выключэнні, праўда, С. Дубавец робіць — У. Караткевічу, В. Быкаву; у станоўчым ракурсе, акрамя маладых, успамінае Міхася Стральцова, Алеся Наўроцкага, у пэўных статыстах у яго аказваюцца Ніл Гілевіч, Іван Чыгрынаў, Вячаслаў Рагойша. Сем імёнаў. Усе іншыя, каго б вы ні прыпомнілі з сучасных беларускіх пісьменнікаў, дык то — ілюзія ці, як вышэй, графаманы, канфармісты, эпігоны, рокеры, тэрарысты ці — па іншай шкале — «абсалютна стратная», «ізаляваныя», «пісакі з аглядкай». Хто ж яны канкрэтна? Максім Танк ці Янка Брыль, Пімен Панчанка, Анатоль Вялюгін, Мікола Аўрамчык, Іван Шамякін, Вячаслаў Адамчык, Анатоль Вярцінскі, Васіль Зуёнак, Данута Бічэль-Загнетава, Раіса Баравікова, Аляксей Карпюк ці Янка Сіпакоў? Гэтае «ці?...» можна было б яшчэ вунь як прадоўжыць, а за ім сапраўды што: ілюзія ці вялікая літаратура? А ці ж Кузьма Чорны, калі і азіраўся на Бальзака і Дастаеўскага, не стаў уласна Кузьмой Чорным, а Іван Мележ — Іванам Мележам, а Іван Пташнікаў — Іванам Пташнікавым?!

Тэзіс аб стратнасці, аб утрыманстве, аб прыкарытнасці, яго ўжо не першы раз абвяшчае С. Дубавец, даказваючы чытабельнасцю «Огонька», што беларускую літаратуру не чытаюць, хоць у «Огоньку» чытаюць публіцыстыку, а не літаратуру, палітызацыяй матэрыялаў бярэ гэты часопіс чытача, а не эстэтычным фактарам. Што беларуская літаратура мёртвая, С. Дубавец спрабуе даказаць мізэрнымі яе сучаснымі тыражамі — як, дарэчы, і С. Букчын. Дык на гэтай падставе наш борздкі крытык мог бы ўжо даўно канстатаваць смерць польскай літаратуры, дзе аналаг нашага «Полымя» часопіс «Твурчасць» мае на 30 мільёнаў нацыянальнага чытача ўдвая меншы тыраж, чым «Полымя», дзе мізэрнейшым тыражом выходзіць часопіс «Паэзія», а паэтычныя зборнікі, як і ў ГДР, часам маюць не больш 500 экземпляраў тыражу.

Дзяржава павінна быць мецэнатам мастацтва і літаратуры. Развіццё еўрапейскага Адраджэння цалкам залежала ад мецэнацтва — каралеўскага, магнацкага, купецкага. Мецэнатамі былі Багдан Онкаў, Якуб Бабіч, Юры Адвернік— для Скарыны, Астрожскую Біблію фінансаваў князь Астрожскі, не без каралеўскага мецэнацтва з'явіліся паэмы Яна Вісліцкага і Міколы Гусоўскага — «Пруская вайна» і «Песня пра зубра». Паўторымся, мецэнацтва — натуральны стан рэчаў у развіцці мастацтва і літаратуры. Беларуская літаратура зараз на выдавецкім самаўтрыманні. Можна палічыць гэта за форму сучаснага мецэнацтва, хоць дзяржава пры гэтым мае свой зыск-даход. Але ў сувязі з гэтым падымаць вэрхал наконт нібыта аглаедства нашай літаратуры, наконт ледзь не яе паразітарнасці, — то ўжо, выбачайце, калі ласка!.. Тым больш, што як паказалі дэбаты аб падатках з пісьменнікаў, літаратурная праца ў нашым грамадстве прадаўжае недаацэньвацца.

АСОБНА ЯШЧЭ — аб стаўленні С. Дубаўца да гісторыі роднай літаратуры. Увогуле можна проста здзіўляцца, наколькі яе ці не ведае ці наўмысна не хоча ведаць С. Дубавец. Ігнаруе яе і ўсё. Абы-што і абы-як чаўпе, сцвярджае, як, напрыклад, у наступным пасажы:

«Яшчэ гадоў 10 таму Саюз пісьменнікаў Беларусі не мог і думкі дапусціць, што ў літаратуру некалі прыйдзе такая шматаблічная і адукаваная змена, якая прыходзіць сёння. Памятаю, як у тагачасным друку маладога паэта хвалілі за тое, што ён добра валодае мовай. Тады, у канцы 70-х, капітаны СП узялі курс на дно (пасля нас хоць патоп!) і, не бачачы, не жадаючы бачыць вартых пераемнікаў, кінуліся актыўна выдаваць уласныя кніжкі, цешачы сябе зямнымі дабротамі. Яны вырашылі, што раз ужо наканавана ім стаць апошняй кропкай у нацыянальнай літаратуры, дык трэба стаць тлустай кропкай»...

Хопіць!.. Прашу дараваць за доўгую цытату, але гэта проста не могучы дараваць развязнасці, праяўленай крытыкам, я не прыкараціў цытаты. Што ж?.. Памяць, вядома, бывае розная: можа і здраджваць, можа выкідваць конікі. У дадзеным жа выпадку я проста не зайздрошчу памяці крытыка. Бо сапраўды, хто ж гэта яму, сённяшняму крытыку, паверыць, што «гадоў 10 таму», калі жывымі былі выдатныя крытыкі Рыгор Бярозкін, Варлен Бечык, Міхась Стральцоў, крытэрыем у нас было ўсяго добрае валоданне мовай, а не высокі эстэтычны ідэал. А наконт тэзісаў «капітаны... узялі курс на дно», наконт апошне-магіканства. Божа! Пачалі сябе самахаваць, самаліквідавацца... з канца 70-х. Хто? Максім Танк, Янка Брыль, Пімен Панчанка, Анатоль Вялюгін, Рыгор Барадулін, Ніл Гілевіч, Генадзь Бураўкін, Анатоль Вярцінскі, Васіль Зуёнак?.. Што ж гэта за насланнё найшло як хмара, на ўсю літаратуру — і на СП, значыць, і на ўсе часопісы беларускія, на АН БССР?..

Не ведаю, чаго больш у такой «Энеідзе навыварат»: арыгінальнічання ці адкрытага здзеку маладзёна, які не баіцца ніякага суднага голасу — мажлівага публічнага высцябання?.. Ва ўсякім выпадку — здзеклівасць, непавага, няўвага — яны тут — у адмаўленні сэнсу жыцця не аднаго пакалення беларускіх літаратараў: сэнсу жыцця і тых, імя каго буйным штрыфтам увойдзе ў літаратуру, і тых, хто будзе ўспамінацца петытам, і тых, хто ўвогуле ўспамінацца не будзе, хоць і былі ўсе яны шчырымі сэрцамі аддадзеныя беларускай літаратуры, якое ліха яе ні перапыняла ў пасляваенныя гады, аддадзеныя беларускай мове, пра яе будучыню дбаючы, у яе верачы, хоць вера ледзь не ўтапічнай ужо станавілася... Людцы добрыя, для каго ж, аднак, усё гэта намі гаворыцца? Для таго, для каго мы — «ілюзія?..» Ды не ілюзія ж — не!.. Можа, каму і сёння хочацца, каб мы раталі, як здань-прывід. Але ж мы — не здані, не прывіды, хоць няўдзячнай памяці прымроіцца можа ўсялякае...

Але калі пра памяць, то давайце ўспомнім. Добра памятаю, як Максім Лужанін даклад на пленуме аб усёй нашай літаратуры другой паловы 60-х гадоў пачаў з аналізу маладых Алеся Разанава і Яўгеніі Янішчыц. Добра памятаю рэцэнзію Рыгора Бярозкіна на кнігу вершаў «Акно» Петруся Макаля 1964 года — «Майстэрства, што з табою рабіць?», і як не толькі Рыгор Бярозкін здзіўляўся шматадукаванасці і паэтычнаму майстэрству нагорты маладых другой паловы 60-х, 70-гадоў. І сёння я, напрыклад, поўны вялікіх надзей на новую хвалю маладой паэзіі 80-х гадоў, такую шматлюдную і такую шматабяцальную, не магу тым не менш ніяк згадзіцца, што гэтая новая хваля вышэй дэбютантаў другой паловы 60-х, 70-х гадоў — таго ж Алеся Разанава, Яўгеніі Янішчыц, Юркі Голуба, Мар'яна Дуксы ці крыху і старэйшых ад іх Рыгора Семашкевіча, Міколы Маляўкі, Казіміра Камейшы. На жаль, на жаль...

Жаль жа мой асабліва з таго, што не канкрэтна параўноўваюць сённяшнія крытыкі сённяшнюю паэзію з паэзіяй іх маладых папярэднікаў учарашняга дня. Няма аналізу,ёсць апрыёрнасць, амбіцыя — не лепшыя памагатыя паспяховаму прадаўжэнню традыцый, якога трэба прагнуць. Толькі эстэтычны аналіз можа паказаць, хто лепш піша, — паказаць і паспрыяць далейшаму агульнаму ўвышэнню Беларускага Адраджэння.

Крытыка сёння нам патрэбна, эстэтычная крытыка! Гэта бяда, што зараз яна ў нас стала палітызаванай, што мы страцілі на час крытыку прафесіянальна-эстэтычную, якой была крытыка Рыгора Бярозкіна, Варлена Бечыка, што ў нас сёння больш авантурыстычна-палітызаванай пісаніны, чым уласна літаратурных рэцэнзій, артыкулаў, якімі нас цешылі Уладзімір Калеснік, Мікола Арочка, Анатоль Клышка, Вячаслаў Рагойша, ды і так званая пісьменніцкая крытыка І. Мележа, Я. Брыля, А. Вярцінскага, В. Віткі і іншых. Мы мелі ў гэтай сферы ўжо шмат, а трэба займець яшчэ больш. Адраджэнне патрабуе кансалідацыі. Кансалідаваць у моцы толькі яго вялікасць ідэал. Успомнім жа тут А. С. Пушкіна з яго сцвярджэннем: «Мэта мастака ёсць ідэал...», успомнім Ф. М. Дастаеўскага, які пісаў: «Тады толькі адчуваецца пачуццё, калі судакранаешся з красой вышэйшай, з красой ідэалу». Успомнім і Аляксандра Даўжэнку, які лічыў прыгажосць — «персанажам гісторыі», які заклікаў «Да боскага ў сабе. Да прыгожага. Да бессмяротнага». Не ўзяўшы гэтых імператываў у сэрцы свае, мы не ўздымемся па-над канфрантацыяй, мы станем магільшчыкамі нашага нацыянальнага Адраджэння, і ні Народ, ні Гісторыя нам таго не даруюць!..

Лаўрэаты літаратурных прэмій



Адбылося пасяджэнне Рады Саюза пісьменнікаў БССР, на якім разгледжана пытанне аб прысуджэнні штогадовых прэмій творчага саюза.

Літаратурную прэмію імя Аркадзя Куляшова атрымаў за кнігу паэзіі «Заснежаныя ягады», выпушчаную выдавецтвам «Мастацкая літаратура», Мар'ян ДУКСА. Кніга прозы Уладзіслава РУБАНАВА «Таямніца птушынага гнязда», што пабачыла свет у выдавецтве «Юнацтва», адзначана Літаратурнай прэміяй імя Івана Мележа.

ЧЫТАЧ ДЗЕЛІЦЦА ЎРАЖАННЯМІ

«ДЗЕ ГРЫМОТНАЯ СЛАВА ДЗЯДОЎ?»

Хвалюючыя мінуты перажылі мы, калі ў госці да нас у Капыль прыехаў Леанід Дайнека—сустрэцца з настаўнікамі роднай мовы і літаратуры раёна, з вучнямі СШ № 1, прыняць удзел у канферэнцыі па гістарычных раманах «Меч князя Вячкі» і «След ваўкалака».

Творы гэтыя вельмі захапілі мяне і маіх вучняў, чыталіся і перачытваліся, і кожны раз мы адкрывалі для сябе новае і цікавае. Раманы чытаюцца на адным дыханні, хоць і даводзіцца часам звяртацца да даведачнай літаратуры.

Творы Л. Дайнекі прымушаюць задумацца, чаму мы, нашчадкі Ефрасінні Полацкай і Рагнеды, Усевалада і Вячкі, так адракаліся ад сваіх святынь і мянялі свае перакананні ў залежнасці ад надвор'я ў Еўропе.

З гістарычных раманаў Л. Дайнекі паўстае наша старажытная гісторыя, аўтар знаёміць нас з простым людам, працавітым, чулым, адданым роднай зямлі, веры.

Смутак і вялікае гора простага люду з пранікнёнай глыбінёй паказаны ў сцэнах нападу крыжакаў і полаўцаў. Знішчэнне, смерць і рабства, якое страшнейшае за смерць, гвалтаванне і расправы над безабароннымі жанчынамі, дзецьмі. Прыгадваецца Гарэлая Весь, налёт полаўцаў і іншыя эпізоды, прыгадваюцца цемрашалы і злачынцы біскуп Альберт, храніст Генрых, ваявода Касячка. Надоўга засталіся ў нашай памяці Клімята і Халадок, старэйшына лэтаў, Варыдот і Якаў Палачанін, смелы вой Раман і іншыя героі. Гіне за сваю веру Белакрас, прымаючы лютую смерць, хоць цаною здрады мог выкупіць жыццё.

Мы захапляемся высакароднасцю, адданасцю народу, зямлі роднай, іх нянавісцю да заваёўнікаў князя Вячкі і Усяслава Полацкага. Ім, князям-ізгоям, ворагі прапануюць жыццё, уладу, князю Вячку— вярнуць дачку, але дарагой платы патрабуюць: здрады. Л. Дайнека стварыў цудоўны вобраз мужнага барацьбіта. Князь Вячка ганарыцца сваёй прыналежнасцю да славутага княскага роду Рагвалодавічаў і да апошняга дыхання застаецца верны свайму роду.

Аўтар раманаў паказвае выпрабаванні, якія выпалі на долю нашага народа ў тыя далёкія гады, калі ішла жорсткая барацьба з полаўцамі і крыжакамі за незалежнасць сваіх земляў. Ды ці толькі сваіх? Каму толькі ні працягвалі руку дапамогі, каго толькі ні абаранялі! Так, князь Усяслаў Полацкі разам са сваімі сынамі пазбаўляе Кіеў палавецкага рабства, бо Ізяслаў, кіеўскі князь, у час небяспекі збег, пакінуўшы горад і народ на гвалт і здзекі стэпавікоў. Усяслаў, якога народ абвясціў вялікім князем Кіеўскім, не толькі храбры вой, але і вялікі палітык і патрыёт. Ён разумее, што зноў пацячэ кроў, пакоцяцца галовы. І хоць ён заўсёды шукаў сечы, тут уступаць у бой адмаўляецца. Ён разумее, што ў сечы яны паб'юць адзін аднаго, а па іх касцях у Кіеў увойдзе са сваёй ардою Шарукан. Як разумны чалавек Усяслаў сваю славу і свой лёс уручае сваім воям-палачанам: праліваць кроў або вярнуцца на зямлю полацкую, дадому і заняцца сваімі справамі?

Творы Л. Дайнекі дапамагаюць нам, чытачам, пранікнуцца пачуццём чалавечай годнасці, усвядоміць, што і мы маем сваю гісторыю, што і ў нас былі вялікія князі, замкі, дзяржаўная мова. Мы шчыра ўдзячны аўтару за добрыя творы, за асабісты ўдзел у канферэнцыі, за цікавае выступленне.

К. СІДЗЕЛЬНІКАВА.
настаўніца.

«ІСЛАЧ-90»

Менавіта так завецца вершаваная кніжка, выдадзеная ў дадатку да часопіса «Советский воин». А складзены зборнік з твораў армейскіх і флоцкіх паэтаў, якія летась збіраліся на чарговы — восьмы па ліку — семінар літаратараў арміі і флоту. Праходзіла мерапрыемства на гасцінай беларускай зямлі, у вядомым пісьменніцкім Доме творчасці.

Сярод аўтараў кнігі—і афіцэры, што прайшлі цераз афганскае пекла. Гэта Рыгор Белкін, Міхаіл Міхайлаў, Валерый Осіпаў.

Дакрануліся армейскія паэты таксама да беларускай тэмы. У зборніку—вершы Уладзіміра Тыцкіх і Юрыя Кірылава пра Хатынь.

На жаль, не было сярод удзельнікаў семінара і аўтараў зборніка нашых землякоў— вайсковых паэтаў. А яны ёсць, старанна працуюць над словам, пішуць па-руску і па-беларуску. Як прыклад—творчыя пошукі Вячаслава Казакова і Кастуся Ільюшчыца.

А. КАРЛЮКЕВІЧ.

Яўгенія ПФЛЯУМБАУМ

ЛІСТ З ВЕЧНАЙ КРОНЫ

Спакой працягвае руку

У лістападавай раскошы,
Між дрэў аголеных бадай,
Дзень пачынаецца харошы
За ўсё, што лёс мне падкідаў.

Вазёрным зыбівам на хвалі
Прамень з-пад хмарнага брыля
Паплыў у золата аддаляў
І згас на тонях спакваля.

Тады, скідаючы сваволю
Закучараўленых аблок,
Зайграла сонца паміж голля,
Ацепліўшы твой родны зрок.

Мне страшна, радасна, маркотна,
А сэрца, ўдзячнае красе,
Як самалёт з мяжы узлётнай,
Гудзе і ціхне пакрысе.

Цішэе страх, мякчэе смутак,
Спакой працягвае руку,—
Мы адыходзімся ад скруты,
Плывем ад берага пакут.

У лістападаўскай раскошы,
Пад шум кляновага лісця,
Я чую блізкую парошу
Твайго жыцця, майго жыцця.

І мара наша апантаная...

Дзе ты, айчына недасяжнасці?
Глыток вады з твае ракі!
Адмераць шчасце можаш сажнямі,
А як дастацца напрасткі?!

Калі душа агнём захмеліцца,
Твая вяршыня паўстае,
Дзе ў распрамененай аселіцы
Журлівы птах вясну пяе.

Яму вядома ўсё нязнанае,
Што ў даўняй нерушы жыве,
І мара наша апантаная,
Што на карабліку плыве,—

Куды, пашто?—нікім не ўгадана,
А сэрца, вось яно, трымціць,
Хоць долю нейчую бязладную
Яно ўзялося б асвятліць?!

Зарок

Калі на самоце адзіным ратункам
Мне будзе здавацца радок,
Калі я ва ўсіх сваіх цяжкіх стасунках
Нырасць буду ў слоўны паток, —

У што ператворыцца радасць натхнення,
Чым стане няўтомны мой верш?
Баяцца пачну я яго нараджэння,
Як поўні жахаецца звер,

І слова, што зрошчана будзе з пакутай,
Зрачэцца, напэўна, мяне,
Шануй жа ты верш свой
ад горкай атруты,
Каб радасцю мог ён звінець.

Мой лёс...

Мой лёс узрос
Не з цёплых рос,—
Ён долі матчынай аскепак:
На золку, прагнучы нябёс,
Узгадаваны між свірэпы.

Злічыўшы ўсе мае гады,
Дзянькі, магчыма, падбіваеш,
Мой лёс! Яшчэ ты малады,
Калі пра літасць забываеш.

Раніца

Самота, мілая, сыходзь
З пагорка весняе раскошы,—
Я выбіраюся ў паход,
Дзе ўсё жыве, дзе луг не скошан,

На беразе лясных азёр,
У ноч ласкавае спагады,—
Там у мігценні чыстых зор
Душа ізноў зазнае радасць.

Я гэтых зор не сцерушу
Ні смуткам кволым, ні гаркотай,
І больш радка не напішу
Ад промняў сонечных употай.

Яму зірну я проста ў твар,
Найменшай хмаркай не замглёны,
І ў гэты радасны пажар
Укіну ўсіх часоў прыгоны.

Не аглядаючы шляхоў,
Таптаных з болем ці з усмешкай,
Іду ў вясновы свой паход
Той самай, мілай сэрцу сцежкай.

На ёй і песні адгалос,
І ягад першых смак гаркавы,
І мой жаночы дзіўны лёс
З любоўю злою, неласкавай.

На час, на доўгі час сыду
З-пад беззаганнае апекі
Сваіх самотных мар і дум,
З-пад іх затулы і бяспекі.

З людзьмі мне трэба гаварыць,
Свет спасцігаючы паволі,
І безудзельнасць, і парыў,
І смагу шчасця, і патолю.

Пад прыцэлам...

Як ліст з вечнай кроны
Бяссмертнага дрэва,
Яшчэ адзін дзень мой
На дол абляцеў.

І змрок абазваўся знаёмым распевам,
Той песні, што робіцца ўсё карацей.

Смяротны, адзін, на вачах у бяссмерця,
Ідзе пад прыцэлам падлічаных дзён,
І кожнага трэба надзеяй падперці
І хоць бы найменшы
з іх выспеліць плён.

Паэзія

Ці ты намерыўся пісаць
Самотнай ноччу на прадвесні,
Ці сэрца ўразіла краса
Раптоўна прагучаўшай песні,

Ці смутак на далоні ўпаў,
Нячутна, быццам пух з таполі,—
Ў сваёй душы ты, як сляпак
У неабсяжным чыстым полі.

Ідзеш на хвалю цеплыні,
На водары паўдзённых ветраў,
На пырскі свежыя крыніц,
І раптам ты чамусьці ў нетрах,

Навучы мяне радасці, птушка малая,
Зіхатлівы праменьчык за шэрым акном,
Што глядзіць безудзельна,
як я паміраю
Па няўмольным законе жыцця і кіно.

Навучы мяне радасці крокаў апошніх.
Пуцявіны лясной, што бяжыць да ракі,
Каб пацеплела ў сэрцы
без крыўднае ношкі,
Калі лёсу насустрач пайду нацянькі.

Мара

Звужваюцца чамусьці дні,
Нібы сыходзяць у завулкі,
Дзе рана гасяцца агні
І трызніцца ў нямоце гулкай...

Ні клясці, ні благаслаўляць,
Ні адпачыць, ні спрацавацца,
Хіба цвітучага галля
Яшчэ аднойчы дачакацца.

Здалёк, знянацку, як з гары,
Нясыты зрок аддаць красе той,
І ўраз аслепшы—пад абрыў,
Дзе ціха плешчуць хвалі Леты.

Вечар

Чым далей—болей адыходжу
Ад ганку свойскага жытла,
Цяплеюць дум нязводных пожні,
Як быццам хмара абышла.

Глыток цішынь, глыток спагады,
Яшчэ тваіх турбот глыток,—
І ўсё: ні крыўды, ані здрады—
Сутоння светлага паток.

Ліст арабінавы

Ходзіш, як прывід па хаце-пустэльні—
Дзень-авадзень, а здабыча адна.
Сэрцавы межы, яны непадзельны
І непадступны, як бездань, без дна.

Недзе на досвітку боль я прыспала,
Улада прыгадак прагнала тугу,
Нібы ізноў я жыццю даравала
Тое, аб чым расказаць не магу.

Сонца здаля азірнулася ўважна
І спакваля пачало ацяпляць

У пушчы жалю ды тугі,
Нібыта ўжо да рэшты знанай,
Аж зноў яе па берагі
Ва ўсе ставы паналівана.

Не кроч бяздумна за радком
З яго хвалюючым сугуччам,
Будуй трывалы моцны дом
Для думкі смелай і бліскучай.

А ўжо тады насаджвай сад
І краскі пышна разгадоўвай,
Хай ліпы носяць ад прысад
У наваколле пах мядовы.

Хай зоры шастаюць з нябёс
У куст шыпшыны ружаватай,
І ў небе іх сліпучы Воз
Няхай гарыць сабе над хатай.

Усё тады стрывае верш
На стрыжні спелай вострай мыслі.
І спраўдзіць лепшы твой намер,
Які ты вынасіў ці выспіў.

Жанчына

Яшчэ не забыта, яшчэ не пазбыта,
Што нашай душою ў стагоддзях набыта,
З пуцін назбірана і шчасцем названа,
Стакроць ашуканаю кветкай Івана.

У смутках гарачых, на хвалі азёрнай,
Ці знае душа, да чаго яе горне?
І прагне, і смагне, і ятрацца раны
Ад дзён незагойных,
ад злыдняў зазнаных...

Душа—то жанчына,
Як скрыпка, як песня,
Як наша жалейка на ростанях весніх.
І як бы ні бэсціла звяга-развага,
Душа, што вякі заставалася нагай.
Жывая! Жыве! І азглеўшы увосень,
Зімой, адубеўшы ў завеях, навослеп,
Ідзе напрасткі на цяпло, на усмешку
З свайго
расхістанага ветрам падстрэшка.

Навучы мяне радасці, птушка малая...

Навучы мяне радасці, птушка малая,
У нямотным абсягу астатняй зімы,
Хіба толькі адна я спагады не знаю,
Хіба мой толькі бераг паводкаю змыт?

Навучы мяне радасці, птушка малая,
Я ўсачыла даўно ўжо праменьчык жывы
Пад высокім акном,
дзе ты заўжды спяваеш
У павейным шасценні хваін баравых.

І табе абзываецца ўсё наваколле
Звонам наледзі срэбнай на лапах ялін,
Як завея ускрутная сыпле сваволяй
Ад высокага неба да ніцай зямлі.

Кандрату Крапіве

Мяне наведвае натхненне,
Я адступаюся на крок,
Каб даць шчасліваму імгненню
Глядзець мне ў твар крыху здалёк.

Паўзбежны позірк, а з усмешкай,
Ківае лёгка галавой:
«Чаму маўчыш пад нізкай стрэшкай,—
Шукай вышынь і руш у строй!»

●

Не зусім яшчэ адраклася
Ад таго, чым жылося дасюль, —
Не пазналіся мы на Парнасе—
Там стаяў непахісны патруль.

Ён казаў нам нібы са знявагай—
Сёння ў нас непрацоўны дзень!
Не настоена песні брага,
Не ўзышоў і гурок на градзе.

Ды з якой апраметнае сілы
Цягне ўсіх вас сюды талакой,
Ці ж утулле хацін вам не міла
І зялёны нізінны спакой?

Неадольная дольная прага—
Азірнуцца з гары на нізок,—
Як там людзі гадуюць адвагу,
Як плывуць цераз грозны паток,

А даплыўшы, змываючы з твараў
Вечнай скрухі буйныя сляды,
Ты пачуеш: «Заходзьце, таварыш,
Мы даўно ўжо вас клічам сюды».

Летні ранак

За вокнамі неба люструецца ў моры,
Як зона бяспекі, якое няма,
І ўсё ж ты паедзеш, хаваючы хворасць,
Бо прагі твае—морам плыць—
не стрымаць.

З гэтай прагай
жыццё прачынаецца рана,
І раскоша відна ахінае твой час,
Недзе блізка ідзе, падыходзіць каханы,
Абмінаючы нават высокі Парнас.

Ціха стукае сініца...

Я даўно не быў у вас,—
Шкода дзён тых незваротных.
Вераснёвы гэты час
І прывабны, і сумотны.

У шырокае акно
Ціха стукае сініца,
Ей адсюль усё відно,
Нават крошкі на стальніцы.

Я даўно не быў у вас,
Нешта страцілі абое —
Вераснёвы гэты час
Стаўся ростані парою...

Ліст арабінавы, той, неразважны,
Што памыкаўся ўсю грону абняць,
Ліст арабінавы, хвойку малую,
Нашу ялінку, што стала крыяць...

. . . . . .

Не, мусіць, не, дараваць не магу я
Тое, чым знішчана доля мая.

Любоў

Яна пастукалася ноччу..
— Хто там?—спытала я са страхам.
—Твая любоў па свеце крочыць,
Сагрэй яе пад цёплым дахам.

—Дзвярэй табе не адчыню я,
Баюся, спаліш мяне зрокам...
Я тут яшчэ перазімую,
А там сыду, ужо далёка...

Прыйшла ты, дзякуй, але позна,
Занадта позна, хоць сагрэла,
Праз дзверы і праз дзень марозны, —
Нібыта я памаладзела.

Ці плакаць мне ці пасмяяцца,
Ці паміраю я ці сню,
Але цяпер пара прызнацца,
Што ты прыйшла упершыню.

●

Жыццё, як шаша за сінечаю лесу,
Надмерная далеч да ўцешынай мяжы,
Імгненне між сённім
і заўтрашнім стрэсам,
Якое ты з годнасцю мусіш пражыць.

І дрэвы твае у лістах адцвітання,
І вецер зрывае часцей галаву,
Але падымае цябе на світанні
Той боль, што чамусьці любоўю завуць.

Гэта радзіма мая

Сонца купаецца ў Свіслачы—
Гэта Радзіма мая,
Марачы з ёю і мыслячы,
Я шчаслівею ўдвая.

Недзе аступішся прыцемкам,
І набяжыць халадок,
Гэта жыццё маё, жыццейка,
Зноў мяне б'е назнарок.

Крыўда? А дзе яна змесціцца,
Калі пачаць падлічаць?
Сонца хінецца да месяца,
Дрэвы дрымотна маўчаць.

Купалавы сунічкі

— У лес паедзем, Жэнечка з Марыляй,
Там знойдзем кожнаму хоць па сунічцы,
Іх мала, снег ужо на крыллі,
А восені заложна спіцца.

І прыгадалі мы, той час,
Той адвячорак шáры,
Калі прамень астатні згас,
А мы, мы ўсё ж знайшлі для Вас
Буйных сунічак пару.

Іх водар Вас развесяліў
І лес прыслаў вітанне:
Не абы-хто зямлю ўмаліў
Аддаць на развітанне—
Купалава благанне.

Сунічкі ў снезе. Гэты дар
Малы, але сардэчны,
І мы смяяліся у твар
Таму, хто нас аспрэчваў.

Суняўшы нашу весялосць,
Паэт сказаў зычліва:
«Увесну тут я першы госць,
А зараз я шчаслівы».

Сястра

Часіна выткала спачын,
Вясна параскідала краскі,
Не звінаваціўся нічым
І дзень мой перад абавязкам.

У дзверы звоняць. Гэта ты,
Як заўжды прыцемкам, у стоме,
Але куточак твой пусты,
Ты спачыла у іншым доме.

Ні веры даць, ні рук аддаць,
Што не ўтрымалі за парогам...
І нават горкае дзіця
Цябе не адмаліла ў бога.

Брату

Калі б за горкаю зялёнай
Яшчэ стаяў дамочак той,
Дзе зазіралі ў вокны клёны
І ледзь шамрэлі сціхатой,

Куды ад лёсу, як ад цёсу,
Ты мог прыбегчы пад крыло,
Дзе пасміхаліся нябёсы
І ахалоджвалі чало

Дажджынай цёплай і духмянай,—
Яна расіла матчын дом,
А ты прыбег з-за акіяна,
І ў шчасці піў яе нагбом.
Калі б...

Літасць

Мы з табою не страчаліся,
Літасць — родная сястра,
Ні тады, як заручаліся,
Ні як ехалі з двара.

Ты сышла у прочкі дальнія,
Не сказаўшы мне «Бывай»,
Зоры, зоры надсвітальныя,
Ці вы бачыце той край?

Мы прагнем долі...

А шчасце йшло сваёй дарогай,
Не блытаючы адрасоў,
А іх было не так і многа
Сярод паселішч і лясоў.

Я воддалек за ім сачыла
І так баялася дыхнуць,
Каб толькі шчасце не забыла
І ў мой дамочак зазірнуць.

Адразу ж засінее неба,
Калі ты спраўдзіш заклік мой,
Падкінеш мне кавалак срэбра
З так званай «шчыраю душой».

Мы ўсе, як дзеці, прагнем долі
І не спыняемся на тым,
Што, можа быць, яе даволі
На гэтым беразе крутым.—

І я ізноў сачу за шчасцем,
Куды яно кіруе крок...
Вось толькі сонца яму засціць,
І ўжо яно хінецца ўбок...

Што нашы душы бунтавалі...

Бадлер, Верлен—чужыя краскі
На кветніку юначых год,—
Мы з перакладчыцкае ласкі
Іх пазнавалі без турбот.

Яны краналі, як каралі
Ці як аддалі у агнях,
Што нашы душы бунтавалі,
Крыху наяве, больш у снах.

Але ўжо век будзіў другую,
Неверагодную красу,
Што з мовы роднае віруе,
Алмазам робячы расу.

Што з вуснаў матчыных гучала
Нам песняў песня,
Так яна
Усю істоту пранізала,
І кожны ў ёй сябе пазнаў.

Да 90-годдзя з дня нараджэння Кузьмы ЧОРНАГА

НЕСПАТОЛЕНАЯ ПРАГА ПРАЎДЫ

ЛЕС паставіўся бязлітасна да Кузьмы Чорнага — ён адмерыў яму толькі сорак чатыры гады жыцця. І напоўненае бязмежнай любоўю і дабрынёй, збалелае ад людскіх пакутаў сэрца гэтага вялікага чалавека і грамадзяніна спынілася якраз тады, калі найцяжэйшыя выпрабаванні, што выпалі на долю краіны і на яго асабістую долю, пакрысе адыходзілі ў нябыт: родны край быў вызвалены ад фашысцкай пошасці, вайна ішла да свайго заканчэння і нарэшце з'явілася надзея заняцца тым, чаго так прагла бясконца доўгімі гадамі яго трапяткая душа — выказаць у мастацкім слове вялікую, усеабдымную праўду пра чалавека-працаўніка, пра Бацькаўшчыну — праўду, глыбіня якой адкрылася перад ім толькі цяпер, калі ён перажыў трагічныя 30-я гады, на ўласныя вочы ўбачыў пачварнае аблічча фашызму, адчуў, якія невымерныя пакуты давялося зведаць чалавеку на вайне і якім дарагім коштам была аплачана перамога.

Пэўна, не раз і не два ў тыя цяжкія, суровыя дні прыгадваліся яму словы Зосі Тварыцкай з «Трэцяга пакалення», якая пераконвала малую дачушку Славу, што «вайны не будзе, і ніхто ніколі нас з хаты не выганіць. Нам будзе добра жыць». Настойліва і рашуча абвяргала Зося і свайго, як ёй здавалася, цёмнага, палітычна несвядомага мужа, закаранелага ўласніка Міхала, што сцвярджаў: «А гэта малое перад чым, ты думаеш, стаіць? Хіба спакойна на свеце? Хто гэта не ведае, што скора зноў войны пачнуцца. І не такія войны, як былі... Ты думаеш, вайны не будзе? Яшчэ, можа, прыйдзецца дзіцяці голаму і босаму па дарогах бадзяцца, без бацькі і маткі паміраць з голаду».

Якім горкім папрокам сабе і таварышам па творчай працы гучалі ў трагічныя дні 1941 года вось гэтыя ўяўна бадзёрыя сцвярджэнні гераіні! Якой наіўнай аказалася яе вера ў светлае, бясхмарнае заўтра. Тым болей, што гучныя словы прамаўляліся Тварыцкай, калі ўжо не адзін год у краіне ішла сапраўдная вайна ўлады на чале з мудрым правадыром і яго палітычнымі аднадумцамі супраць свайго ж народа, супраць працоўнага сялянства, якое логікай гісторыі заклікана было стаць усім, а ў сапраўднасці стала нічым. Гэтая жахлівая акцыя, скіраваная на разбурэнне сацыяльна-эканамічнага ўкладу працоўнай вёскі і расслаяньванне сялянства, дапаўнялася масавымі рэпрэсіямі сярод інтэлігенцыі. У ліку «ворагаў народа» аказаўся і Кузьма Чорны. Вось яго ўласныя прызнанні, занатаваныя ў дзённіку за 1944 год: «У яжоўскай турме ў Мінску ўвосень 1938 г. мяне саджалі на кол, білі вялікім жалезным ключом па галаве і палівалі збітае месца халоднай вадой, паднімалі і кідалі на рэйкі, білі паленам па голым жываце, устаўлялі ў вушы папяровыя трубы і раўлі ў іх на ўсё горла, уганялі ў камеру з пацукамі...»

На жаль, пісьменнік-гуманіст быў пазбаўлены магчымасці адкрыта выказаць свой праклён айчынным магільшчыкам нацыі і ў 1941-м, і ў наступныя гады. Ён мог толькі марыць пра непазбежнасць суднага дня, пра немінучасць калі не зямнога, дык боскага пакарання злачынцаў.

А каб гэты дзень наблізіўся, Кузьма Чорны якраз і павінен быў здзейсніць свае творчыя задумы, напісаць шэраг новых раманаў і аповесцей аб духоўнай велічы беларускага народа, беларускай нацыі. Як сведчаць дзённікавыя запісы 1944 года, У ГЭТЫ ЧАС АДБЫЎСЯ ЗНАЧНЫ ЗРУХ У СВЕТАПОГЛЯДЗЕ ПІСЬМЕННІКА. І творы перыяду вайны яскрава пацвярджаюць сказанае: ЁН ПРЫЙШОЎ ДА ВЫРАЗНАГА УСВЕДАМЛЕННЯ ТАГО, ШТО ПРА СУЧАСНАГА ЯМУ СЕЛЯНІНА УЖО НЕЛЬГА ПІСАЦЬ, ЯК ДАГЭТУЛЬ ПІСАЛА САВЕЦКАЯ ЛІТАРАТУРА. ПАТРЭБЕН БЫЎ ПРЫНЦЫПОВА НОВЫ ПАДЫХОД. У АДПАВЕДНАСЦІ З ЯКІМ ЗЕМЛЯРОБ — ГЭТА САПРАЎДНЫ ГАСПАДАР ЖЫЦЦЯ І ТВОРЦА ГІСТОРЫІ. Кірунак разважанняў Кузьмы Чорнага яскрава перадае яшчэ адзін запіс у дзённіку наконт тых рускіх пісьменнікаў, якія «не маюць глебы ў народзе, таму... не ведаюць пра што пісаць, шукаюць тэм і сюжэтаў, гавораць аб нейкіх «літаратурных знаходках» і сядзяць макам на здрабнеласці рускай савецкай літаратуры...»

Сваю канцэпцыю народа пісьменнік фармуляваў вельмі канкрэтна: «Для іх калгаснік — гэта той самы мужык, які толькі згаліў бараду, а не чалавек, дзе, хто мае вочы, убачыць і знойдзе і Эжэні Грандэ, і Івана Карамазава, і Андрэя Балконскага, і таго, хто не стаў яшчэ літаратурным персанажам, але ўжо стаў героем Савецкага Саюза. У вялікай літаратуры персанажы маюць сваю біяграфію. А каб пісаць біяграфіі людзей, трэба ведаць, што народ — гэта мільёны індывідуальнасцяў, кожны са сваім індывідуальным абліччам і лёсам, хоць і падначаленымі аднаму закону жыцця — нацыянальнаму і дзяржаўнаму».

Фактычна тут накрэслівалася цэласная ідэйна-эстэтычная праграма развіцця беларускай літаратуры, вызначаўся кірунак яе адраджэння на родных каранях, нацыянальнай глебе. Новы погляд Кузьмы Чорнага складваўся ў працэсе асэнсавання гістарычнага вопыту, здабытага працоўнымі ў часе вайны і ў цяжкія дні акупацыі, якая стала «для беларускага народа не толькі парою пакуты, але і парою ўзвышэння, гартавання і гістарычнага ўзняцця народа як нацыі і ўзмацнення яго нацыянальнай самасвядомасці. Народ пакінуў быць пастухом і стаў генералам». Вось гэтая ідэйна-філасофская канцэпцыя і павінна была легчы ў аснову тых эпічных твораў, над якімі Кузьма Чорны збіраўся працаваць па звароце на радзіму. Але спярша трэба было даць грамадскае жыццё таму, што ўжо ўвасобілася ў мастацкім слове. «Пісаць буду, — занатоўвае ён у дзённіку 21 жніўня 1944 года, — ужо здаўшы ў друк «Вялікі дзень», «Пошукі будучыні», «Скіп'ёўскі лес», «Смага», кнігу аповесцей «Сумліцкая хроніка», «Млечны Шлях», «Лявончыкава Ліда і Якубаўскі карчмар Сымон Біруля». Раман «Сыны Хведара Нявады» і драма».

Аднак вартыя здзіўлення, маштабныя творчыя планы, надзеі-спадзяванні пісьменніка, які адчуваў у сабе сілы сказаць пра «самае важнае» для беларускай літаратуры і, паводле ўласнага прызнання, быў здольны «сапраўды павярнуць горы», — засталіся няздзейсненымі: апошнія дні халоднага лістапада 1944 года сталі днямі жалобы для беларускага народа, які аплакваў яшчэ адну незваротную страту — дачасную смерць свайго выдатнага пісьменніка, што так багата зрабіў у абуджэнні і выхаванні нацыянальнай свядомасці беларуса, у развіцці яго культуры. І сапраўды, цяжка ўявіць, як гэты чалавек, які не вызначаўся магутным здароўем і ніколі не меў элементарных бытавых умоў для творчай працы, паспеў напісаць гэтулькі выдатных твораў. За два дні да смерці ён запісвае ў дзённіку: «Бадай што ўжо месяц, як у «кватэры», дадзенай Саўнаркомам. Але ж якраз як тая камера ў турме, дзе я сядзеў у 1938 годзе. Можна сказаць, што я ўжо дайшоў да апошняй мяжы. Бруд, цемень — вокны глядзяць у чорны трохкутнік з высозных муроў. Пісаць няма як і жыць няма як...»

...Пасля з'яўлення ў друку артыкула «Ці быў Міхал Тварыцкі ворагам народа?» («ЛіМ», 27 студзеня 1989 г.) даводзілася не раз чуць здзіўленыя і нават сярдзітыя, а мо і пакрыўджаныя галасы: дык што, ужо і Кузьма Чорны — не класік беларускай літаратуры?! Як жа глыбока дэфармавалі нашу свядомасць культаўснія дзесяцігоддзі і часы брэжнеўскага застою, калі звыклыя ўяўленні мінулага даражэй за праўду і ісціну! Ды хіба хто з пісьменнікаў, у тым ліку і Кузьма Чорны, меў магчымасць у 30-я гады пісаць творы, свабодна выяўляючы свае гуманістычныя ідэалы, адкрыта абараняць чалавека ад таталітарнай улады? Яго ўласнае горкае прызнанне — «Доўгія годы мяне мучыла ГПУ—НКВД» — шмат аб чым гаворыць, не пакідае месца спробам навесці глянец на адзін з самых змрочных перыядаў нашай гісторыі. І сёння, ушаноўваючы памяць выдатнага мастака-патрыёта, трэба не закрываць вочы на слабыя бакі напісаных ім у 30-я гады твораў, тым болей, не аб'яўляць іх вышэйшым дасягненнем нацыянальнай літаратуры, а імкнуцца да поўнай, гранічнай аб'ектыўнасці. Не Кузьма Чорны выступае аб'ектам крытычнага аналізу, а эпоха таталітарнай улады, якая аблізручвала сумленных творцаў, падразала ім крылы, гвалтоўна навязвала лжывыя, антыгуманныя ідэалы. Непрадузятая размова пра «Лявона Бушмара», «Трэцяе пакаленне», пра «Насцечку» не нясе ў сабе ідэю прыніжэння пісьменніка ці недаацэнку яго месца ў гісторыі літаратуры. Наадварот, яна толькі садзейнічае аднаўленню ісціны, рэабілітуе праўду. Творчая дзейнасць Кузьмы Чорнага перыяду Айчыннай вайны, завершаныя і няскончаныя раманы, аповесці красамоўна сведчаць аб тым, што ўласцівыя яго прозе 30-х гадоў недахопы — сацыялагізатарства, дэкларацыйнасць, падмена эстэтычных задач дыдактычнымі, паслабленне гуманістычнага пафасу абароны чалавека, ілюстрацыйнасць, схематызм у абмалёўцы дзейных асоб, псіхалагічная нематываванасць іх учынкаў і іншае — гэта не арганічнае параджэнне таленту мастака, а вымушаная ўступка ідэалагічным патрабаванням часу. І галоўны клопат таго, хто звернецца да разгляду спадчыны Кузьмы Чорнага, — ПА-НОВАМУ ПРАЧЫТАЦЬ ЛІТАРАЛЬНА КОЖНУЮ СТАРОНКУ, НАПІСАНУЮ РУКОЮ ВЫДАТНАГА МАСТАКА. РАСКРЫЦЬ ВА УСЕЙ ПАЎНАЦЕ І ШМАТАБЛІЧНАСЦІ НЕПАЎТОРНАСЦЬ ЯГО ТВОРЧАЯ ІНДЫВІДУАЛЬНАСЦІ, ЭСТЭТЫЧНАЕ БАГАЦЦЕ, ПАЭТЫЧНЫ СВЕТ ЯГО ТВОРАЎ, ІХ МАСТАЦКАЕ НАВАТАРСТВА І НАЦЫЯНАЛЬНУЮ СВОЕАСАБЛІВАСЦЬ, ЖЫЦЦЯДАЙНУЮ МОЦ МАСТАЦКІХ ТРАДЫЦЫЙ ЧОРНАГА, ЗНАЧЭННЕ ЯГО МАРАЛЬНЫХ УРОКАЎ ДЛЯ СУЧАСНАЙ ЛІТАРАТУРЫ. Зразумела, размова пра аўтара «Вераснёвых начэй», «Бацькаўшчыны», «Млечнага Шляху», «Скіп'ёўскага лесу» павінна весціся ў супастаўленні з творчасцю іншых празаікаў. У ШЫРОКІМ АГУЛЬНАЛІТАРАТУРНЫМ І АГУЛЬНАКУЛЬТУРНЫМ НАЦЫЯНАЛЬНЫМ І ЕЎРАПЕЙСКІМ КАНТЭКСЦЕ, у сувязі з грамадска - палітычнымі падзеямі часу.

Было б несправядліва не аддаць належнага ўсім тым, хто даследаваў і даследуе творчасць Кузьмы Чорнага. Працы М. Луферава, А. Адамовіча, А. Рагулі, С. Александровіча, М. Тычыны, А. Пяткевіча па-ранейшаму застаюцца аўтарытэтнымі навуковымі даследаваннямі. Але сёння ў нас, думаецца, з'явілася шчаслівая магчымасць яшчэ раз, але ўжо з вышыні новага сацыяльнага, гістарычнага вопыту, з улікам трагічных урокаў мінулага паглядзець на шлях, пройдзены пісьменнікам.

Вынікі новага прачытання спадчыны акажуцца рознымі. Так, непараўнальна болей высокай ацэнкі заслугоўваюць яго творы 20-х гадоў, перш за ўсё раманы «Сястра» і «Зямля». На іх хоць і ляжыць пячатка пэўнай нявопытнасці іх аўтара як мастака-раманіста, але сваёй глыбінёй, наватарствам яны не толькі не ўступаюць многім пазнейшым творам, але ў чымсьці істотным нават пераўзыходзяць іх. Аднак у свядомасці чытачоў тая ж «Сястра», напрыклад, замацавалася як рэч падрыхтоўчага этапу, як спроба авалодвання буйной эпічнай формай. Вядома, тут няма сюжэтнага дынамізму, кампазіцыйнай зладжанасці, якімі пазначана ну хоць бы «Трэцяе пакаленне». Затое мы знойдзем у гэтым рамане здзіўляючую аўтарскую свабоду, раскаванасць, веру ў веліч жыцця, засяроджанасць на складаных праблемах духоўнага парадку, на ўнутраным жыцці герояў. Тут няма зададзенасці ў поглядзе на чалавека. Прыгледзьцеся да паводзін і ўчынкаў Казімера Ірмалевіча, Ваці Браніслаўца, Абрама Ватасона, Мані Ірмалевіч, Радзівона Цівунчыка, Панкрата Малюжыча, зазірніце ў душу кожнага з іх, паспрабуйце зразумець, чаго хочуць, куды імкнуцца гэтыя людзі, што іх турбуе, што для іх прымальна, а што яны рашуча адмаўляюць, і вы ўбачыце перад сабою паўнакроўнае жыццё, а не літаратурна прыгладжанае, падфарбаванае, тэндэнцыйнае «адлюстраванне», не сацыялагічную схему, якая ілюструе надзённыя, актуальныя лозунгі дня або ідэалагічныя ўстаноўкі. І героі рамана не з'яўляюцца запраграмаванымі носьбітамі і выразнікамі класавай псіхаідэалогіі. Гэта ўзятыя з рэчаіснасці людзі, якія імкнуцца спасцігнуць саміх сябе, хочуць зразумець сваё чалавечае прызначэнне, сваё месца сярод іншых людзей, сэнс жыцця, сэнс рэвалюцыі. «Вы думаеце, увесь клёк рэвалюцыі ў тым, што цяпер загадчыкам стаў іншы, чым раней быў. Або што мы тут самі крычым аб шпалах і вугалі... Не, ты панкіь згінаць свае плечы ў прысутнасці каго б там ні было. Сам увесь перарадзіся», — гаворыць адзін з герояў «Сястры».

Фактычна кожны твор Кузьмы Чорнага чакае новага, удумлівага прачытання, якое адкрые нам новыя мастацкія глыбіні, і ў новым святле паўстане велічная фігура іх аўтара, яго шматгранны талент, яго месца ў нацыянальнай культуры. Яно заўсёды будзе пачэсным, бо сваім жыццём і творчай працай Кузьма Чорны сцвердзіў ідэю вернасці мастака народу, роднай зямлі.

Міхась МУШЫНСКІ.

Злабадзённа пра адвечнае

«Прыбалтыйская тэатральная вясна-90»

СЦІПЛАЕ паведамленне пра прызы і адзнакі сёлетняга фестывалю «Прыбалтыйская тэатральная вясна», думаю, дало няшмат інфармацыі чытачам. Даўно вядома: важна не столькі тое, што гаворыш, але — як гаворыш. Па сённяшнім скрутным і няпэўным часе ў тых, хто стварае, і тых, хто ацэньвае створанае, застаўся ці не адзіны «свабодны» і «сумленны» крытэрый — эмоцыя...

«Ціхае» перайменаванне «Прыбалтыйскай тэатральнай вясны» ў «Балтыйскую» ў мяне асабіста не выклікала незадаволенасці і гучных эмоцый (заві хоць гаршком): найменне нашае ў мовах суседзяў — Балтарусія, Балткрэвія...

Эмоцыі настроеных на суперажыванне, але стрыманых рыжан магла б першапачаткова «падмануць», напрыклад, назва беларускага спектакля «Крык на хутары», аднак сутнасць самога крыку не памянялася ад перайменавання яго ў «Страсці па Аўдзею». Па шчырасці, я не прыхільнік падобнага роду тэатральных відовішчаў і гэтага спектакля ў прыватнасці. Слабая, вучнёўская, на маю думку, драматургія У. Бутрамеева — дрэнная паслуга Акадэмічнаму тэатру імя Янкі Купалы. Ды, пэўна, рэжысёр В. Раеўскі, прыступаючыся да яе, браў пад увагу не адны тэатральныя меркаванні. Бо наша шаноўная акадэмічная сцэна за сумнавядомаю часінаю дала столькі ўзораў вульгарнай, бессаромнай хлусні, пільнуючы ворагаў народа і выкрываючы шпіёнаў з прыстасаванцамі! Ці не наспеў час (назаву гэта аднаўленнем справядлівасці)... хоць бы перапрасіць за «Пагібель воўка», «Партызанаў», «Канец дружбы», «Маскоўскі характар»...

МІФ ПРА СІЛЫ камуністычнага дабра, якія сусветнае зло ўцягвае ва ўзмоцненую класавую барацьбу, быў падтрыманы колішняю купалаўскаю сцэнаю. Аднак твор нашага сучасніка В. Раеўскага правакуе небяспеку з'яўлення новага тэатральнага міфу: маўляў, пакутнік-селянін, заможны, гаспадарлівы, без віны вінаваты перад экспрапрыятарамі (што чыстая праўда); ды бачыце, заадно — і ўвасабленне ўсяго самага найлепшага, найкаштоўнага, найразумнага ў доўгім існаванні чалавецтва ды ў непрацяглым існаванні беларускае нацыі. З гэткім «заадно» я прынцыпова нязгодная.

Яшчэ ў п'есе канфлікт нейкім таямнічым чынам падмяніла народную драму), хіба толькі з эмацыянальнае афарбоўкі рэплік іншых, харошых персанажаў можна зразумець: над Аўдзеем небяспека. Вобразна мовячы,на крыжы — тэатральным увасабленні Аўдзеевай хаты — абавязкова мусяць гаспадара распнуць. Інакш навошта крыж стаўляць? Гаспадара і распінаюць.

ТАКІМ САМЫМ крыкам — працяглым, адчайным, гістарычна асэнсаваным,—зыходзілі ці не ўсе героі спектакля «Псіхічная атака» паводле А. Чака (Ліепайскі драматычны тэатр): немым крыкам раўлі латышскія стралкі, стагнала Адвечная Карга (Маці — Латвія), палохаў Самотны Пан, ён жа Смерць, ён жа Чэкіст, ляманрыторыка; у спектаклі яна ж, рыторыка, зваявала і дзейных асоб і дачыненні паміж імі. Ды так, што з людзей «атрымаліся» функцыі — добрых, прыхарошана ідэалізаваных, што сімпатызуюць не да канца ідэальнаму Аўдзею, і — адмоўна-зацятых, якія гвалцяць узорнага працаўніка... за сцэнаю! Мо ў гэтым — разгадка бяздзейнасці, рытарычнасці, акасцянелай рытуальнасці спектакля? Ён складаецца з суцэльных ахвяраў — няма ніводнага, хто б не з'яўляўся такою ў межах сцэнічнае прасторы. Прычым ахвярай, вызначанай самім лёсам: калі не сацыялістычнай рэвалюцыі, дык нялюбага мужыка ці прасцяка-жаніха. Каго не пастраляюць — таго напалохаюць, каго не напалохаюць — з таго спагоняць, з каго няма як спагнаць — наздзекуюцца... За сцэнаю.

Паколькі таямнічыя сілы, кепскія начальнікі і благія людзі на сцэне не з'яўляюцца (як жа зразумець жанр спектакля—

«Страсці па Аўдзею» У. БУТРАМЕЕВА. Сцэна са спектакля.

Трэба аддаць належнае купалаўскім акцёрам, работу якіх, і найперш Г. Аўсяннікава і С. Станюты, адзначалі крытыкі фестывалю. І ўсё-такі... Я ні на чым не настойваю, я толькі разважаю: няўжо на гэткім зацятым балбатуне, прагавітым мужыку, сацыяльным недарэку, які не бачыць нічога вакол сябе, акрамя «малацілкі», трымаецца свет? Няўжо свет беларусаў увасабляюць ягоныя боты, світкі, зрэбныя кашулі; ягоныя скаргі, лямант, нэндза і — як тэатральная навацыя—крык пра тое, што ён гаспадар, а ўсе астатнія... Хто?Хто, прабачце? Хто гаспадару не даспадобы? Гэткае філасофіі не ўтрымлівае ніводная народная драма...

Усё прыгожа і верагодна на сцэне, усё хлусліва і фальшыва там сама. Усё можна ўзяць пад увагу, але нічому няможна даць веры. Як немагчыма зразумець, чаму Старая, маці Зуйка, хрысціцца на ікону, а Стары бацька Аўдзея, на... глядзельную залу. Ці ж да аднаго бога яны звяртаюцца? Ці ж аднаму — і якому богу спавядаюцца стваральнікі спектакля?

Што казалі пра пастаноўку купалаўцаў крытыкі? Т. Ратабыльская, напрыклад, ухваліла пабудову рэжысёра і параўнала спектакль з іконаю, на якой можа адразу падавацца ўсё жыццё святога (спектакль пабудаваны паводле падобнага прынцыпу); Л. Берзіня далікатна расказвала пра блізкую латышам тэму спектакля, якую проста вызначае ў фінале рэпліка Чалавека з газніцаю, маўляў, ліквідуем гэтых гаспадароў як клас...

Што будзе пасля — агульнавядома, аднак выказаць гэта не з дапамогаю тэатра, не сродкамі тэатра, але—самім тэатрам (фармулёўка Д. Станявічутэ), чытайце — самім тыпам акцёрскай ігры, існавання ў прапанаваных абставінах, рэжысёрскім вырашэннем і асэнсаваннем гэтых абставін, на маю думку, спектаклю купалаўскага тэатра не ўдалося. Усе эмацыянальныя афарбоўкі інтанацый, усе градацыі галасоў дэманстравалі толькі, як ад нармальнай чалавечай гаворкі героі спектакля пераходзілі на крык, але ці шмат можна давесці крыкам—самым адчайным, гучным, нават гістарычна праўдзівым?

таваў Паэт.

Паэма А. Чака «Да іх дакранулася вечнасць» яшчэ не перакладалася ні на рускую, ні на беларускую мовы. Я, як глядач, шукала паразумення з перакладам у навушніках праз тэатральную мову, праз яе інтанацыі. Хацелася б зазірнуць у аўтарскую пабудову паэмы, зверыцца з аўтарскімі думкамі, але... Мушу, такім чынам, адвольна трактаваць паэму А. Чака, хоць рэжысёр Ю. Рыйніекс уключыў у сцэнічную кампазіцыю радкі з Чакавых вершаў — самакаштоўных, глыбокіх аскепкаў быцця не тагачаснай Латвіі, але заўсёднага чалавецтва ва ўсе часы. «Мы, думаем ціха, пакутуем ціха і паміраем ціха...» — гэты радок Чака і стасуецца з сэнсам ягонае паэмы, і супрацьстаіць яму.

«Некаторыя гісторыкі трымаюцца меркавання, што адстаяць незалежнасць новазаснаванай Латвійскай рэспублікі шмат у чым дапамаглі таксама паходы і перамогі латышскіх «чырвоных» стралкоў у Расіі. ...Праз дваццаць гадоў колы, што прыйшлі з дапамогаю стралкоў да ўлады ў СССР, пазбавяць Латвійскую дзяржаву самастойнасці і амаль пагалоў знішчаць былых стралкоў» (гісторык Яніс Біне). Злучэнні стралкоў, аднак, існавалі з 1915 года і мелі на мэце свайго першапачатковага існавання, вядома, не абарону ленінскага ўрада. Пасля рэвалюцыі стралкі набылі розны «колер»...

«Што такое стралкі для латышскага народа—гонар ці ганьба?» Такое пытанне з праграмкі спектакля мусіць цвяліць глядацкую прагу да суперажывання на працягу дзвюх з паловаю гадзін. Філасофскія пытанні, якія Паэт намагаецца хоць бы асэнсаваць, улезшы ў кашулю стралка як у ягоную скуру, памнажаюцца кожныя дзесяць хвілін. На вялікі жаль, старыя, лепей сказаць, састарэлыя сродкі тэатральнай выразнасці моцна замінаюць і Паэту, і гледачам прасачыць збольшага, як жа на пытанні адказвае паэт А. Чак. Трэба аддаць належнае «нагледжанасці» маладзёна Ю. Рыйніекса: у самым лепшым сэнсе паняцця «вучнёўства» ён шмат чаму навучыўся ад старэйшых калегаў, шмат што ўзяў ад іх, ды, па завядзёнцы маладога творцы, адмовіцца ад чаго-небудзь, яўна залішняга, у сваім спектаклі проста не ў стане. У выніку спектакль складаюць самыя розныя рэжысёрскія прыёмы, самыя вынаходлівыя і эфектныя мізансцэны з розных савецкіх спектакляў-здабыткаў... Ды што гэта я—справа ж не ў падабенстве мізансцэн! Але чаму яно так смыліць вочы, чаму міжволі вылучаецца на першы план? Мо таму, што «спрыяе» дасягненню самамэты—самавылявіцца, самаўдасканаліцца, самасцвердзіцца? Дый жа не за адзін раз, не ў адным спектаклі!..

Гісторыя латышскіх стралкоў апавядаецца звышпадрабязна, перагружана інфармацыяй. Інфармацыяй, не афарбаванай тэатральнымі інтанацыямі, але багата пададзенай у тэкстах таго ці іншага героя спектакля і тут жа праілюстраванай шматлікімі партнёрамі. Самотны Пан (з выгляду — сам Люцыпар) натуральна «афармляе» і правакуе падзеі, ды два, так бы мовіць, падпанкі-д'яблы (што прымаюць воблікі генералаў, якія пасылалі стралкоў на смерць) неяк «расцягваюць» самотную Люцыпараву веліч. Дробнасць асобы міжволі здрабняе падзеі, у якіх апошняя бярэ ўдзел. Сцэны перамовінаў, змаганняў, выкрываванняў, праследаванняў і здрадаў менавіта з-за сваёй — то мітуслівасці, то застыласці, скульптурнасці, а яшчэ з-за эстраднага дыму-туману не набываюць важкае вобразнасці, на якую прэтэндуе спектакль. Што тут сказаць? Хіба толькі тое, што паэзія Чака, на маю думку, сама па сабе адметна тэатральная? Таму ні «жывыя карціны», ні прыгожыя паставы акцёраў у вынаходлівых позах, ні скульптурныя мізансцэны яшчэ большай тэатральнасці вершам не надаюць. Ім патрэбна іншае рэжысёрска-акцёрскае «атачэнне». Праўда, адна карысць ад спектакля ўсё ж мусібыць: гэта... інфармаванне залы. Сюды можна ісці як на лекцыю па гісторыі. Улічваючы паўсюдную нястачу гістарычнай праўды, з існаваннем спектакля на пэўны час можна было б і пагадзіцца.

ЛАТЫШСКІ ТЭАТР «Дайле» («Мастацтва»), а больш дакладна — рэжысёры К. Аўшкапс і В. Ветра звярнуліся да п'есы латышскага эмігранта Р. Стапранса «Чатыры дні ў чэрвені», якая нібыта «вокам назіральніка збоку» ўзнаўляе адну з самых трагічных старонак латышскай гісторыі — страту Латвіяй незалежнасці ў 1940 годзе. Узмацніць уражанні гледачоў спектакля мусіць месца дзеяння — сапраўдны кабінет прэзідэнта Ульманіса ў Рыжскім замку. Купкі гледачоў, якія могуць змясціцца ў межах кабінета, цалкам хапае, каб спраўдзілася і адваротнае пераўтварэнне — гістарычнага месца дзеяння ў тэатральнае. А дадайце сюды ледзь не партрэтнае падабенства акцёра У. Вездыка на Ульманіса...

Падобнага роду драматургія, мне здаецца, «асуджана на поспех» (хоць і вельмі непрацяглы) пры ўмове, што так званая атмасфера гістарычнай сапраўднасці (яе ўтрымліваюць аўтарскія радкі) мусіць перайсці ў атмасферу падмосткаў, прабачце, масніц... У гэтым

НАЙПЕРШ АД НАС САМІХ...

Гартаючы новыя выданні

Нарэшце, пасля доўгай важданіны на розных узроўнях, набывае права на існаванне доўгачаканы Закон аб друку. Ён не толькі для журналістаў, пісьменнікаў, але і для ўсіх іншых грамадзян, бо ў ім замацоўваецца адно з важнейшых і неад'емных правоў чалавека — права на праўдзівую інфармацыю.

Дэмакратыя, галоснасць, напрыклад, нарадзілі дзесяткі выданняў, пра якія гадоў пяць і думаць не даводзілася. Выданняў і афіцыйных, што выходзяць як органы салідных устаноў і арганізацый, і паўафіцыйных, якія маюць сваіх фундатараў, і зусім самвыдаўскіх, але якія свабодна прадаюцца, скажам, на станцыях і пераходах мінскага метро.

Сапраўднае што ні ёсць інфармацыйнае мора. Але тут жа ўзнікаюць у душы і незадавальненне, прыкрасць, горыч. Чаму ж мы, беларусы, і сёння, калі беларускай мове нададзены статус дзяржаўнай, не выкарыстоўваем гэты выдавецкі бум для яе прапаганды?

Гаворка пойдзе пра тыя бюлетэні, штотыднёвікі, штомесячнікі, якія пачалі выходзіць як дадаткі да шматтыражак, а таксама тыя, сярод выдаўцоў якіх значыцца і Саюз журналістаў БССР.

Яшчэ не так даўно тое, што амаль усе шматтыражныя газеты выходзяць у нас на рускай мове, тлумачылася самавольствам колішніх партыйна-савецкіх чыноўнікаў. Цяпер жа ўзнікае заканамернае пытанне: каго вінаваціць у тым, што і новыя выданні нараджаюцца рускамоўнымі? Чаму, скажам, спецвыпуск «Для служебного пользования» (пра гэта мне ўжо даводзілася пісаць) папоўніў спіс «русскоязычных» выданняў у рэспубліцы? Нядаўна ён, дарэчы, набыў ужо і афіцыйны статус — штомесячны інфармацыйна-прававы бюлетэнь журфонду Саюза журналістаў БССР.

Ці яшчэ адно з новых выданняў — «Колесо». Гэта інфармацыйна-рэкламны бюлетэнь (дадатак да газеты «Автозаводец») рушыў у дарогу месяца паўтара назад. Уражанне зусім неблагое. І матэрыялы цікавыя, разнастайныя, і ўменлая падача іх.

Выдаўцамі «Колеса» з'яўляюцца ўпраўленне ДАІ МУС БССР, Рэспубліканскі савет Беларускага таварыства аўтамабілістаў-аматараў, Галоўнае ўпраўленне Дзяржстраха БССР. І — той жа... журфонд Саюза журналістаў рэспублікі. Відавочна, што ў дадзеным выпадку ніякіх указанняў «зверху» аб тым, на якой мове выпускаць бюлетэнь, не было. Выбіралі самі. Выбралі тое, што зручней і прасцей, — рускую мову.

«Колесо» пакацілася шпарка, ідэя падобнага выдання знайшла паслядоўнікаў. На гэты раз у «асобе» Асацыяцыі ветэранаў друку Мінскай гарадской арганізацыі Саюза журналістаў БССР. Калі ласка, спецвыпуск «Человек. Автомобиль. Дорога». Ладны аб'ём, на штотыднёвік цягне. Мова? Таксама руская.

Шчыра кажучы, не ведаю, дзе крыецца прычына ў такой схільнасці рэспубліканскага Саюза журналістаў да рускай мовы. Магчыма, са сваёй роднай там не ў ладах? Доля іс-

спектаклі ёсць нешта ад спірытычнага сеансу ці ад заклінання паганскіх багоў,—варта толькі паддацца ўмовам гульні, варта прымусіць сябе даць веры пабудове рэжысёраў. Аднак... нешта штучнае замінае шчыра перажыць гэтую сітуацыю разам з акцёрамі. Напрыклад, эфект ад гістарычнага інтэр'еру кабінета, узноўленага, як растлумачылі, вельмі дакладна, пляжыць яўная бутафорыя—карціны на сценах, больш пэўна—велізарныя дзіркі ў карцінах (разумець трэба —вось ува што ператварыў жыццё і мастацтва неадпрэчаны Ульманісам хамула). Напрыклад, работы акцёраў вытрыманы ў звыклай манеры таго рэалістычнага тэатра, дзе ўсё нібыта прыўзнята над рэальнасцю, але ўсё — «папраўдзе»...

Прэзідэнту Ульманісу штогадзіны паведамляюць то пра захоп Сталіным Літвы, то пра танкі на дарозе да Рыгі, а ён... рыхтуе прамову да свята песні. Самае прыкрае (ці наадварот, тое, што павінна выклікаць павагу?) — ён «здае» радзіму без бою, без стрэлу, без намёку на супраціўленне, — каб захаваць ад стратаў і згібення свой маленькі народ. Да ягоных дзеянняў кожны можа ставіцца як хоча. Акцёры і рэжысёры нічога не ўзяліся ацэньваць (дый гісторыя, відаць, яшчэ не ацаніла. Яна прысутнічае тут сама ў абліччы Жанчыны ў чорным строі, якая раз-пораз каменціруе падзеі). Мо ў гэтай «неацэначнасці» — каштоўнасць спектакля? А мо ў тым, што ён нагадвае пра чалавечую прыстойнасць і нацыянальную годнасць? (За што, відаць, і быў названы лепшым спектаклем фестывалю.) Як перажывалі б беларусы ў зале ўзнаўленне на сцэне тутэйшае гістарычнай несправядлівасці? Ходзім жа каля зруйнаваных бажніц, пра бога не згадваем...

ВЫРАШЭННЕ ЎЛАСНА тэатральных праблем меў на ўвазе спектакль Літоўскага маладзёжнага тэатра «Голад» паводле К. Гамсуна. Рэжысёр Ц. Граўжыніс прапанаваў уласную версію класічнага твора, пра які, мне здаецца, вычарпальна сказаў крытык: «Гэта не аповесць пра голад, гэта — чароўная казка пра дзівосныя сусветы, якія нараджаюцца ў распаленым уяўленні галоднага. І здаецца нібыта паэт, захоплены палётам сваёй фантазіі, кліча не даць палёгкі фізічным пакутам чалавека, а спявае гімны гэтым пакутам, пасланым у наш цьмяны і шэры свет для таго, каб прыўзняць заслону вечнасці, раскрыць хараство нетутэйшага». Падкрэслю — гэта сказана пра літаратурны твор. У спектаклі ягоны герой Алканасіс (у перакладзе Галодны) ніякі не галодны, ці ягоны голад — іраціянальнай, нетутэйшай прыроды: гэты чалавек хваравіта прагне самавыявіцца, ажыццявіцца, спраўдзіцца. Стан гэткага «голаду» перадаецца найвыдатнаю пластыкаю акцёра П. Будрыса: гэта і ёгаўскія практыкаванні, і адметная чачотка, выканаўца якой жыве ў небудзённых рытмах... Праўда, некаторыя сцэны спектакля можна смела мяняць месцамі (гэта заўважыла Т. Ратабыльская), і нічога не зменіцца. Літаратура, адмыслова пераўвасобленая ў аснову спектакля, не больш як нагода распавесці цікаваю тэатральнаю моваю (па-мойму, у чымсьці запазычанай з вобразнае мовы А. Васільева і Э. Някрошуса) думку, — зусім не цэнтральную, не галоўную ў К. Гамсуна: нам... няма куды ісці, нам няма чаго сказаць. І думка гэтая выказваецца не іранічна, не жартам, не на зацятым сур'ёзе, а так, што інтанацыйную афарбоўку яе не ўлавіць. А трэба было б... Калі не сказаць, дык накрэсліць, якая неспазнаная, надзвычайная моц ёсць у іраціянальным, якая цудоўная ўнутраная раўнавага можа трымаць мройцаў-летуценнікаў на плыву грубай рэальнасці жыцця. Пра гэта, уласна, гаворыць уся літаратура мадэрнізму. Вызначыць «плыневую» прыналежнасць спектакля Ц. Граўжыніса я не змагла.

Звярну, аднак, увагу на меркаванне крытыка Г. Алісейчык: Ц. Граўжыніс — пачатковец (студэнт 4 курса ГІТІСа). У настаўнікі абраў цудоўных педагогаў, а пэўны этап капіравання, пераймання — гэта так натуральна для пачаткоўца! Што ж, на гэта мне няма чаго сказаць.

«ЭМІГРАНТАЎ» С. Мрожака прадставіла Студыя Старога горада з Таліна, і ў праграмцы было пазначана, што рэжысура спектакля належыць М. Міківеру. Але ніякае рэжысуры ў простым сэнсе гэтага паняцця спектакль не ўтрымліваў. Узяўшы самаігральную п'есу, акцёры, напэўна, спачатку самастойна разыгралі яе, і рэжысёрская прысутнасць няшмат што змяніла.

П'еса напісана, і спектакль пабудаваны так, што ўслед за сцвярджэннем чаго-небудзь адразу ідзе амаўленне і наадварот: інтэлігент (АА — Р. Баскін) —адначасова ўладар розуму і ягоны раб, працаўнік (ХХ— А. Лутсеп)—раб цяжкой працы і вольны ў сваёй невідушчасці. Абодва—рабы ідэі: АА—удасканальвання чалавецтва (якое ніяк не спраўдзіць), ХХ—ідэі матэрыяльнага дабрабыту (якога ніяк не дасягне). Драматург, засадзіўшы сваіх герояў у склеп і прапанаваўшы ў якасці найпершай абставіны іхняга існавання эміграцыю, быццам «мадэлюе» закон дыялектыкі пра тоеснасць і змаганне супрацьлегласцей, якія ўяўляюць сабою ягоныя персанажы. Чымсьці падобная сітуацыя (з пункту гледжання абыходку) штучная, амаль абсурдная, хоць, з другога боку, дастаткова прыгадаць прапанаванае яшчэ Бальзакам вызначэнне пра «павукоў у слоіку», як зробіцца зразумелаю асноўная ідэя драматурга: знайсці кропкі перакрыжавання супрацьлегласцей, «змадэляваць» іхняе паразуменне...

Я ўгледзела ў гэтым спектаклі намаганне людзей вярнуць ці нагадаць сабе пра ўласную годнасць, бо менавіта яна «афармляе» асобу. («Ці мы абодва людзі, ці абодва—ніхто»). І адначасова намаганне распавесці пра тое, што годнасць... не патрабуецца ў гэткіх умовах жыцця, не кажучы ўжо пра тое, што ў кожнага сваё ўласнае ўяўленне пра яе. Камусьці вяртанне годнасці можа прадоўжыць жыццё, а кагосьці —забіць... Найбольш цікавым у спектаклі здалося менавіта існаванне акцёраў у прапанаваных абставінах (падрабязныя, прафесійныя, дакладныя работы, адна з якіх (А. Лутсепа) атрымала прыз журы.) і, хоць шмат каму з прысутных гэта падалося напіннаннем фантазіі, —некаторыя асацыяцыі з сёняшнім днём (яны, бадай, ёсць ужо ў п'есе С. Мрожака): сам стан "эміграцыі, «па які» не трэба ехаць удалячынь (наша краіна дае шмат прыкладаў так званай унутранай эміграцыі), ці самае існаванне герояў у склепе—чым не знак роўнасці паміж пралетарыем і інтэлігентам у нашай дзяржаве?

САМ ФЕСТЫВАЛЬ гэтым разам падаўся не надта тэатральным. Мо таму, што амаль усе спектаклі нават пра адвечнае гаварылі з надзённымі інтанацыямі; ці таму, што якраз на дні «Прыбалтыйскай тэатральнай вясны—90» прыпала чарговая гадавіна чарнобыльскай катастрофы— беларусаў і ўкраінцаў ля Помніка Свабоды сустракалі шматлікія і шматнацыянальныя насельнікі Рыгі; а з Літвы тым часам ужо даходзілі першыя звесткі пра блакаду. Хоць глядзельныя залы не пуставалі, хоць гледачы шчыра неслі кветкі, але... Тэатр, мабыць прыналежнасць «добраўпарадкаванага», дабрабытнага грамадства. Пра гэта сведчылі і інтанацыі «нетэатральных» выказванняў вакол тэатральнага фестывалю: злабадзённыя ў размовах пра адвечнае. Ці можна цяпер знайсці іншыя?

Жанна ЛАШКЕВІЧ.

«Эмігранты» С. МРОЖАКА. М. БАСКІН (АА). А. ЛУТСЕП (ХХ).

«Голад» паводле К. ГАМСУНА. П. БУДРЫС (Алканасіс).

«Чатыры дні ў чэрвені» Р. СТАПРАНСА. У. ВАЗДЫК (Ульманіс).

КАНЦЭРТНАЯ МАЗАІКА

ІГРАЎ БАЯН

Некалькі дзён у залах Кіева (Доме мастакоў, Доме настаўніка, бібліятэцы імя У. І. Леніна) гучала разнастайная па стылях і формах баянная музыка ў выкананні лепшых савецкіх майстроў — лаўрэатаў міжнародных, усесаюзных, рэспубліканскіх конкурсаў.

З сольнымі праграмамі выступілі кіяўляне Уладзімір Зубіцкі, Сяргей Грынчанка, Аляксей Янкевіч, Уладзімір Бесфамільнаў, масквіч Вячаслаў Сямёнаў, Аляксандр Скляраў з Варонежа, Віктар Раманько са Свярдлоўска, Віктар Дукальтэ-ценка з Ленінграда, мінчанін Мікалай Сеўрукоў, Таццяна Лукіч (СФРЮ) і інш.

Асаблівую ўвагу звярнуў на сябе А. Янкевіч, які ўзмацніў гучанне баяннага баса камп'ютэрным прыстасаваннем уласнага вынаходніцтва і гэтым наблізіў музыку І. -С. Баха да сапраўднага арганнага гучання.

У канцэрце таксама выступілі выпускнікі і навучэнцы класа М. Рызоля — народнага артыста УССР прафесара Кіеўскай дзяржаўнай кансерваторыі.

Акрамя салістаў, у фестывалі ўдзельнічалі і многія славутыя ансамблі: Уральскае трыо баяністаў у складзе народных артыстаў РСФСР А. Хіжняка, М. Худзякова, І. Шапельскага, Волжскае трыо баяністаў (А. і Л. Фаменкі, Ю. Галаднюк), Квінтэт акардэаністаў Варшаўскай кансерваторыі і інш.

Гэтае свята баяна, наладжанае Музычным таварыствам УССР, прысвячалася 50-годдзю Квартэта Кіеўскай філармоніі і 70-годдзю ягонага кіраўніка М. Рызоля. Юбіляры — квартэт баяністаў у складзе М. Рызоля, М. і Р. Бялецкіх, А. Ціханчука выступілі з вялікай і разнастайнай праграмай і захапілі вялікую аўдыторыю слухачоў адточаным, ураўнаважаным ансамблем, тонкай нюансіроўкай, вялікай эмацыянальнасцю, бляскам. Яны выканалі «Пасакалію» Г. Гендэля, сюіту Э. Грыга «Пер Гюнт», «Ронда-капрычыоза» Ф. Мендэльсона, уверцюру М. Глінкі да оперы «Руслан і Людміла». Яркай падзеяй стаўся заключны акорд фестывалю — праграма з твораў М. Рызоля.

У. САВІЦКІ,
дацэнт Мінскага інстытута культуры.

ціны ў гэтым ёсць. А, можа, камерцыя дыктуе такі выбар? На рускай мове тыраж будзе, вядома ж, большы.

Вось яшчэ адно выданне. Назва яго такая: «Детектив. Приключения. Фантастика. Приложение. № 3. НЛС». Гэтак напісана на першай старонцы. А на апошняй чытаем: «Журфонд, хозрасчётный центр «Мастерская», кооператив «Практик», редакция газеты «Автозаводец».

Першых двух выпускаў, прызнаюся, я не чытаў. Гэты ж, трэці, з цяжкасцю прыдбаў у адным з кіёскаў. А купляць, бадай, і не варта было, бо ў выданні без якіх-небудзь каментарыяў змешчаны перадрукі з розных газет і часопісаў — ад усесаюзнага «Труда» да пінскай «Полесской правды» і баранавіцкай «Знамя коммунизма». «Творчая» праца заключалася не толькі ў зборы гэтай інфармацыі, а і ў перакладзе на рускую мову адной са звяздоўскіх публікацый.

Ды, папраўдзе, пра якую творчасць увогуле можа ісці гаворка? Хоць, па ўсім відаць, у тым жа цэнтры «Мастерская» мяркуюць інакш. Як бачна з рэкламы ў адным з нумароў «Вячэрняга Мінска», «Мастерская» ўсё можа. Робіць па заказах рэкламныя, навуковыя, тэхнічна-прапагандысцкія кіна- і відэафільмы, выконвае мастацка-афармляльныя, дызайнерскія і рамонтна-будаўнічыя работы, наладжвае і бярэ на абслугоўванне ЭВМ і г. д. Пры чым тут журналістыка? Усё вытлумачваецца, відаць, гэтым: «Мастерская» — «дзяржаўнае прадпрыемства, якое выдзяляе на фонд аплаты часовым працоўным калектывам ад 65 да 80 працэнтаў ад каштарыснага кошту ў залежнасці ад віду работ».

Бог з імі, з чужымі грашыма. Ну, а пачуццё годнасці? Нацыянальнай, прафесійнай? Хто, як не мы, журналісты, у гэты складаны для Бацькаўшчыны час можам і абавязаны зрабіць усё, каб паскорыць працэс нацыянальнага Адраджэння, вярнуць народу яго мову?

Разумею, вядома, што многім з маіх калег не проста перайсці з рускай мовы на беларускую. Але ж рабіць гэта трэба. І чым хутчэй, тым лепш. Закон аб мовах у БССР, між іншым, уступае ў сілу з першага верасня.

Пра нацыянальнае пачуццё, пра абавязак пачалі ўспамінаць журналісты, якія рыхтуюць інфармацыйна-рэкламнае выданне Фрунзенскага раёна г. Мінска «Веснянка». Выйшла ўжо чатыры выпускі. Напачатку, канечне ж, назіралася знаёмая карціна: «Веснянка» пабеларуску друкавала толькі адзін-два вершы. Цяпер становішча мяняецца. Так, у чацвёртым нумары змешчаны напісаны добраю беларускай моваю нарыс П. Сабіны «Вечнае» — пра мастака Аляксея Кузьміча, творчасць якога доўгі час не магла знайсці дарогі да шырокага гледача.

Дарэчы, «Веснянка» карыстаецца папулярнасцю, тыраж у 10 тысяч экземпляраў прадаецца ва ўсіх раёнах горада. Бюлетэнь, несумненна, перспектыўны, істотна адрозніваецца ад лісткоў, якія пачалі выходзіць амаль ва ўсіх раёнах сталіцы. Вялікая ўвага ў ім удзяляецца і пытанням мастацтва, культуры, літаратуры. У гэтай сувязі нельга не ўспомніць, што менавіта ў Фрунзенскім раёне паспяхова працуе цэнтр прапаганды беларускай культуры. Таму вельмі просіцца, каб «Веснянка» стала «Вяснянкаю».

А пакуль што... Літаральна днямі пабачыў свет першы выпуск штомесячнага дадатка да шматтыражкі Мінскага гадзіннікавага завода «Луч», называецца ён — «Мы и время». І нават спецвыпуск Беларускага рэспубліканскага аддзялення Савецкага дзіцячага фонду імя У. І. Леніна таксама выпушчаны на рускай мове — «Дети и мы».

...Шмат дзесяткаў гадоў мы з рознай нагоды любілі паўтараць: «Усё ўрэшце залежыць ад нас саміх». Вымаўлялі словы і тут жа забываліся на іх. І ўсё ж, калегі-журналісты, дазвольце паўтарыць яшчэ раз: «Усё залежыць ад нас саміх!» Вернем беларускую мову на старонкі нашага друку. Зробім гэта з пачуцця нацыянальнай годнасці і звычайнага прафесійнага абавязку.

ЛІМАВЕЦ.

Ці не кідаем мы камяні ўгору?

(Пачатак на стар. 5).

(Праўда, у адрозненне ад тых, старанна-нядбайна штукуюцца ў фасонна-рамантычныя апранахі ці непрыкметны стандарт гарнітураў). Дык пільнуючыся пра «амплуа» герояў, яны не менш дбаюць пра сваю карысць, свае даброты. Даброты ж здабываюцца старадаўнім манерам адкалупвання ад агульнага пірага — хуценька ўхапіць, спажыць, а потым пафасна ўгалосіць: я ж не гляну на той пірог, гары ён гарам, гэта нейкія зверыядаўцы грызуцца з-за яго. А я — не-не, я за чысціню натуры, за цнатлівасць памкненняў, я — супраць канфармізму, супраць прыстасавальніцтва, супраць, супраць, супраць... За, за, за...

БЫЎ ЧАС — і доўгі, — калі большасць з тых, хто жыў на адной шостай зямной кулі, засвоіла, што ёсць абавязкі і толькі абавязкі. «Качаць правы» было небяспечна і лічылася непатрыятычным, амаральным, антыграмадзянскім. Зараз згадалі, што цывілізаванае грамадства — грамадства спраўджанага гуманізму, і тут неяк чалавекі бурна абвясцілі аб правах, досыць забыўшыся на абавязкі. Стала модна, нічога не зрабіўшы і не зарабіўшы, абурацца сацыяльнай несправядлівасцю. І такая маладая і квітнеючая істота абураецца: як гэта — нейкая там цётка мае кватэру? Адна! А яна з мужам і дзіцем кідаецца па прыватных пакойчыках. Безумоўна, кватэра патрэбная. Але зноў жа, па прынцыпе — набудзем, а не па правілу: адымем — раздзелім.

Дарэчы, адной маёй знаёмай, самотнай жанчыне, давялося пачуць такую прапанову з апекаванай богам і людзьмі ўстановы — выканкома: памяняць два вялікія пакоі ў цэнтры на аднапакаёўку. Але — чаму? Чаму чалавек, атрымаўшы, звычайна ў досыць сталыя ўжо гады, кватэру, пражыўшы ў ёй жыццё, выгадаваўшы тут дзяцей, пазначыўшы жытло праявамі свайго густу, займеўшы тут знаёмых, суседзяў, чаму ён павінны цягнуцца дажываць сваё жыццё ў нейкі сірочы кут? Чаму ягонае права павінна анексавацца нябліжнім бліжнім? І чаму тыя, хто пачынае жыццё, так гарыць паўтарыць даўнюю памылку? Адымем — раздзелім. Адымем — раздзелім. Усё ж прыйшоў час памнажаць. «Час цягнуць невад...» (Я. Чачот). Але ж не з суседніх нератоў. Жыць за кошт самімі зробленага. Добра зробленага.

Не трэба цешыць сябе ілюзіямі. Большасць людзей не дбае ні пра мінулае, ні пра будучае. Нават і сённяшні дзень для іх — толькі ў тым, што датычыць канкрэтна самога індывідуума. Але гэты «індывідуум», ці, дакладней, індывід, — усё роўна чалавек з натоўпу. Таго самага — не дэмаса, а охласа. Гэта ён крушыць ліхтары і лаўкі ў скверах, шыбуе па газонах, кідае пад ногі цыгарэты, смачна лаецца. Ён лічыць, скажам, што кветкі на могілках і фанабэрлівы жэст падпальвання купюр на памінках (дзякуй богу, мне не давялося на такіх прысутнічаць) — учынкі аднаго роду. Нельга паўтараць памылкі папярэдніх пакаленняў, што крушылі храмы, ламалі крыжы, уяўляючы, што вось толькі разбураць «старый мир до основанья», а там ужо і светлыя далячыні. Якія далячыні мы атрымалі — сёння бачым на свае вочы. А кветкі на могілках — не знешні жэст. І наведванне магіл У. Караткевіча, М. Стральцова, В. Палтаран, В. Бечыка, Р. Семашкевіча — не вонкавая выява. Патрэба. Духоўная патрэба. Як і наведванне магіл сваіх блізкіх.

Між іншым, В. Івінская ў сваіх успамінах пра Барыса Пастэрнака згадвае, што ў першапачатковых варыянтах «Доктара Жывага» быў раздзел пра кветкі. Там паэт спрабаваў асэнсаваць «месца кветак у жыцці і смерці чалавека: яны прысутнічаюць пры нараджэнні яго, на вяселлі, на хаўтурах — ва ўсе значныя моманты чалавечага існавання». Усе значныя моманты чалавечага існавання... Гэта ж невыпадкова.

А калі вярнуцца ўвагай да могілак — дык не нам адмаўляць знешнія выявы. У цывілізаваных краінах догляд за могілкамі і калумбарыямі — як за кветнікам каля ўрадавага палаца. За грошы. І не трэба бегчы на злом галавы ў спёку — кветкі завянуць. Пільнаваць заўсёды паўнюткага выхадным днём аўтобуса, палахліва аглядацца — апошні адыходзіць. Наведваюць, каб дачыніцца да вечнага спакою немітуслівай думкай і спакойна-тужлівым пачуццём. Згадаць нешта, успомніць. Сантыменты? Дробязі? Ці ўсё ж часта той самай духоўнай культуры, пра якую мы сёння столькі мянташым языком? Цудоўна, што выйшаў том Янкі Лучыны. Але ж хіба лішнія былі б кветкі на яго магіле на Кальварыі? Яны там рэдка з'яўляюцца...

...Зараз Цэнтральнае тэлебачанне кожнага тыдня наладжвае казань у нядзелю. Думкі пра вечнае. Цудоўна. Але гэта вышэйшая матэматыка. А нам зусім не зашкодзіў бы лікбез. І этычны, і эстэтычны — лікбез у самым прамым сэнсе гэтага слова. Бо адукацыя ў нас сёння — паняцце хутчэй намінальнае. Усеагульная сярэдняя адукацыя нарабіла бяды, мабыць, не менш, як калектывізацыя. Толькі мы пра тое больш маўчым. Дыпломы завочных, вячэрніх інстытутаў — чаго яны вартыя? Ды і стацыянар, калі мець на ўвазе праграмы, узровень многіх выкладчыкаў, і метады набору...

Узораў процьма. Вядомы эксперымент сацыёлагаў, аб якім паведамляла Цэнтральнае тэлебачанне, калі 60 працэнтаў апытаных не змаглі паказаць на контурнай карце не толькі ЗША, але і Савецкі Саюз. З уласных назіранняў — іх безліч — дзяўчына-суседка, што вучылася ў шостым класе, не ведала, у якім годзе была Кастрычніцкая рэвалюцыя і чый гэта помнік стаіць у Мінску, у скверы, дзе фантан з русалкамі. А яе маці, інжынер-тэхнолаг (хімік па адукацыі) блытала серную кіслату з сярністай. А што такое мэтавая аспірантура, дзе можна здаць усё на траякі і рушыць смела ў навуку? А тыя кандыдаты і дактары навук, што выціскаюць з сябе дысертацыю, каб потым «духовно навеки почить»? (Не збіраюся тым пакрыўдзіць сапраўдных вучоных).

Разуменне адукаванасці дэвальвавалася ўшчэнт. Адбыўся феномен зрушэння грамадскай свядомасці — чалавек, не валодаючы ведамі, лічыць сябе вучоным, займаецца не сваёй справай. У нас, бывае, добры кравец замест таго, каб шыць прыгожыя строі, натужліва і занудна распавядае пра творы мастацтва; прыемная ва ўсіх адносінах кабета замест таго, каб пячы пірагі сваім сямейнікам, сапе над курсавымі, каб гадоў у сорак пяць атрымаць дыплом — і я не горшая, памру з вышэйшай адукацыяй; хлопец, якому б вучыцца добраму рамяству, бо ў руках усё гарыць, а да навук вялікай хэнці, ды і здольнасцяў няма, даводзіць да псіхлячэбніцы настаўніцу.

У нас дзесяцігоддзі квітнеў звычай уладкавання на працу — у тым ліку ў навуковыя ўстановы і нават мастацкія — па пратэкцыі, з пашаны да бацькоў і дзядзькоў. А тымчасам колькі талентаў звялося, «не аплаканых нікім»? Хоць воннава сістэма конкурсаў нібыта і існавала. Але ж трэба неяк давесці гэтую сістэму да ладу. Праўда, пэўныя зрухі ёсць. Скажам, Інстытут літаратуры АН БССР вытрабаваў магчымасць запрасіць тых спецыялістаў, якія яму патрэбны.

СЕННЯ ВЫМАЎЛЯЦЬ як магічныя словы: кансенсус, канверсія, дысплеі. Але, мне здаецца, з тым узроўнем і якасцю адукацыі спецыялістаў, якія мы маем, з той сістэмай бессістэмнасці ў нашай планавай гаспадарцы, нам не дапамогуць ні кансенсус, ні канверсія, ні дысплеі. І дапамога заходніх дзяржаў. Дарэчы, дагэтуль ніводная салідная фірма ЗША, напрыклад, не пайшла на рызыку сумесных прадпрыемстваў. І ці выратуюць тыя прадпрыемствы? Ці не ператворацца яны ў арэчаўленыя сведчанні непрадуманасці і няспеласці чарговых нашых пражэктаў-мар? А спадзяванні, што варта толькі абраць прэзідэнта, як моцнаю цудадзейнаю рукою ён адразу ператворыць наша палітычна-эканамічнае ліпенне ў суцэльны істэблішмэнт — ці не абернецца гэта вядомым прыслоўем: «Ні пану, ні найміту». Наш Чарнобыль, трагедыя Арала, канфлікты ў Закаўказзі і Сярэдняй Азіі, галодныя пайкі ў гарадах Расіі (7 грамаў масла і 20 грамаў кілбасы на дзень) — жорсткая рэальнасць. Праблемы, праблемы, праблемы... Шчырасць жа намераў урада пакуль што не ператвараецца ў канкрэтныя зрухі.

Першыя ж спробы перабудовы выявілі, што энергія, акуратнасць, дзелавітасць нам, на жаль, не ўласцівыя. Як не ўласцівыя прадуманасць дзеянняў, папярэдні эканамічны і сацыяльны разлік (згадаем хоць бы сумную па выніках кампанію барацьбы з алкагалізмам). У нас прызвычаіліся да прыблізнасці мыслення, да неахайнасці ва ўсім. У нас няма культуры вытворчасці (паглядзіце — кожная будоўля ці рамонт ператвараюцца ў рэпетыцыю скону свету), няма культуры побыту, сацыяльнага побыту, хаця тут не трэба ні спецыяльных фондаў, ні капітальных укладанняў. (Выключэнне — хіба што Прыбалтыка). Паглядзіце, як выглядае сёння Беларусь і Мінск. Нейкі пейзаж пасля бойкі. Шматкіламетровы сметнік. Пакаленні выхоўваюцца, не маючы ўяўлення не толькі аб прыгажосці, але і аб элементарным парадку. Што хачу — тое раблю. Дробязі? Але ўсё пачынаецца з дробязяў. Чалавек, асабліва малады, цвёрда засвойвае, што жыццё ва ўсіх праявах — суцэльны вэрхал. У ім і паводзіць сябе трэба адпаведна. Ці не ад гэтай усёдазволенасці з'яўляюцца нематываваныя і матываваныя злачынствы? Якіх толькі «выпадкаў з практыкі» не пачуеш у зводках МУС. У іх, безумоўна, ёсць сацыяльныя, псіхалагічныя, светапоглядныя прычыны. Але ўсё пачынаецца з дробязяў.

Ад пустога, аўтаматычнага падпарадкавання, дысцыпліны ў імя дысцыпліны ў нас неяк хутка адбыўся пераход да поўнага занядбання разумення сваіх абавязкаў. Няма павагі да чужой працы. Так, раней было шкоднае правіла — рабіць усё, што загадаюць. На бульбу? На бульбу. На дэманстрацыю? На дэманстрацыю. На базу гародніны? На базу. Шыць гарнітуры, якія можна апранаць, толькі каб не хадзіць голым? Шыць. Рабіць чаравікі, якія можна насіць толькі з гора? Рабіць. Перапісваць, высунуўшы язык, кніжкі, што ўсё роўна, набыўшы сякую-такую логіку і пісьменнасць, застануцца шэрымі? Перапісваць. Апошняе мне вядома з жыццёвага вопыту. Даводзілася і бунтаваць. То на мой бунт разумны, дасведчаны чалавек, загартаваны яшчэ тым, сталінскім часам, але не сталініст, з крыўдай азываўся: «А як жа я?».

Чалавек быў самаахвярны і здольны, усё жыццё чытаў чужыя рукапісы, і перапісваў чужыя рукапісы, і адстойваў чужыя рукапісы. І не ўяўляў, што можа быць інакш. А я не хачу гаварыць сёння тым, хто рушыць удзячным і няўдзячным літаратурным, рэдактарскім, журналісцкім шляхам: «А як жа я?» Хай у іх будзе не так, як у мяне. Хай яны аспрэчваюць бяздарных і бязладных, хай эксперыментуюць самі і даюць магчымасць рабіць гэта іншым. Хай адмаўляюць. Я не хачу, каб яны «дацягвалі», «пералапачвалі», «даводзілі да кандыцыі», інакш кажучы, перапісвалі, ператвараючы непісьменную сыравіну ў шэрае чытво. Гэтае рускае «литраб» (литературный работник) — яно і па-беларуску мае тую семантыку, хаця называецца па-рознаму — рэдактар, літсупрацоўнік, рэферэнт.

Між іншым, «мода» перапісвання — таксама з'ява, народжаная тым часам, калі пісаць добра і шчыра было, фактычна, самазабойствам. Калі сапраўдныя пісьменнікі ці кроілі свой талент, прыстасоўваючы яго да патрэб рэжыму, ці пісалі «ў стол», ці «даказвалі» сваё права на мастацкую праўду ў катавальнях, ці, больш правільна, ім даводзілі, што мастацкая праўда і рэжым — несумяшчальныя. Метады доказаў мы зараз ведаем. Затое з напаўпісьменных рабкораў літрабы рабілі пісьменнікаў. Тэма, ідэя... Маўляў, у нас няма кніг пра рабочых, вайскоўцаў, медыкаў, інтэлігенцыі... Трэба «дарабіць». Часы тыя і ў іх палітычным, і ў ідэалагічным, і ў гаспадарчым аспекце мы, здаецца, рашуча асудзілі, а практыка тыхчасовая, традыцыя — засталіся. Жывуць і квітнеюць. А літрабы кроюць, шыюць, цыруюць... І новаспечаных літаратараў абвяшчаюць пісьменнікамі. Тыя пачынаюць сябе адчуваць — ні больш, ні менш — дактарамі Чэхавымі, пілотамі Сент-Экзюперы, паручыкамі Лермантавымі... Акадэмікамі Пічэтамі, мастацтвазнаўцамі Шчакаціхінымі... Прозвішчы? Я магу іх назваць. Але шмат месца займуць.

Не, я не хачу гаварыць: «А як жа я?» А пытанне тое мне зразумелае, як роспач Сізіфа, і незразумелае, як факт усведамлення. Плён шматгадовых высілкаў — які ён? Чым пазначаны? Ці не кідаем мы каменне ўгору? А яно ляціць на нас. І да гэтай, сённяшняй пары.

Але... Адмаўляючы тую тупую падпарадкаванасць, нельга адмаўляць натуральнасць дысцыпліны, абавязковасць палёту думкі і пачуцця, аднак і цвярозага разліку. Сёння ці не занадта шмат тэатральнасці ва ўсім, што адбываецца? Ці не зашмат акцёраў ад моманту? Рыцараў на гадзіну? Тых, што педаліруючы высокія ноты, прэтэндуюць на сваю выключнасць, лічаць, што смеласць толькі сёння, разам з імі з'явілася на авансцэне жыцця.

БЫЦЬ смелым сёння лёгка. Куды цяжэй гэта было ў нядаўнія часы. І больш аддаленыя. Дзесяць год без права перапіскі (сёння мы ведаем «семантыку» гэтых слоў), архіпелаг ГУЛАГ, «выхаваўчыя гадавальнікі» таварыша Брэжнева, звальненні з працы, ды яшчэ з пячаткай, не пазначанай у працоўнай кніжцы, але горшай за любыя вымовы: небяспечны чалавек. Як у мяшок садзілі. Ні працы, ні публікацый. Згадаю Алеся Наўроцкага, Фёдара Яфімава.

Трэба было на тую пару мець вялікую чалавечую годнасць і смеласць, каб выступіць супраць афіцыйнай лініі, як Алесь Адамовіч, што не падпісаў ліст супраць А. Сіняўскага і Ю. Даніэля. Каб трымаць чалавечую і пісьменніцкую годнасць, як І. Мележ, Я. Брыль, Ф. Янкоўскі, Р. Бярозкін, М. Стральцоў, Р. Барадулін, А. Вярцінскі, В. Каваленка, У. Калеснік, У. Конан, Р. Шкраба. Як дачка Максіма Гарэцкага Г. М. Гарэцкая, што не згубіла ні адчування ўласнай годнасці, ні веры ў чалавецтва, пражыўшы большую частку жыцця як ЧС (член сям'і палітзняволенага), як паэт С. Новік-Пяюн, што не здрадзіў ні сабе, ні сваім ідэалам, спазнаўшы і дэфензіву Пілсудскага, і нямецкія катавальні, і сталінскі ГУЛАГ. Як М. Ермаловіч, што, не быўшы на працы ў ніводным навукова-даследчым інстытуце, кожнага дня ездзіў у Мінск, у бібліятэкі і архівы, каб стварыць сапраўдную гісторыю старажытнай Беларусі, патрактаваную насуперак канонам тагачаснай навукі. Як А. Разанаў, што задоўга да сённяшніх масіраваных спроб надаць патрэбны статус роднай мове не збаяўся выступіць з патрабаваннем выкладання на беларускай мове, за што быў выключаны з універсітэта. Як А. Сідарэвіч, што аддаваў час штудыям заходнебеларускай прэсы і аўтараў, чые прозвішчы нават згадваць было нельга, не кажучы пра публікацыі. Як паэт і філосаф Зніч, што за нестандартнасць мыслення быў пазбаўлены працы і магчымасці друкавацца.

«Блажэнны, хто не згубіў надзеі сваёй», «Гора сэрцу аслабеламу! Бо яно не мае веры, і за тое не будзе абаронена».

Праўду ўсё ж спрабавалі абараняць. Сёння модна стала аблiваць памыямі рэдактараў тае пары. Даперабудоўчай. Сёння нібыта ніхто не ведае, якімі абмежаванымі былі правы рэдактараў. Як сутыкненні з цэнзурай заканчваліся адміністрацыйнымі мерамі. А было ж яшчэ і гэтае, славутае; на цэнзуру не спасылацца. Адбывалася гэта і зусім не ў сівыя культаўскія часы. У 70-я — калі «закупюраваную», «зацэнзураваную» кнігу У. Калесніка «Ветразі Адысея» тым не менш згадвалі на кожнай нарадзе, на кожных галоўлітаўскіх занятках з рэдактарамі. Маўляў, не хапіла палітычнай пільнасці — занадта шмат волі далі сабе аўтар з рэдактарам, калі падавалі карціны заходнебеларускага грамадзянскага і палітычнага і літаратурнага жыцця Заходняй Беларусі і пражскай эміграцыі. Было тое ж і ў 1982, 1983, 1984, 1985 гадах. Да ўзору, у выдавецтве «Мастацкая літаратура» было забаронена выданне зборніка «Спадчыны» (куды, між іншым, уваходзіла і п'еса Янкі Купалы «Тутэйшыя») — усе, хто браў удзел у падрыхтоўцы рукапісу, атрымалі вымовы. У кнізе Я. Шабана здымалі п'есу «Чахарда», а драму «Шрамы» рабілі адпаведнай «залітаванаму» варыянту для сцэны. У кнізе Д. Бугаёва выкідвалі цытаты Я. Брыля, М. Танка, А. Адамовіча. За адзін толькі год жорсткія «выкрэсліванні» былі ў 15 кнігах выдавецтва «Мастацкая літаратура». Дырэктар выдавецтва М. Ф. Дубянецкі атрымаў інфаркт, доўга хварэў і вымушаны быў з-за стану здароўя пайсці на пенсію. Тых, хто меў дачыненне да тых кніг, згадвалі на ўсіх афіцыйных пасяджэннях. Сёння дзіўна — але было непажаданым згадванне Бога, нават у фразеалагізмах (не дай божа), і Біблії. Таму смешна і сумна, калі нехта з людзей веку сталага, што добра ведаюць абставіны той пары, раптам папракне: рэдактар палічыў, што было «занадта востра». Што ж тычыць тых далёкіх ужо і зусім недалёкіх падзей, дык зараз, у перабудоўчыя гады, ніхто не перагледзеў абвінаваўчыя акты тых год, ніхто не папрасіў прабачэння ў супрацоўнікаў выдавецтва, ніхто не адказаў за свавольства. Ніхто. Праўда, некаторых з тых караюча-дзеючых асоб няма ўжо на іх рабочых месцах. Але...

Сёння можна быць смелым. Дазволена быць смелым. І некаторым здаецца, што вось толькі сёння і з'явілася тая якасць, а раней, так бы мовіць, і зблізу незнаёмая была. Ёсць такая тэндэнцыя. На ўсіх нашых абшарах. Як і звычка абвінавачваць у вузканацыянальных поглядах. Маўляў, акрамя свайго, нічога не бачаць. Але ёсць і той сталічна-правінцыйны погляд, які адчуваецца ў шматлікіх выступленнях цэнтральнай прэсы. Да прыкладу, дасведчаны чалавек, інтэлігент, дырэктар Пушкінскага дома Мікалай Скатаў у сваім артыкуле «Дух взыскующий» («Правда», 1989, 13 лістапада),

такія сур'ёзныя людзі, як Уладзімір Арлоў (Масква) і Цімур Зульфікараў у дыялогу пад назвай «Почем нынче мировая скорбь» («Литературная газета», 1989, 29 лістапада) выяўляюць нейкую дзіўную накіраванасць розуму, мэтанакіраванасць інтэлекту, магчыма, і несвядома звужаючы тэму гаворкі, і, натуральна, крытэрыі культуры, крытэрыі свядомасці. Толькі і адзіна — Расія. Ніхто не аспрэчвае — вялікая культура, вялікая літаратура. Але жывём мы ўсё ж у федэрацыі. Зноў жа — мадэль. Схема. Зразумела, ва ўсякім выпадку — даравальна, — калі так успрымаюць наш кангламерат народаў за мяжой, тыя ж Ален Баскё або Дзюрэнмат, на якіх спасылаецца Скатаў, але незразумела і недаравальна, калі так звужана ўспрымаюць духоўны свет адной шостай часткі зямной кулі яе грамадзяне. «Нацыянальныя вобразы свету» выпадаюць з поля зроку, здавалася б, разумных і культурных людзей. А ўлічваць гэтыя вобразы «не толькі для сумленнага мыслення карысна, але і для глыбіні» яго. Як не пагадзіцца тут з Георгіем Гачавым — гэта словы з яго кнігі «Нацыянальныя вобразы свету».

ЧАЛАВЕЦТВА, сусветнае людства мае агульныя ідэалы, агульныя інтарэсы, моманты судакранання, але небяспечная ілюзія пра знікненне нацыянальных асаблівасцяў, бачым на свае вочы, не проста разляцелася — выбухнула безліччу жорсткіх канфліктаў. Вузкасць разумення— гэта вузкасць. Зноў жа мадэль, якую не так даўно ўяўлялі не інакш як «Саюз непарушны рэспублік свабодных», не ў сваім адстароненым, ідэальным варыянце выявіла нешта зусім не ідэальнае і далёкае ад ілюзій.

Увогуле ў нас амаль не засталося ілюзій. Але ёсць пагроза — ці не будзем мы і надалей ілюзіі прымаць за ідэалы? Так і не зразумеўшы, што ідэал — заўсёды недасягальная мара. І не трэба пазначаць канкрэтны тэрмін яе здзяйснення, яго не бывае. І не можа быць. І не павінна. «Усё вышай, і вышай, і вышай» — гэтыя асляпляльныя віражы ілюзій вялі, як мы сёння ведаем, не ў вышыні здзейсненых ідэалаў, а ў жудасныя сутарэнні ГУЛАГа. Вось і зараз — абвясцілі перабудову, галоснасць, пачалі «штрыхаваць» белыя плямы (часам, праўда, забываючыся пра тое, што, акрамя белага і чорнага, ёсць яшчэ рознакалёрны спектр), даведаліся — што адбывалася і хто, пра што і як пісаў. Глядзелі, слухалі, дзівіліся, урэшце перасталі дзівіцца, гледзячы пасяджэнні з'ездаў народных дэпутатаў СССР і Вярхоўнага Савета — колькі ў нас разумных і дасведчаных людзей і колькі абмежаваных і неадукаваных. Ідэі, ідэі, ідэі... Прапановы. Гаворка. Але ж навуковай карціны сённяшняга эканамічнага, палітычнага становішча, філасофскага асэнсавання таго, што адбываецца, няма. Як няма і пэўных, канкрэтных распрацовак — адпаведна зусім розным па ўзроўні развіцця, магчымасцях рэгіёнам.

Дык зноў жа — ці не кідаем мы каменне ўгору, замяняючы цвярозы роздум і прадуманы разлік бясконцай гаворкай? Маючы на ўвазе мадэль, схему, не звяртаючы ўвагі на дробязі. Заўсёды ставячыся з іроніяй да тэорыі «малых спраў», а зараз і ўвогуле занядбаўшы іх. Але ж няма вялікай справы без малых спраў, і, спакушаючыся чарговай ілюзіяй — ствараючы наступную мадэль, ці не скажам мы зноў — дзе багацце наша? Бо пачатак кожнай справы — роздум.

Юрый Уладзіміравіч СЕМЯНЯКА

Беларускае музычнае мастацтва панесла цяжкую страту. 16 чэрвеня 1990 года памёр народны артыст БССР, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі БССР, вядомы кампазітар, удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, член КПСС Юрый Уладзіміравіч Семяняка.

Ю. У. Семяняка нарадзіўся 26 лістапада 1925 года ў г. Мінску. У 1957 годзе скончыў Беларускую дзяржаўную кансерваторыю імя А. В. Луначарскага.

Працоўнае жыццё пачаў у 1946 годзе выкладчыкам музычнай школы ў г. Іванава. З 1947 па 1963 год быў канцэртмайстрам Дзяржаўнай акадэмічнай харавой капэлы БССР. Затым да 1976 года знаходзіўся на творчай рабоце. У 1976—1980 гадах выбіраўся намеснікам старшыні, старшынёй праўлення Саюза кампазітараў БССР.

Ю. У. Семяняка — адзін з вядучых кампазітараў рэспублікі. Яго творы характарызуюцца высокай ступенню мастацкага абагульнення, глыбінёй музычна - драматычных канцэпцый. Кампазітар развіваў традыцыі рэалістычнага мастацтва, творча асэнсоўваў багацейшую скарбніцу беларускага музычнага фальклору. Яго творам уласцівы меладычнае багацце, жанравая мнагапланавасць, выразнасць і дасканаласць формы.

Сярод найбольш значных твораў Ю. У. Семянякі оперы «Калючая ружа», «Калі ападае лісце», «Зорка Венера», «Новая зямля», аперэты «Рабінавыя каралі», «Тыдзень вечнага кахання», «Паўлінка», «Сцяпан — вялікі пан», гераічная музычная камедыя «Пяе «Жаваранак», кантаты «Ясныя дарогі», «Памяці Канстанціна Заслонава», «Велічальная Мінску», «У вянок Максіму Багдановічу». Вядомы яго вакальна - сімфанічныя творы, уверцюры, рамансы, музыка да драматычных спектакляў, тэле- і кінафільмаў. Найбольш актыўна працаваў кампазітар у галіне песеннага жанру. Творы Ю. У. Семянякі заваявалі папулярнасць не толькі ў нашай рэспубліцы, але і ў краіне.

Усё жыццё Ю. У. Семянякі было прысвечана служэнню музычнаму мастацтву роднай Беларусі. Нямала сіл аддаў ён развіццю самадзейнай мастацкай творчасці. Грамадская работа кампазітара была неаддзельная ад яго асобы мастака і грамадзяніна. Ю. У. Семяняка з'яўляўся сакратаром праўлення Саюза кампазітараў СССР, членам мастацкіх саветаў Міністэрства культуры БССР, Дзяржтэлерадыё БССР.

Заслугі Ю. У. Семянякі ў развіцці савецкага музычнага мастацтва адзначаны ордэнамі Леніна, «Дружбы народаў», «Знак Пашаны», медалямі і ганаровымі граматамі.

Светлая памяць пра Юрыя Уладзіміравіча Семяняку, таленавітага кампазітара, камуніста, чулага і добрага чалавека назаўсёды застанецца ў нашых сэрцах.

Я. Я. Сакалоў, В. Г. Балуеў, В. І. Борыс, У. І. Ганчарык, М. І. Дземянцей, У. Г. Еўтух, А. С. Камай, В. Ф. Кебіч, М. В. Кавалёў, А. І. Кастэнка, М. І. Лагір, А. А. Малафееў, В. А. Пячэннікаў, А. І. Трутнеў, Ю. М. Хусаінаў, Н. М. Мазай, А. У. Русецкі, Я. К. Вайтовіч, М. І. Місуна, А. М. Герасіменка, В. В. Пірагоўскі, І. М. Лучанок, У. У. Алоўнікаў, Г. М. Вагнер, Д. Б. Смольскі, С. А. Картэс, У. В. Дарохін, В. А. Войцік, М. П. Дрынеўскі, М. А. Казінец, В. В. Зуёнак, М. М. Яроменка, В. А. Нікіфараў, Г. В. Буралкін, В. У. Роўда, Н. В. Гайда, В. В. Букань, С. А. Штэйн.

Словы развітання

Пайшоў з жыцця народны артыст Беларусі, кампазітар, таленавіты, горды чалавек. Гэта непапраўна цяжкая страта для ўсіх нас, для ўсяго беларускага музычнага мастацтва. І калі я скажу, што мы развітваемся з адным з самых любімых сыноў беларускага народа, гэта не будзе перабольшваннем. Мабыць, гэта гучыць залішне літаратурна, але ўдумаемся: сапраўды, няма, напэўна, у нашай рэспубліцы такога кутка, дзе б не ведалі і не любілі цудоўныя мелодыі, створаныя дзівосным талентам Юрыя Уладзіміравіча Семянякі.

Ён пакінуў нам вялікую спадчыну. Ён аўтар шэрагу опер, ягоныя музычныя камедыі зрабіліся яркай старонкай беларускага музычнага тэатра. Яго песні, рамансы, іншыя вакальныя творы знаёмыя слухачам не толькі нашай рэспублікі. Ён быў не толькі таленавіты кампазітар, а яшчэ і нястомны грамадскі дзеяч. Знешне спакойны. Але пад гэтым спакоем, усе мы ведаем, білася гарачае сэрца нястомнага і непрымірымага барацьбіта за ідэалы беларускага нацыянальнага мастацтва.

Юрый Уладзіміравіч пайшоў ад нас заўчасна. Ён вельмі многа мог бы яшчэ зрабіць для беларускай музыкі. Але калі ёсць для мастака вышэйшае прызначэнне на гэтай зямлі, калі яно ў тым, каб сваім талентам зрабіцца неад'емнай часцінкай гісторыі свайго народа, дык Юрый Уладзіміравіч выканаў гэтае прызначэнне з годнасцю. І за гэта шчыры паклон яму ад усіх нас.

Уладзімір ДАРОХІН.

Дарагі наш, любімы Юрый Уладзіміравіч... Зусім немагчыма прывыкаць да думкі, што Вы ад нас адыходзіце. Сёння мысленна з Вамі развітваюцца ўсе артысты, усе работнікі Дзяржаўнага тэатра музычнай камедыі, нашага з Вамі тэатра, тэатра, які сваім існаваннем абавязаны менавіта Вам, Вашаму энтузіязму, Вашай перакананасці. І галоўнае — Вашай музыцы, Вашым спектаклям. Вашы спектаклі, Вашу «Паўлінку» не забудуць ніколі ні артысты, ні нашы ўдзячныя гледачы.

Вы былі надзіва добрым, надзіва светлым чалавекам і неслі гэтую дабрыню ўсім. І вельмі многія людзі сваім, я нават сказала б, дабрабытам абавязаныя Вам. Для мяне асабіста Вы — лёс, Вы — добры анёл... Я думаю, што колькі будзе існаваць гэты свет і жыць у ім людзі, яны заўсёды будуць памятаць Вас, Вашу дзівосную музыку, Вашы спектаклі. Ваша мастацтва будзе гучаць у нашых сэрцах, будзе жыць у памяці. Спіце спакойна... Бывайце...

Наталля ГАЙДА.

Усё жыццё, уся праца мая ў Беларусі літаральна з першых кронаў звязана з Юрыем Уладзіміравічам. 20 гадоў творчай, чалавечай дружбы — гэта бывае не так часта ў наш час. Я і мая сям'я страцілі самага блізкага, роднага для нас чалавека. А яшчэ для мяне Юрый Уладзіміравіч Семяняка — гэта Беларусь, бо ў ім былі засяроджаны ўсе самыя лепшыя, самыя цудоўныя рысы беларускага народа.

Уклад яго ў гісторыю беларускай культуры агромністы. Пералік створанага доўгі, гэта ўсе ведаюць. Але не магу не згадаць, што многае і многае тут звязана з паняццем «упершыню». Гэта і зварот Юрыя Уладзіміравіча да драматургіі Янкі Купалы на сцэне тэатра музычнай камедыі («Паўлінка»). Гэта і зварот да найчароўнай паэзіі Максіма Багдановіча на опернай нашай сцэне («Зорка Венера»). Гэта стварэнне Семянякам першага беларускага вадэвіля, першай нацыянальнай аперэты для дзяцей. І, канечне, ягоныя песні, сярод якіх ёсць па-сапраўднаму народныя.

Апроч усяго іншага, Юрый Уладзіміравіч валодаў нейкім асаблівым пачуццём улюбёнасці ў сваю зямлю, на якой ён нарадзіўся, на якой ваяваў. Усе клетачкі яго арганізма поўніліся любоўю да роднага краю. Нельга забыцца, як на першую нашу рэпетыцыю спектакля «Зорка Венера» мы прынеслі васількі — гэта былі яго любімыя кветкі. І Максім, герой оперы, убачыўшы гэтыя васількі ў першай карціне спектакля, ускліквае: «Якое шчасце — васількі!» І вось у гэтую горкую хвіліну ў маіх руках зноў букецік васількоў, якія шчодра красуюць сёлета. Я хачу, каб гэтыя цудоўныя, сімвалічныя для беларускай зямлі кветкі праводзілі Юрыя Уладзіміравіча ў яго апошнюю дарогу...

Сямён ШТЭЙН.

Калектыў рэдакцыі часопіса «Беларусь» смуткуе ў сувязі са смерцю члена рэдкалегіі часопіса, вядомага беларускага кампазітара Юрыя Семянякі і выказвае спачуванне сям'і, родным і блізкім нябожчыка.

Саюз пісьменнікаў БССР і Камітэт па Дзяржпрэміях БССР у галіне літаратуры, мастацтва і архітэктуры глыбока смуткуюць з прычыны смерці выдатнага беларускага кампазітара, народнага артыста БССР Юрыя Уладзіміравіча Семянякі і выказваюць шчырае спачуванне родным і блізкім нябожчыка.

ЛІСТ У РЭДАКЦЫЮ

Павага ці знявага?

Нядаўна маладзёжная суполка «Машэка» прысвяціла сваё пасяджэнне паэту-земляку Аляксею Пысіну. Запрасілі ўдаву паэта Еўдакію Сямёнаўну і мяне, даўняга знаёмца Аляксея Васільевіча. Прыгадвалі эпізоды з жыцця і творчасці таленавітага паэта, чыталі яго вершы. А потым нехта спытаўся: чаму з дома, дзе жыў паэт, знялі мемарыяльную дошку? На гэта адна з дзяўчат заўважыла, што бачыла, як сёння дошку прыладжвалі на месца.

Позна ўвечары, праводзячы Еўдакію Сямёнаўну дахаты, мы спыніліся каля дома, дзе жыў паэт. Так, дошка з барэльефам была ўжо на месцы... Але...

— Штосьці ж тут не тое напісана! — збянтэжылася Еўдакія Сямёнаўна.

А хтосьці з моладзі з горыччу заўважыў:

— Дый з памылкамі...

Неяк не па сабе і мне стала. Ізноў абы-што...

Калі ў жніўні 1981 года пайшоў з жыцця Аляксей Васільевіч, магілёўскія пісьменнікі пачалі клапатаць пра помнік на ягонай магіле, пра мемарыяльную дошку на доме, дзе ён жыў.

Разам з Еўдакіяй Сямёнаўнай напісалі мы тэкст для надмагільнай пліты, падабралі радкі з пысінскага верша. Так і было здзейснена. Прапанавалі тэкст і для мемарыяльнай дошкі, вядома, на роднай мове. Але мясцовыя чыноўнікі не прывыклі лічыцца з думкай пісьменнікаў, тэкст на дошцы адлілі па-рускі, прытым з недакладнасцямі: апусцілі слова «паэт», замест «заслужаны работнік культуры» напісалі «заслужаны дзеяч культуры». Хоць мемарыяльную дошку ўрачыста адкрылі, але ўсім было зразумела, што яе варта мяняць. Урэшце дамагліся гэтага.

І вось — новая дошка, але зноў з дзіўнаватым тэкстам:

«У гэтым будынку жыў паэт, лаўрэат прэміі імя Янкі Купалы Аляксей Васільевіч Пысін».

Чаму ў будынку, а не ў доме? Будынак — гэта і хлеў, і свіран, і што хочаш. А прэмія? Трэба ж было ўказаць, што паэт лаўрэат Дзяржаўнай прэміі імя Янкі Купалы. І куды падзеліся словы «заслужаны работнік культуры»? Ужо не кажучы пра «Васільявіч»...

Не ўмеюць у нашым Магілёве шанаваць сваю гісторыю і культуру. Усім вядома, напрыклад, што Цішка Гартны пачынаў сваё працоўнае жыццё ў гарбарні Магілёва, не раз і потым наязджаў у наш горад, напісаў тут шэраг сваіх твораў. І кончыў жыццё ў Магілёве — у «славутым» Пячэрску (псіхалячэбніца), замучаны і закатаваны тут сталіністамі як «нацдэм», «вораг народа». Не раз уздымалі мы пытанне, каб назваць адну з вуліц горада імем Цішкі Гартнага, але ўсё марна.

Або такі факт. «Прыдняпроўе, маё Прыдняпроўе!» — гэтая песня на словы Васіля Матэвушава і сёння гучыць па радыё, спяваецца самадзейнымі артыстамі. А колькі цудоўных вершаў пра нашу Магілёўшчыну пакінуў паэт нашчадкам! Абласное аддзяленне Саюза пісьменнікаў звярталася ў гарвыканком з хадайніцтвам прысвоіць яго імя адной з вуліц горада. Але дзе там! Намеснік старшыні гарвыканкома (цяпер ужо былы, то, бадай, не варта прыгадваць яго прозвішча) прыслаў у адказ абшырнае тлумачэнне, чыім імем трэба называць вуліцы. А ў Васіля Матэвушава, маўляў, заслуг не хапіла. Сапраўды, гэта ж не А. Крывулін, не В. Прышчэпчык (былыя першыя сакратары абкома партыі), чые застойныя часоў «заслугі» і сёння магілёўчане горка адчуваюць. Дарэчы, імем В. Прышчэпчыка старанней яго паслядоўнікаў быў перайменаваны праспект Касманаўтаў. Пасля абурэння магілёўчан праспекту вярнулі былую назву, а імем Прышчэпчыка назвалі вуліцу на ціхай украіне горада. Аднак людзі і з гэтым не змірыліся, то нядаўна мусілі назваць тую вуліцу Кашчанавай.

Няма ў Магілёве вуліц і пісьменнікаў-землякоў Юркі Лявонага, Платона Галавача, Васіля Каваля, закатаваных у сталінскіх астрогах, Андрэя Ушакова, Уладзіміра Рагуцкага, якія загінулі на франтах Вялікай Айчыннай вайны.

Прыняты закон аб нашай роднай мове, культуры. Але туга, дужа туга ўспрымаюць яго многія магілёўскія службоўцы. Адсюль замест павагі — знявага Аляксея Пысіна, іншых дзеячаў беларускай культуры, дый усіх прыхільнікаў роднага слова.

Іван АНОШКІН.

г. Магілёў.

Нашы публікацыі

М. ЗАБЭЙДА

«ПЕСНЯ СТАЛА МАЁЙ МОВАЙ...»

(«Мастацтва за мір»)

У ТОЙ ЧАС бедныя людзі радзіны не спраўлялі, дык не дзіўлюся маці, што калі мінула паўсотні год, яна, хворая, і не памятала такога «важнага» факта, як маё нараджэнне. А мне гэта, праўду кажучы, і не баліць. Цяпер, калі людзі хутка паляцяць на іншыя планеты (а можа, і нараджацца там будуць), хопіць ведаць, што я нарадзіўся на зямлі, а дзеля папер-дакументаў — у вёсцы Несцяровічы, дзе нарадзіўся і мой бацька. Магу хіба яшчэ дадаць, што мая бабуля Антаніна — маці маёй маці — яшчэ хадзіла на паншчыну, аб якой мне расказвала жахлівыя рэчы.

А цяпер зноў вернемся да вучобы. Галоўчыцкую школу я скончыў у 1914 годзе. Падрыхтаваўшыся за лета, восенню паехаў з Ванем Урбановічам у Маладзечна, каб здаваць конкурсныя экзамены ў настаўніцкую семінарыю. На станцыі ў Ваўкавыску першы раз у жыцці ўбачыў поезд з паравозам, а калі ён свіснуў, душа ў мяне ёкнула ў пяткі.

Экзамены вытрымаў.

Цягніком чацвёртага класа вярнуўся ў Ваўкавыск, а адтуль з торбаю і ботамі за плячыма, пехатою, босы ішоў 45 кіламетраў дахаты. Маці, убачыўшы мяне, абрадавалася і занепакоілася, даведаўшыся аб маім паступленні на вучобу: «Як жа ты, сынок, там будзеш адзін?» Я і сам быў засмучоны. Ваня, старэйшы і разумнейшы, праваліўся на экзамене, і мне прыходзілася «ісці ў свет» аднаму. І пайшоў. Пайшоў «у людзі».

У семінарыі дабіўся прыватнай стыпендыі — 45 рублёў у год. Пражыць на гэтыя грошы было немагчыма. Прыйшлося падрабляць урокамі «на даму» ды зацягваць папружку шчыльней. Іншыя хлопцы хадзілі ў сталоўку, дзе карміліся казённыя стыпендыяты, і даядалі там тое, што заставалася ў місах. Разы з два хадзіў і я з імі, але было надта брыдка падбіраць чужыя недаедкі — і я больш не пайшоў.

З маці (1912 г., Ружаны).

Я шукаў іншага выйсця са свайго цяжкага становішча. Стараўся вучыцца як мага лепш, каб атрымаць казённую стыпендыю — 180 рублёў у год. Зубрыў многа, апрача вучобы, нічога не бачыў. І дабіўся свайго: на экзаменах у канцы навучальнага года атрымаў права на поўную стыпендыю. Парадаваліся мы з маці, але не надоўга: да нас набліжаўся фронт першай сусветнай вайны. Нам сказалі эвакуіравацца. «Не надоўга» — запэўнялі. Пасля трохмесячнага блукання ля фронту нас, бежанцаў, змардаваных бадзяннем, голадам і хваробай, пасадзілі ў Мінску ў «цяплушкі», у якіх ледзь вытрывалі ад марозу, і павезлі на ўсход. Вазілі доўга, пакуль не высадзілі ў Тамбоўскай губерні каля сяла Ілавайскага.

Маці з братам Валодзем засталіся на месцы, а я з кошыкам за плячыма ізноў пайшоў у свет шукаць шчасця. Дабраўся аж да Пензы. І неяк даведаўся, што ў горадзе ёсць настаўніцкая семінарыя, я пайшоў туды, і мяне, як казённага стыпендыята, залічылі на вучобу. Пасля, як высветлілася, што Маладзечанская настаўніцкая семінарыя эвакуіравана і знаходзіцца ў Смаленску, мяне накіравалі вучыцца туды.

Памяшкання свайго семінарыя не мела, і мы займаліся ў другую змену ў гімназіі Вароніна. Жыць было вельмі цяжка. Адной стыпендыі не хапала, а грошы абясцэньваліся. Хлеба з мякінай і таго часта нельга было дастаць. Студэнты перабіваліся хто як мог.

У 1917 г. удзельнічаў у дэманстрацыях, разам з усімі хадзіў па вуліцах, насіў лозунгі з рэвалюцыйнымі плакатамі, крычаў «Далоў цара!»

У 1918 г. скончыў семінарыю і выехаў у Сібір, дзе ў эвакуацыі знаходзілася мая адзіноная маці (брат Валодзя памёр). Маці знайшоў у сяле Бароўскім Барнаульскага павета. Адразу ж падаў прашэнне ў аддзел народнай асветы, і мяне прызначылі настаўнікам у сяло Усць-Калманскае, што каля Барнаула.

Праца была цяжкая, але цікавая. Я арганізаваў там «Калманскае культурна-асветнае таварыства». Мяне, васемнаццацігадовага хлопца, выбралі старшынёй. Праводзілі з сялянамі гутаркі на розныя тэмы, чыталі лекцыі, ставілі п'есы. У мяне многа было запалу. Сам я і іграў і спяваў. Так я прапрацаваў адзін год.

Але на свеце было неспакойна. Бушавала грамадзянская вайна. Яе віхуры дакаціліся да ціхага сяла Калманскага і зрушылі мяне з месца. У выніку я апынуўся ў 1920 годзе ў Харбіне.

На станцыі «Пагранічная» Кітайскай усходняй чыгункі атрымаў пасаду настаўніка. Настаўніцкі персанал быў неаднародны, дзяліўся на рэвалюцыйных і рэакцыйных. Я быў з першымі. Мы прайгралі, і я страціў пасаду. Працу знайшоў у Вэйшахэ — на маленькай станцыі той жа Кітайскай усходняй чыгункі — як настаўнік ад бацькоў. Праз два гады за добрую працу быў пераведзены ў Харбін.

Тут я сістэматычна пачаў працаваць над пастаноўкай голасу. Са мной стала займацца прафесар Юлія Канстанцінаўна Плотніцкая — былая супрацоўніца Шаляпіна — чалавек ужо пажылога ўзросту, але яшчэ добрая артыстка і педагог.

Як ужо пісаў, спяваць я любіў з дзіцячых год: пачынаў з маці, потым у школах выбіралі мяне ў салісты дзіцячага хору, спяваў у царкве і нават на вяселлях. Мог нядрэнна іграць на розных інструментах: на балалайцы, мандаліне, гітары, гармоніку і нават на скрыпцы, якая засталася ад бацькі. А на губным гармоніку я мог зайграць усё, што толькі пачуў. (Зусім Сымон-музыка!). Памятаю, у маёнтку Шайпякі, дзе працавала мая маці, быў раяль. Калі прыязджалі панскія дочкі (яны больш жылі ў Ваўкавыску) і пачыналі іграць, я гадзінамі стаяў за плотам і слухаў, забыўшыся аб усім на свеце. Добра ці дрэнна яны іграл — не ведаю, але гэта была першая музыка, якую я пачуў на раялі. **(Цяпер, калі радыё грае больш, чым трэба, мае пачуцці таго часу можа трудна нават зразумець).** Калі паны ад'язджалі з двара і маці дазваляла мне сцерці з раялю пыл, я не мог устрымацца і пачынаў падбіраць на раялі (спачатку адным пальцам) знаёмыя мелодыі народных песень. Маці дзівілася і радавалася, але, баючыся непрыемнасцей, адганяла мяне прэч.

Шкада, што не нарадзіўся я год 50 пазней, магло б быць з мяне нешта лепшае. Як цяпер у нас вышукваюць таленты! Як ім дапамагаюць развівацца! Як іх падтрымліваюць! Я сам удзельнічаю ў камісіях па адбору здольнай музычнай моладзі. І тады свет быў не без добрых людзей, але цяпер усё робіцца арганізавана.

У настаўніцкай семінарыі спевы былі пастаўлены добра: знаёмілі з тэорыяй музыкі, быў свой хор, вучылі дырыжыраваць. Таму к Плотніцкай я трапіў, маючы некаторую падгатоўку ў гэтай галіне. Аднак гэтага для сур'ёзнай музыкі было мала, і я пачаў у Тамашынскай вучыцца на раялі, а з дырыжорам Меттэрам праходзіў курс гармоніі.

Праца ішла добра, і аба мне сталі гаварыць як аб вельмі надзейным маладым спеваку. Так я займаўся два гады. Але чым далей займаўся, тым менш быў задаволены сабой, тым менш у сябе верыў. Стамляла праца ў школе, асабліва моцна адбіваючыся на горле, і я не мог спяваць так, як хацеў, так, як сабе ўяўляў.

Урэшце ад кар'еры спевака адмовіўся. Гэта было зрабіць мне нялёгка, бо са спевамі я даўно моцна зросся.

Каб нешта рабіць, паступіў на эканамічнае аддзяленне юрыдычнага факультэта Харбінскага універсітэта. Заняткі там праходзілі ў другую змену. я працаваў у школе — у першую. Такім чынам я мог спалучаць адначасова работу з вучобай. Працаваў многа і вучыўся добра. Усё гэта было для розуму, а сэрца ўсё ж заставалася ў песні. Сэрца хацела спяваць.

Ад вялікае нагрузкі арганізм не вытрываў, здароўе падарвалася. Урачы знайшлі сэрца хворым і самае небяспечнае — аказаліся хворымі лёгкія. Даведаўшыся, што брат памёр ад сухотаў, дактары параілі неадкладна лячыцца. І ўсё ж вучобу ва універсітэце не пакінуў. Працаваў асцярожней, меней і сам, паціху, але ішоў наперад. Не пакінуў і спевы.

У 1929 годзе скончыў універсітэт, і мне прапанавалі асістэнтуру, а я накіраваўся ў оперу. Думалі, што звар'яцеў, не хацелі верыць.

А пачалося ўсё так.

У 1929 г. на Кітайскай усходняй чыгунцы адбыўся канфлікт паміж кітайскай і савецкай часткай праўлення. У знак салідарнасці Савецкаму Саюзу была аб'яўлена неафіцыйная забастоўка, у якой удзел прыняла і мая школа. Улады, варожа настроеныя да Савецкага Саюза, пазбавілі нас жалавання. Што было рабіць? Я язджаў у Італію падшукаць добрага прафесара спеваў для Масквы. Собінаў быў надзвычай прыемны і добразычлівы. Запрасіў мяне да сябе. Мы доўга гутарылі, а потым спявалі. Калі я праспяваў арыю Ленскага, ён сказаў: «Как вы припоминаете мои лучшие молодые годы!» Даў мне свой адрас і сказаў: Совершенствуйтесь и приезжайте к нам в Москву».

Усё, аднак, склалася інакш. Нездарма кажуць: «Человек — раб обстоятельств». Я так працаваў многа, што ў лёгкіх зноў пачаўся працэс. Давялося лячыцца. Паехаў у Сан-Рэмо. Паправіўшы трохі здароўе, вярнуўся ў Мілан і працягваў спяваць. Я спяваў на італьянскай мове ў операх «Травіята», «Рыгалета», «Фаўст», «Севільскі цырульнік» і інш. Мяне запрашаюць выступаць у канцэртах. Крытыка аб маіх выступленнях была вельмі станоўчая.

(...)«Тэнар Міхаіл Забэйда пацвердзіў поспехі, якія меў нядаўна на сваім артыстычным турнэ і якія паўторацца вечарам 31-га г. м. у Мілане. У Забэйды адразу адчуваецца пяшчотная душа славянскага мроючага паэта. Яго тонкая інтэрпрэтацыя захапляе слухачоў. Яго голас — гэта дасканалы інструмент, які здольны перадаць усе пачуцці, змешчаныя ў вершы, нават і тады, калі спявае на чужой мове... Гэта пацвердзіла публіка сваімі апладысментамі, дамагаючыся паўтарэння». 26. 10. 1934 — Como — піша: «Міхаіл Забэйда — тэнар надзвычайнай якасці, артыст высокай культуры, голас мяккі, гнутні, падобны голасу свайго суайчынніка Собінава, інтэрпрэтаваў з выключнай чуллівасцю тонкія кампазіцыі, выклікаўшы захапленне ва ўсіх слухачоў».

І яшчэ (...) Мілан, 15. 06. 1935 г. у допісе «Поспехі тэнара М. Забэйды».

«У галіне канцэртнага і опернага жыцця трэба адзначыць тэнара Міхаіла Забэйду, які нядаўна выступіў з канцэртам у Міланскай кансерваторыі Вэрдзі. Забэйда і на гэты раз прадэманстраваў свае выдатныя якасці — галасавыя і інтэрпрэтацыйныя. Трудная праграма была выканана належным чынам, пахвальна (...).

Гэты малады артыст прыехаў у Італію ў 1932 г., да гэтага спяваў за граніцай у розных рускіх і італьянскіх операх («Севільскі цырульнік», «Рыгалета», «Фаўст» і інш.).

На музычным фестывалі ў Варэзе Забэйда выступіў з вялікай праграмай, спяваючы ў арыгінальнай мове творы рускіх,

Потым я спяваў Сінадала з оперы Рубінштэйна «Дэман», затым пайшлі і іншыя ролі. Да 1932 года я праспяваў 15 роляў. Гэта былі: Фаўст з «Фаўста» Гуно, Альфрэд з «Травіяты» Вэрдзі, герцаг з «Рыгалета» Вэрдзі, Алмавіва з «Севільскага цырульніка» Расіні, князь з «Русалкі» Даргамыжскага, цар Берандзей з «Снягурачкі» Рымскага-Корсакава, Лыкаў з «Царскай нявесты» Рымскага-Корсакава, Уладзімір з «Князя Ігара» Барадзіна, Уладзімір з «Чарадзейкі» Чайкоўскага, Пінкертон з «Мадам Батэрфляй» Пучыні, Рудольф з «Багемы» Пучыні і іншыя.

Паралельна я працаваў і ў школе, куды зноў вярнуўся пасля забастоўкі.

Маё выступленне ў оперы мела поспех. Крытыка была добрая: я пачынаў верыць у сябе, захацелася і надалей удасканальвацца ў спевах.

Увесь гэты час я жыў вельмі скромна, бо збіраў грошы для паездкі ў Італію, аб якой марыць кожны добры спявак.

У 1932 годзе я атрымаў візу, уволіўся са школы, пакінуў тэатр і паехаў у Мілан.

У Мілане я сустрэўся са спявачкай Анджэлікай Краўчанка, якая раней была ў Харбіне. Яна пазнаёміла мяне з выдатным майстрам спеву Фэрнандам Карпі, які раней альтэрнаваў з Карузам і іншымі славутымі спевакамі.

З Карпі я працаваў амаль кожны дзень. Маэстра дзівіўся з маёй працавітасці, хваліў мяне і паказваў іншым вучням. Цікава, што потым на лекцыі спеваў прыходзілі вучні-іншаземцы да мяне, і я сапраўды дапамагаў ім, бо ад прыроды меў добрае вуха і адразу чуў, каму чаго не хапае і чым трэба дапамагчы. Сам жа вельмі ўважліва слухаў выдатных спевакоў, якія выступалі ў Мілане, і, зразумела, многаму ад іх вучыўся. Тут я першы раз пачуў Шаляпіна. Ён спяваў Дона Базіліа ў тэатры Ла Скала. Поспех быў такі вялікі, што артыст вымушаны быў бісіраваць арыю аб клевеце, хоць у гэтым тэатры бісы не дазваляліся. (У кнізе аб Шаляпіне, выдадзенай у Савецкім Саюзе, якраз ёсць здымак з гэтага выступлення (т.2, стар.464).

У Мілане я сустрэўся і са слаўным Собінавым, які прыязджаў у Італію падшукаць добрага прафесара спеваў для Масквы. Собінаў быў надзвычай прыемны і добразычлівы. Запрасіў мяне да сябе. Мы доўга гутарылі, а потым спявалі. Калі я праспяваў арыю Ленскага, ён сказаў: «Как вы припоминаете мои лучшие молодые годы!» Даў мне свой адрас і сказаў: Совершенствуйтесь и приезжайте к нам в Москву».

«Вечар, прысвечаны 90-годдзю з дня нараджэння выдатнага беларускага спевака, нястомнага прапагандыста роднай песні, першага беларуса, што спяваў на сцэне «Ла Скала», — значылася ў запрашальным білеце. Для многіх наведвальнікаў Клуба сяброў оперы, што рэгулярна сустракаюцца ў рэспубліканскім Доме работнікаў мастацтваў, гэта была сенсацыя. Яны адкрылі для сябе новае імя. А галоўнае — голас, перапісаны з іншаземных пласцінак, голас дзівоснай цеплыні, прыгажосці...

Прыйшлі на вечар, наладжаны СТД, СП, Цэнтральным дзяржархівам-музеем літаратуры і мастацтва БССР, і тыя, хто асабіста ведаў М. Забэйду, перапісваўся з ім, хто прыкладаў намаганні, каб захаваць ягонае імя, ягонае мастацтва ў гісторыі беларускай культуры. Супрацоўнікі архіва наладзілі змястоўную выстаўку. Вядучым вечара быў У. Шаліхін, які вёў канцэрты спевака ў Мінску ў 63 годзе. Нібы старонкі дакументальнай кнігі, гучалі з магнітнай стужкі ўспаміны самога М. Забэйды, згадкі ды развагі пісьменнікаў С. Грахоўскага, А. Лойкі, С. Панізніка, дачкі Р. Шырмы Алены Рыгораўны, навукоўцаў Л. Мірачыцкага, І. Шішчанкі, Н. Батурыцкай.

Дарэчы, імя Н. Батурыцкай успаміналася і ў мінулым нумары «ЛіМа». Яна без малога год была на стажыроўцы ў Празе, часта наведвалася да «дзядзькі Міхася», а потым з ім перапісвалася. На вечар яна прыйшла з букетам лугавых красак — для Забэйды... А крыху раней пабывала ў рэдакцыі, расказала нямала ды прапанавала вось гэты допіс.

ПЕРАЧЫТВАЮ гэтыя словы — з пісьма Міхала Іванавіча Забэйды-Суміцкага ад 8.12.1967 г. Тут жа ён дзеліцца радасцю: і ў гэтым годзе атрымаў ад Чэшскага музычнага фонду прэмію за сістэматычную і каштоўную інтэрпрэтацыю песень сучасных чэшскіх кампазітараў...

Разгортваю наступны ліст: «Канцэрт у Лугачовіцах 31 ліпеня адбыўся з надзвычайным

(Працяг Пачатак у № 24).

французскіх, іспанскіх і іншых кампазітараў, выклікаючы агульнае захапленне.

Італьянскія газеты параўноўваюць Забэйду з Ціта Скіпай за асалоду і хараство яго спеву. Іншыя зноў параўноўваюць яго з вялікім спеваком рускім Собінавым, што дазваляе прарочыць Забэйдзе вялікую артыстычную будучыню». (Пры артыкуле змешчаны мой здымак).

У гэты час атрымаў з Шэйпіч вестку аб тым, што маці мая, якая пасля вайны вярнулася на радзіму, моцна хварэе, хоча мяне бачыць. Прыйшлося расстацца з Італіяй і ехаць на радзіму. (Праўда, я ўжо быў тады ў Польшчы). З маці я не бачыўся 16 гадоў. Пры сустрэчы было многа радасці і слёз.

На сезон 1935—36 гг. заключыў кантракт з Познанскаю операю. Там усё спяваў па-польску. Пашырыў свой рэпертуар новымі операмі: «Унос з Сэраю» Моцарта, «Юлій Цэзар» Гендэля, «Барыс Гадуноў» Мусаргскага і інш., у якіх спяваў галоўныя тэнаравыя ролі. Адносіны да мяне дырэктара оперы былі не лепшымі, бо я не ўтойваў таго, што я беларус.

Палітыка польскага ўрада тады была такая: «У Польшчы няма беларусаў». Вось адзін з фактаў гэтых адносін. Ставіцца «Яўгеній Анегін» Чайкоўскага. Маю спяваць Ленскага. Раптам даведваюся, што маю ролю даюць другому. Проці ражна не папрэш! Я мусіў прымірыцца, бо такі быў загад дырэктара. Настаў час прадстаўлення. Сяджу у зале сярод публікі, гляджу, слухаю. Тэнар спявае выдатную арыю «Куда, куда вы удалились». Напярэдадні на рэпетыцыі дамовіліся, што гэту арыю «тэнар» (паляк) будзе бісаваць (кажу «тэнар», бо Ленскага я там не бачыў). Артыст адспяваў арыю, але зала не выказала жаданне слухаць паўторна арыю, «біса» ніхто не падаў. А калі «тэнара» «застрэлілі» на сцэне, раптам у наступіўшай цішыні з залы пачуўся голас: «Добра яму гэтак!»

На другое прадстаўленне прапанавалі мне спяваць партыю Ленскага. Папярэдніх рэпетыцый з аркестрам не было, і, зразумела, «біс» не прадбачыўся. Але калі скончыў арыю Ленскага, воплескам не было канца. Дырыжор спрабаваў некалькі разоў іграць далей і кожны раз быў змушаны спыніцца: публіка прасіла паўтарыць арыю. Хочучы не хочучы, дырыжор мусіў ізноў іграць уступ да арыі, якую я нечакана праспяваў два разы. «Нарэшце, маем Ленскага»,— гаварылі потым слухачы.

У такіх умовах мне працаваць было трудна, і я пераехаў у Варшаву.

На маё выступленне па радыё адгукнулася Вільня. Рыгор Раманавіч Шырма запрасіў мяне на канцэрт. Як вядома, беларуская моладзь на канцэрце насіла мяне на руках.

Там я пазнаёміўся і з Максімам Танкам. Гэтыя сустрэчы дапамаглі мне ўтрымацца на той дарозе, па якой я іду і сёння. **Гэта дарога не абяцала вялікае кар'еры, але яшчэ больш зблізіла мяне з роднаю песняю — песняю маёй маці, давала магчымасць распаўсюджваць гэту песню, несці яе ў свет, паказваць яе красу, даваць людзям радасць і ўзбагачаць гэтай песняю сусветную культуру.**

Як ставіліся ў Польшчы да беларускай песні? Па-рознаму. Спачатку смяяліся, што Забэйда — спявак італьянскай школы — уключыў у канцэртную праграму мужыцкую песню. А потым? Калі пабачылі, што на мае канцэрты не толькі ідуць слухаць, але прыязджаюць за дзесяткі кіламетраў, каб пачуць у маім выкананні мужыцкую песню, тады сталі мне забараняць спяваць у канцэртах беларускія, а разам і рускія песні. А кар'ера вырысоўвалася сапраўды вельмі «спакуслівая». Адзін раз я спяваў у польскім радыё праграму, якую перад гэтым выконваў славуты Кепура (Сімфанічным аркестрам дырыжыраваў гр. Фітэльберг). І вось пасля майго выступлення між іншым напісалі: «У Забэйдзе-Суміцкім Кепура знайшоў небяспечнага канкурэнта». Знайшліся такія, што ўгаварвалі мяне адмовіцца ад беларускай песні. Я быў няўмольны. Тады мне замест кар'еры пабяцалі Картузскую Бярозу...

Выдатныя майстры, нават з ліку шавіністаў ставіліся да мяне добра (я ж спяваў і польскія песні!). Былі такія палякі, якія і падтрымлівалі мяне і дапамагалі мне. Да іх належаў, напрыклад, дырэктар польскага (варшаўскага) радыё Рудніцкі.

Памятаю такі выпадак. Спаткаў ён мяне на вуліцы. Прывіталіся. Глядзіць на мяне і кажа: «Чаго гэта вы сумны? Вясна ж на дварэ! Калі ў нас спяваеце?» — «Не ведаю!» — кажу. — «Як гэта?» — «Ды ні адзін з вашых рэферэнтаў не прыняў маю праграму на гэты месяц». — «Вось як! Хадзем са мною». Зайшлі ў яго кабінет. Ен паклікаў сваіх рэферэнтаў: «Калі ў вас спявае Забэйда?» — спытаўся. — «У нас не выходзіць»,—адказалі.—«Дык вы хочаце лепш вянкі на труну несці, як гэта было нядаўна з Шыманоўскім?» — «Можа, неяк умясцім Забэйду», — сказалі адзін за другім.

Добра ставіўся да мяне і цяперашні дырэктар Варшаўскага радыё Раман Ясінскі. Нават нядаўна Варшава перадавала мой канцэрт у запісе на грампласцінках.

Мае выступленні па Варшаўскаму радыё трансліравалі Парыж, Лондан, Прага, Нью-Йорк і іншыя радыёстанцыі. Пасля выступленняў атрымліваў з розных гарадоў пісьмы, а лонданскі радыёчасопіс змясціў мой здымак і артыкул пра мяне, азаглавіўшы: «Спявак, які сам сябе зрабіў». Польскія кампазітары прысылалі мне свае творы з просьбай, каб я выконваў іх у сваіх канцэртах. Дзякуючы падтрымцы лепшых польскіх людзей, я наспяваў на грампласцінкі першыя ў Заходняй Беларусі і наогул у Польшчы беларускія народныя песні.

Гэта былі: 1) «Малады дубочак», 2) «Чаму мне ня пець». 3) «Ляціць сарока», 4) «Конь бяжыць, зямля дрыжыць», 5) «Шчука — рыба ў моры», 6) «Ой, рана-рана куры запелі», 7) «Рабіна-рабіначка», 8) «Як памёрла матулька», 9) «Ой у лесе-лесе». 10) «Лявоніха» ў апрацоўцы Туранкова, Красева, Грэчанінава і Казуры. Аднак, каб гэтыя грампласцінкі выпусціць, мне давялося таму-сяму «пазычыць» «пару злотых» (беззваротна). Але грампласцінкі ўдаліся і зрабілі сваю справу.

Песні карысталіся такім поспехам, што ў Баранавіцкім радыё іх забаранілі перадаваць. У гэты ж час наспяваў на грампласцінкі і дзве польскія народныя песні: «Куявяк» і «Одэйдзь, Ясю, од okенка» ў апрацоўцы Новавейскага. Цікава, што калі прыехала з Японіі этнаграфічная камісія, каб выбраць нешта з польскага фальклору, то найбольш захапляліся гэтымі польскімі песнямі ў маім выкананні і ўзялі грампласцінку з сабой.

Нягледзячы на ўсе перашкоды, я стаў у Польшчы, як убачыце з крытыкі, жаданым спеваком. У маім рэпертуары былі арыі з опер, араторыі, кантаты, песні і рамансы розных народаў і стыляў — ад класікаў да сучасных кампазітараў. Выступаў многа, выязджаў у гастрольныя паездкі за граніцу.

(Заканчэнне будзе).

М. ЗАБЭЙДА — вучань Маладзечанскай настаўніцкай семінарыі.

Князь Сінадал з «Дэмана».

Пісьменнік, нарком

Споўнілася 110 гадоў з дня нараджэння Язэпа Дылы — бальшавіка, члена першага рабоча-сялянскага ўрада Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі. Яшчэ ў час падзей 1905 года ён вёў рэвалюцыйную работу. Тады ж пачаў і літаратурную дзейнасць. У рэвалюцыю 1917-га ўвайшоў актыўным змагаром бальшавіцкай сацыял-дэмакратычнай партыі. Шмат часу ўдзяляў культурнай і асветніцкай дзейнасці. Адзін з нямногіх, хто заставаўся жывы пасля крывавай хвалі расправў з «ворагамі» народа. У 1931 годзе быў сасланы ў Саратаў, дзе і памёр 7 красавіка 1973 года. Пасля рэабілітаваны.

Язэп Дыла пакінуў багатую літаратурную спадчыну, якая яшчэ і сёння — нявывучаны архіпелаг. І калі беларускамоўная частка хоць крыху вядома сённяшняму чытачу, то рускамоўная практычна невядома нават спецыялістам.

Язэп Дыла — пачынальнік гістарычнага жанру ў нашай літаратуры. Не так цяжка чытаць напісанае ім, як разумець. Сапраўдныя мастацкія тэксты невычэрпныя і маюць некалькі сэнсаў, якія мы разумеем, на жаль, са значным спазненнем. Крытыкі скептычна заўважаюць: раман «На шляху з варагаў у грэкі», маўляў, не закончаны. Магчыма, у гэтым не загана яго, а вартасць. Жыццё не дало Язэпу Дылу фактычнага матэрыялу для заканчэння рамана, ён пакінуў дапісваць яго не на паперы, а ў жыцці наступным пакаленням сваіх паслядоўнікаў.

Раман пачаў пісацца ў 1944 годзе, калі для Беларусі прыйшла вясна — вызваленне ад фашысцкай акупацыі. Пачынаецца ён апісаннем паводкі. Аўтар спадзяваўся, што гэта вясновая паводка змые бруд з роднай зямлі, але рака беларускага жыцця працягвала доўгі час знаходзіцца пад тоўстым ільдом сталінскай зімы.

Дыла меў магчымасць вярнуцца на Бацькаўшчыну ў час хрушчоўскай адлігі. Але, відаць, ён не ўскладаў на яе вялікіх спадзяванняў. Так яно і аказалася. Хоць і пражыў ён 93 гады, не змог дацягнуць да сапраўднай вясны, да красавіка 1985 года.

Будучы ў ссылцы, Дыла працягваў друкаваць свае творы на Беларусі аж да 1937 года. Як яму гэта ўдавалася рабіць? Ен быў вялікі канспіратар, выкарыстоўваў каля 20 псеўданімаў, у тым ліку і жаночы. Дапамагалі яму і былыя паплечнікі. Але ў крывавых гадах яны палеглі ў Курапатах ці іншых месцах, дапамагаць не стала каму.

Хваля рэпрэсій паўторна закранула і Я. Дылу. Ен быў у 1937 годзе арыштаваны як «вораг» народа. Але палітычным працаўнікам не ўдалося ўзяць 57-гадовага Дылу нават «яжовымі» рукавіцамі. Нягледзячы на катаванні, ён не прызнаў сфабрыкаваныя абвінавачванні.

Мне расказвала Ганна, дачка Дылы, як адбывалася вочная стаўка Дылы з Я. Лёсікам, таксама актыўным удзельнікам сацыял-дэмакратычнага руху ў Беларусі. Яжоўцы не змаглі зламаць Дылу, але выбілі катаваннямі з Лёсіка паказанні аб тым, што быццам яны разам уваходзілі ў адну контррэвалюцыйную арганізацыю, якая хацела звергнуць Савецкую ўладу. Дыла спытаў Лёсіка: «Як ты мог сказаць такое?» — «Даруй, Язэп, мяне так білі, так білі...» І прыкрыў рукою вочы ці ад сораму, ці ад слёз.

Лёсіка зламалі і расстралялі, а Дыла вытрымаў катаванні і быў выпушчаны на «свабоду».

Мяркуйце самі, як жыў ён у саратаўскай ссылцы апошнія гады. Нягледзячы на пазнейшую рэабілітацыю, персанальнай пенсіі не меў, атрымліваў толькі 45 рублёў. Дачка Дылы расказвала, як яна хадзіла на рынак купіць кавалак курацiны на суп старому хвораму бацьку. На цэлую курыцу не было грошай...

Я атрымаў ад Язэпа Дылы некалькі фотаздымкаў. На адным з іх ён быў у звычайнай сялянскай ватоўцы, што сведчыла аб яго беднасці. У тыя дні я напісаў абуральнае пісьмо ў Вярхоўны Савет БССР з патрабаваннем звярнуць увагу на старога бальшавіка, былога наркома працы Беларусі, які беспадстаўна быў рэпрэсіраваны.

Адказу не было. Але неўзабаве атрымаў ліст ад самога Я. Дылы. Ен паведамляў, што нечакана атрымаў з Мінска 100 рублёў і раіўся, што з імі рабіць. Я растлумачыў яму сітуацыю. Дыла здагадаўся, што мяне абурыла. «Я куплю за гэтыя грошы зімовае паліто», — быў яго адказ. Але якое зімовае паліто можна купіць за 100 рублёў?

Не хочацца канчаць гэтыя юбілейныя нататкі на сумнай ноце. Дыла зрабіў сваю справу. У самы змрочны для нас час сваёй непахіснай мужнасцю ён рабіў усё магчымае для выратавання гонару беларускай нацыі і гонару беларускай Кампартыі. Памяць аб пісьменніку і адным з заснавальнікаў беларускай дзяржавы не павінна сцерціся ў народзе.

Р. РОДЧАНКА.

г. Слуцк.

«САД ЗАСАДЗІЎ, ПЛЁН ЗБІРАЙЦЕ ВЫ, МАЛАДЫЯ»

поспехам. Спяваў 25 песень на васьмі мовах амаль 2 гадзіны і без перапынку. Народу было больш, чым месц у зале, так што шмат людзей стаялі. Вытварыўся такі настрой, што слухачы не хацелі адыходзіць, і мне спявалася так, як мала калі бывае. Не толькі адспяваў вялікую інтэрнацыянальную праграму, але быў змушаны яшчэ прыдаваць.

Адзначыў і юбілей Янкі Купалы. Зрабіў вольны пераклад на чэшскую мову яго верша «Ты прыйдзі» і заспяваў раманс М. Чуркіна, напісаны на гэты верш, у арыгінале. (Паведаміў мне пра гэта спявак 20.9.1972 г.).

Але пісьмы ўжо былі пасля, ім папярэднічалі сустрэчы нашы з дзядзькам Міхалам у Празе і яе прыгарадах на працягу больш чым васьмі месяцаў. Гэта было рэдкае шчасце — слухаць яго, гутарыць з ім, далучыцца да таго духу, што панаваў у маленькім пакойчыку на вуліцы Польскай, 12, завалены нотамі, кнігамі, часопісамі, пісьмамі і фотаздымкамі людзей, якімі Міхал Іванавіч ганарыўся. Раяль, вялікі радыёпрыёмнік, сервант, стол, канапа. Старая, як Прага, люстра, смешная лямпа. Мяне ўразіла мноства вянкоў са стужкамі — падарункі ўдзячных слухачоў. Тут і карціны ягоных вучняў, і бюст спевака, зроблены жонкай аднаго з іх, і букет старых кветак, і свежая лілея.

На стале фотаздымкі, на якіх Міхал Іванавіч з Рыгорам Раманавічам Шырмай у Карлавых Варах, ён жа з Ларысай Пампееўнай Александроўскай, Піменам Панчанкам і Язэпам Семяжонам у Мінску пад час гастроляў 1963 года. Пісьмы ад Ніла Гілевіча, Сяргея Грахоўскага, Лявона Акаловіча, Славы Рагойшы, Максіма Танка, Янкі Брыля, Сцяпана Гаўрусёва і шмат ад каго яшчэ.

8 лістапада 1965 года, пад час майго першага наведвання пакойчыка з шыльдачкай Zавеjdа, гаспадар яго чытаў кастрычніцкую кніжку «Полымя», дзе друкаваўся раман Івана Мележа «Подых навальніцы». «А тыражы нашых часопісаў усё ж растуць, — не без гордасці казаў Міхал Іванавіч, — хоць памалу,але растуць».

Мы доўга гутарылі ў той вечар. «Як жывеце-маецеся?» — выціснула я зусім недарэчнае пытанне. — «Я не жыву, я працую», —сказаў майстар і паказаў на стосы нот, кніг. Не скажу, што быў ён чалавек просты. Так: свой, даступны. Разам з тым, вялікі мастак, працаўнік, пан прафесар, якому вучні носяць кветкі, чые слухачы не стрымліваюць слёз.

Напярэдадні майго візіту Міхал Іванавіч вярнуўся з гастрольнай паездкі ў Польшчу, адкуль прывёз пласцінкі з запісамі беларускіх і іспанскіх народных песень. Я папрасіла пракруціць. «З задавальненнем», — дзядзька Міхал паказаў, адкуль трэба чакаць голасу. Звычайна на канцэртах да сваёй (дакладней, матулінай) «Калыханкі» спявак падбіраўся паступова. Тут жа яна прагучала першай. «Яшчэ раз?» — пытае гаспадар. «Калі ласка, не трэба». Міхал Іванавіч не здзівіўся: «Ты не адзіная, хто просіць аб гэтым».

Пасля былі «жывыя» канцэрты ў Багданчы, Празе, Тоўшэме, якія без «Калыханкі», канешне ж, не абыходзіліся. Гучалі італьянскія, чэшскія, славацкія, рускія, украінскія, іспанскія, нямецкія і іншыя песні, але, на думку спецаў, сапраўды вялікім і адзіным у сваім родзе мастаком Забэйда-Суміцкі выявіў сябе ў песні беларускай.

«Беларускі летапіс» у 1937 г. пісаў: «Рускую народную песню Шаляпін узнёс да вышэйшага мастацтва. Тое ж зрабіў Забэйда-Суміцкі з беларускай народнай песняй. На канцэртах можна было бачыць, як публіка рэагуе на кожны яго рух, на кожны пераход чароўнага голасу мастака, які першымі гукамі авалодвае думкамі слухачоў і з яму ўласцівай лёгкасцю вядзе іх лабірынтам тонкага перажывання. Але трэба бачыць і адчуць, як канцэртная зала перажывае смутак песні «Малады дубочак», як дрыжыць і палае жарам маладосці пры песні «Ці грэх цябе любіць».

Так, М. Забэйда-Суміцкі — на рэдкасць інтэлігентны і музыкальны тэнар, са славутай падрыхтоўкай італьянскай школы, з уладарным талентам, тэмпераментам. Крытыкі адзначалі незвычайную патрабавальнасць майстра да сябе: маўляў, ён працуе над кожнай песняй так, быццам... не мае голасу.

«Забэйда ніколі не стараўся аблегчыць сабе свае выступленні. Ен не гнаўся за папулярызацыяй сваіх мэтаў, за імгненным поспехам ці танным эфектам. Ен заўсёды ставіў перад сабой вялікія задачы. Чым яны былі больш цяжкія, з тым большым натхненнем, энергіяй і жарам ён да іх прыступаў—якасць, уласцівая вялікім артыстам.

Рэпертуар спевака амаль бязмежны. Ен уключае вакальную літаратуру многіх нацыянальных культур ад штучных кампазіцый да народнай песні. Дзякуючы яму мы маем магчымасць знаёміцца з мастацтвам песні не толькі ўсіх славянскіх народаў, але і з песнямі народаў паўночных і раманскіх».

Можна было б яшчэ і яшчэ цытаваць сведчанні крытыкаў, музыказнаўцаў, дый лісты-разважы самога Міхала Забэйды-Суміцкага. Ягоная багатая спадчына толькі пачынае вывучацца і асэнсоўвацца ў нас на Беларусі. Дзякаваць лепшым часам — з'явілася першая тэлеперадача (21 студзеня 1989 г.), прагучалі песні беларускага майстра па радыё для ўсесаюзнага слухача, шэраг публікацый з'явіўся ў рэспубліканскім друку. Гэта толькі пачатак. Як бы парадаваўся яму наш славуты зямляк.

Надзея БАТУРЫЦКАЯ,
навуковец, член Саюза журналістаў БССР.

У наступным годзе спаўняецца 50 год гераічнай абароны Брэсцкай крэпасці. Да гэтай даты выдавецтва «Юнацтва» выпускае дакументальную аповесць Алеся Махнача «Камандзір Усходняга форта». Яе аўтар, удзельнік баёў у пагранічнай цытадэлі над Бугам, расказвае пра аднаго з тых, хто біўся да апошняга ў асаджанай ворагам крэпасці, — пра Героя Савецкага Саюза П. М. Гаўрылава.

У гадавіну пачатку Вялікай Айчыннай вайны прапануем увазе чытача старонкі з будучай кнігі.

За гадзіны да вайны

Пад спякотным сонцам па пыльнай палявой дарозе, падскокваючы на выбоінах, бяжыць легкавая машына. За рулём «эмкі» сядзіць малады чырвонаармеец, побач — чарнявы чалавек сярэдніх год, на пятліцах камандзірскай гімнасцёркі якога паблісквацюць дзве маёрскія «шпалы».

На граніцы, пад Сямяцічамі, ужо амаль месяц працуюць воіны трэцяга батальёна 44-га стралковага палка, якім камандуе маёр Пётр Міхайлавіч Гаўрылаў. На Кобрынскім умацаванні крэпасці жыве яго сям'я, знаходзяцца артылерыйскія батарэі часці, яе першы батальён, а на Цэнтральным востраве, які называюць Цытадэль, — штаб, палкавая школа, падраздзяленні другога батальёна.

Гаўрылаў спяшаецца, трэба вярнуцца ў крэпасць да абеда. У запісной кніжцы Пятра Міхайлавіча на старонцы пад датай «19 чэрвеня 1941 года» пазначана: «13.00 — сустрэча з лейтэнантамі — выпускнікамі Калінкавіцкага ваеннага вучылішча». Яны, шасцёра маладых пехацінцаў у новенькай камандзірскай форме, прыехалі раніцай.

Потым, у час сустрэчы, маёр Гаўрылаў раскажа ім пра складанае становішча на граніцы. За 1940 год на ўчастку Брэсцкага 17-га Чырванасцяжнага пагранатрада было затрымана 5392 парушальнікі дзяржаўнай граніцы.

«Фашысцкая Германія, з якой мы маем мірнае пагадненне, рыхтуецца да нападу, — падкрэсліў камандзір палка. — Амаль штодня нямецкія самалёты пералятаюць на нашу тэрыторыю. Збіваць самалёты-парушальнікі нам, наземным часцям і нашай авіяцыі, сурова забаронена. Запомніце! Калі хто-небудзь з вас альбо вашых падначаленых адкрые агонь па нямецкім самалёце, які парушыў нашу паветраную прастору, вы, згодна з асобым загадам, трапляеце пад ваенны трыбунал: без суда і расследавання прыгаворваецеся адразу да вышэйшай меры пакарання.

Па-за крэпасцю хадзіць у адзіночку забараняецца, — працягваў між тым Гаўрылаў. — Брэст у 1939 годзе быў часова заняты нямецкімі часцямі і, вядома, фашысты, пастараліся тут пакінуць сваю тайную агентуру. За адзін мінулы месяц у гарнізоне было сем выпадкаў, калі стралялі па нашых камандзірах».

Камандзір палка збіраўся штосьці дадаць да сказанага, але рэзка зазумерыў палявы тэлефонны апарат, які стаяў на стале. Маёра тэрмінова выклікалі ў парткамісію 2-й стралковай дывізіі. Там яму давялося выслухаць нямала непрыемных слоў.

«Камуніст Гаўрылаў, нам стала вядома, што вы сярод сваіх падначаленых правodзіце гутаркі, нібыта Германія збіраецца напасці на Савецкі Саюз, — сурова паглядзеў яму ў вочы член камісіі. — На свой лад каменціруеце «Паведамленне ТАСС», якое было 14 чэрвеня ў нашым друку, сееце трывожны настрой сярод камандзіраў і чырвонаармейцаў»...

Пачатак размовы быў для маёра нечаканы. Ён не мог стрымаць уласцівай яму прамадушнасці і адразу, перапыніўшы вайскоўца, пачаў даказваць сваю праваты: «Гітлер топча ўсе міжнародныя лагадненні. Няўжо вы думаеце, што ён не можа так паступіць з нашым пактам аб ненападзе?»

Той, што сядзеў за сталом, абарваў маёра:

«Свае тлумачэнні, камуніст Гаўрылаў, дасцё парткамісіі. 27-га чэрвеня роўна ў 9.00 павінны з'явіцца ў гэты кабінет. Будзе разглядацца ваша партыйная справа».

У суботу маёр збіраўся ўвесь дзень правесці на граніцы. Батальён палка завяршаў укладку бетона ў жалезную арматуру будучага дота.

Перад самым абедам з'явіўся пасыльны, які перадаў пакет. У ім загад: заўтра, 22 чэрвеня 1941 года ў 8.00 старшаму і сярэдняму камандному саставу 6-й і 42-й стралковых дывізій, падраздзяленні якіх расквартараваны ў Брэсцкай крэпасці, быць на артылерыйскім палігоне, дзе будуць праводзіцца тактычныя вучэнні розных родаў войск.

Пятру Міхайлавічу таксама прадпісвалася неадкладна вярнуцца ў крэпасць — прыязджае камандуючы 4-й арміі генерал-маёр Аляксандр Андрэевіч Карабкоў.

Днём Гаўрылаву не выпала часу, каб зайсці дахаты, праведаць хворую жонку Кацярыну Рыгораўну. Не ўдалося маёру і паабедаць. Разам з другімі камандзірамі ён суправаджаў генерала па крэпасці.

Усе падняліся з камандармам на назіральны пункт Цярэспальскай вежы. Чырвонаармеец, які тут нёс варту, далажыў генералу: на тым баку Заходняга Буга скапліваецца жывая сіла і баявая тэхніка фашыстаў».

Вечарам Гаўрылаў выйшаў з кватэры, каб прайсціся перад сном. На адкрытай пляцоўцы каля чырвонаармейскага клуба пачыналі паказ мастацкага фільма «Валерый Чкалаў». У час дэманстрацыі фільма дзяжурны па часці перадаў маёру, каб ён тэрмінова з'явіўся ў штаб дывізіі.

Пётр Міхайлавіч адразу паехаў. Там ужо сабраліся камандзіры часцей, чакалі камдыва генерал-маёра Івана Сідаравіча Лазарэнку. Ён павінен быў паведаміць пра нешта важнае. Але, аказалася, яго самога нечакана выклікаў камандуючы 4-й арміі.

А ў гэтыя мінуты з пагранічных застаў у штаб Брэсцкага 17-га Чырванасцяжнага пагранатрада ляцелі данясенні: на тым баку Заходняга Буга сканцэнтроўваюцца фашысцкія танкі, пяхота...

Позна ноччу Гаўрылаў вярнуўся ў крэпасць. Вырашыў праверыць, як нясе службу сутачны нарад палка.

Начальнік каравула малодшы лейтэнант Антон Цярэшчанка далажыў:

— Усё нармальна...

Пётр Міхайлавіч заглянуў і ў казарму. На трох «ярусных нарах спалі чырвонаармейцы, малодшыя камандзіры. Спалі неспакойна, хтосьці ў сне сіліўся падаваць баявую каманду, прахопліваўся...

...Дахаты Гаўрылаў вярнуўся апоўначы.

Не спалася. Праз расчыненае акно ў пакой плыла вусцішная цішыня. Здавалася, яна не дае чалавеку спакою. Пётр Міхайлавіч яшчэ і яшчэ раз успамінаў падзеі апошніх дзён — напружанне на граніцы, беспакараныя палёты фашысцкіх самалётаў над нашай тэрыторыяй. Было відавочна, што немцы падцягваюць да Буга ваенную тэхніку і жывую сілу... Маёр гнаў прэч цяжкія думкі, але яны зноў і зноў вярталіся.

За акном на ўсходзе пачынала пунсавець начное неба — ішла раніца новага дня. А на захадзе яно на нейкі міг раптам шуганула тысячамі бліскавіц, і праз лічаныя хвіліны ўздыбілася зямля крэпасці з яе збудаваннямі, усё патанула ў воблаках чорна-крывавага агню і дыму.

— Кацял Сына ў падвал! — крыкнуў Гаўрылаў і пачаў паспешліва надзяваць гімнасцёрку.

Кацярына Рыгораўна, схапіўшы за руку Колю, якому не было яшчэ і дзевяці год, кінулася за дзверы. Укрываючы сына ад абломкаў тынкоўкі і цаглін, якія сыпаліся са столі лесвічнай пляцоўкі, жанчына прыпынілася, хацела яшчэ раз зірнуць на мужа. З пісталетам у руцэ ён на хаду ўскінуў цераз плячо палявую сумку і выбег на вуліцу...

Алесь МАХНАЧ.

«ЗЯМЛІ ВЯЛІКАЙ СЫН, САЛДАТ!»

Гэтымі радкамі заканчваецца верш Якуба Коласа 1945 года «Зварот», прысвечаны воіну-пераможцу.

З першых дзён фашысцкай навалы пясняр, як вядома, стаў у шэрагі змагароў за свабоду і незалежнасць сацыялістычнай Айчыны. 24 чэрвеня 1941 года на старонках «Правды» публікуецца Коласаў верш-заклік «Шалёнага пса — на ланцуг!» Без перакладу, на беларускай мове. А неўзабаве «Космомольская правда» таксама ў арыгінале змяшчае верш «Душою і сэрцам мы з вамі, героі».

Уся літаратурная і грамадская дзейнасць Якуба Коласа ваеннага часу — гнеўны заклік да бязлітаснай барацьбы з лютым ворагам. Ён выступаў у друку, па радыё, прымаў удзел у рабоце Усеславянскага камітэта. Праца песняра той суровай пары ацэнена ордэнам Чырвонага Сцяга, медалямі, Дзяржаўнай прэміяй.

Коласу-воіну, Коласу-патрыёту прысвячаўся літаратурны чацвер, што прайшоў у музеі народнага паэта. Напачатку выступілі супрацоўнікі музея І. Курбека і М. Жыгоцкі, сын песняра Д. Міцкевіч. Затым слова ўзялі ўдзельнікі вайны — пісьменнікі П. Кавалёў, М. Татур, Л. Прокша.

З цікавасцю слухалі прысутныя дацэнта БДУ імя Леніна В. Путана. Ён гаварыў пра сына Якуба Коласа Юрку, свайго аднакурсніка, які загінуў на фронце.

Свае вершы на ваенную тэматыку прачытаў П. Прыходзька. У выкананні народнай артысткі БССР Л. Давідовіч прагучалі Коласавы «Голас зямлі» і «Зварот».

К. СЦЕПАНЮК.

Выступае Павел КАВАЛЕЎ. Фота Ул. КРУКА.

НА блакітным ЭКРАНЕ

З 25 ЧЭРВЕНЯ ПА 1 ЛІПЕНЯ

29 чэрвеня. 19.25

«БУГ»

Літаратурна-мастацкі часопіс з Брэста.

Праграма пазнаёміць са старшынёй прафкома Белаазёрскага энергамеханічнага завода С. Амельчуком, з хатнім музеем дэпутата абласнога Савета народных дэпутатаў урача Я. Адамовіча; прагучаць вершы юных паэтак — удзельніц абласнога агляду-конкурсу.

30 чэрвеня. 11.10

М. АРАХОЎСКІ. «МАШЭКА»

Спектакль вучэбнага тэатра БДТМІ.

Рэжысёр-пастаноўшчык В. Басаў.

30 чэрвеня. 12.45

РОЗДУМ

Пейзажы Леаніда Шчамялёва.

Аўтар і вядучы перадачы — мастацтвазнаўца У. Бойка.

30 чэрвеня. 15.00

ЛІРА

Мастацка-публіцыстычная праграма.

У мінулым годзе ў Ленінградзе прадстаўнікі творчай і навуковай інтэлігенцыі, якія паходзяць з Беларусі, аб'ядналіся ў Беларускае грамадска-культурнае таварыства. Аб дзейнасці і расказвае перадача.

30 чэрвеня. 16.55

КЛУБ ВЯСЁЛЫХ І ЗНАХОДЛІВЫХ

Паўфіналы Рэспубліканскага турніру.

Удзельнікі — зборная каманда БДУ імя У. І. Леніна і МДМІ і зборная МІК і РТІ.

Вядучыя — С. Глебаў і І. Калянкоў.

30 чэрвеня. 18.20

В. СУПРУНЧУК. «КЛЕТКА З ПАПУГАЕМ»

Прэм'ера спектакля БТ.

Рэжысёр-пастаноўшчык А. Астравух.

У ролях: А. Корчыкаў, А. Мілаванаў, А. Сідорчык, В. Бандарэнка, У. Кін-Камінскі.

30 чэрвеня. 19.20

«ВЫСОКІ БЕРАГ»

Вершы і песні А. Лойкі і А. Атаманава.

Перадача знаёміць з двума паэтамі, землякамі, калегамі па працы ў БДУ імя У. І. Леніна.

1 ліпеня. 19.20

ЗАПРАШАЕМ НА ВЯЧОРКІ

Абрад «Радзіны» ў выкананні фальклорных ансамбляў вёсак Міцькаўшчына і Салтанаўшчына Нясвіжскага раёна.

Каментарый В. Ліцвінкі.

Саюз пісьменнікаў БССР і Беларускае аддзяленне Літфонду СССР выказваюць глыбокае спачуванне галоўнаму ўрачу паліклінікі Белліфонду Міналаю Дзмітрыевічу Ладуценку з прычыны напаткаўшага яго гора — смерці МАЦІ.

Калектыў Дзяржаўнага музея гісторыі беларускай літаратуры выказвае глыбокае спачуванне старэйшаму навуковаму супрацоўніку Гараінавай Людміле Пятроўне ў сувязі з вялікім горам — смерцю БАЦЬКІ.

«Литература и искусство» — орган Министерства культуры и совета Союза писателей БССР. Минск. На белорусском языке.

Літаратура і Мастацтва

Выходзіць раз на тыдзень, па пятніцах.

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі.

Індэкс 63856 П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

АТ 06300 М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

АДРАС РЭДАКЦЫІ: 220600, ГСП, Мінск, вул. Захарава, 19.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмная рэдакцыі — 33-24-61; намеснік галоўнага рэдактара — 33-25-25; адказны сакратар — 33-19-85; аддзел публіцыстыкі: Міхась ЗАМСКІ, Віталь ТАРАС — 33-19-65; аддзел пісьмаў і грамадскай думкі: Людміла КРУШЫНСКАЯ, Марыя ГІЛЕВІЧ — 33-19-85; аддзел інфармацыі: Алесь МАРЦІНОВІЧ — 33-24-62; аддзел крытыкі і бібліяграфіі: Галіна КАРЖАНЕЎСКАЯ — 33-22-04; аддзел літаратуры: Юрась СВІРКА, Уладзімір ЯГОЎДЗІК — 33-22-04; аддзел музыкі: Святлана БЕРАСЦЕНЬ — 33-21-53; аддзел тэатра, кіно і тэлебачання: Жанна ЛАШКЕВІЧ — 33-21-53; аддзел выяўленчага мастацтва і аховы помнікаў: Пётра ВАСІЛЕЎСКІ — 33-24-62; аддзел народнай творчасці і культасветработы: Вячаслаў ЛАПЦІК — 33-24-62; аддзел мастацкага афармлення: Уладзімір ТАБУШАЎ — 33-44-04; фотакарэспандэнт: Уладзімір КРУК — 33-24-62.

Пры перадруку просьба спасылацца на «ЛіМ». Рукапісы рэдакцыя не вяртае і не рацэнзуе.

Намеснік галоўнага рэдактара Мікола ГІЛЬ.

Рэдакцыйная калегія:

Заір АЗГУР, Алесь АСІПЕНКА, Анатоль БУТЭВІЧ, Уладзімір ГІЛЕП, Уладзімір ГНІЛАМЕДАЎ, Лілія ДАВІДОВІЧ, Міхась ДРЫНЕЎСКІ, Алесь ЖУК, Галіна КАРЖАНЕЎСКАЯ, Ігар ЛУЧАНОК, Уладзімір НЯКЛЯЕЎ, Нічыпар ПАШКЕВІЧ, Барыс САЧАНКА, Юрась СВІРКА, Рычард СМОЛЬСКІ, Уладзімір СТАЛЬМАШОНАК, Віктар ТУРАЎ.

Адказны сакратар Андрэй ГАНЧАРОЎ.